Падпіска на «Звязду» на першае паўгоддзе заканчваецца!
НЕ СПАЗНІЦЕСЯ!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 СНЕЖНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№№ 247—248 (26605—26606)
Кошт 600 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Завочная «прамая лінія»

## ХІРУРГІЯ ОРГАНАЎ СТРАВАВАННЯ

Пытанні, звязаныя з хірургічнымі хваробамі органаў стрававання можна адрасаваць **доктару медыцынскіх навук, прафесару, загадчыку кафедры хірургіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кіраўніку Рэспубліканскага цэнтра рэканструктыўнай хірургічнай гастраэнтэралогіі і калапракталогіі Аляксандру Уладзіміравічу ВАРАБ'Ю.** Адказы на пытанні, пакінутыя ў рэдакцыі «Звязды» па нумары **8 (017) 287 18 29 да 30 снежня,** будуць надрукаваныя ў газеце на пачатку новага года.

# БЕЛАРУСЬ ШЧЫРА РАДУЕЦЦА ПОСПЕХАМ СВАІХ ЮНЫХ ГРАМАДЗЯН

**У Беларусі створаны ўсе ўмовы для жыцця і творчага развіцця дзяцей. Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на навагоднім дабрачынным свяце для дзяцей у Палацы Рэспублікі.**

«У гэты няпросты час, калі мы будуем сваю краіну, мы стараемся стварыць усе ўмовы, каб вы былі разумнымі, прыгожымі і шчаслівымі, каб вы любілі сваю Радзіму», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да дзяцей.

«Новы год — асаблівае свята, якое вызначае настрой на 365 дзён наперад. І таму заўсёды вельмі прыемна пачынаць святкаванне Новага года з сустрэчы з вамі — маленькімі грамадзянамі Беларусі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта сімвалічна, таму што вы — будучае нашай краіны. Вам трэба будзе будаваць нашу незалежную, прыгожую сінявокую Беларусь».

Прэзідэнт падкрэсліў, што для юных жыхароў Беларусі адкрыты шырокі доступ да самых перадавых тэхналогій. «Словам, усё, што вы захочаце зрабіць, вы зможаце ў сваёй краіне», — сказаў кіраўнік дзяржавы, нагадаўшы, што ў Беларусі развіваюцца камп'ютарныя і касмічныя тэхналогіі, абнаўляюцца гарады і вёскі, узводзяцца лядовыя і водныя палацы, велатрэкі, гарналыжныя комплексы. Пабудавана Нацыянальная бібліятэка — адна з лепшых у свеце. Расчыніў свае дзверы абноўлены тэатр оперы і балета.

«Я вельмі хацеў бы, каб вы цанілі тое, што ў вас ёсць такі куток зямлі, на якім вы жывяце пад мірным небам, можаце атрымліваць адукацыю ў добрых школах, займацца любімай справай, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы, дарослыя, зрабілі ўсё, каб Новы год для вас быў шчаслівым».



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўся краіна шчыра радуецца поспехам падрастаючага пакалення, якое праслаўляе Беларусь у свеце. «Я чарговы раз магу назваць вядомае вам імя Гены Караткевіча з Гомеля, які трэці раз запар заваяваў золата на міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы. Яго называюць беларускім цудам», — адзначыў Прэзідэнт. Ён назваў таксама імёны такіх юных артыстаў, як Даша Коваль і Насця Алясюк, на рахунку якіх адразу некалькі перамог на самых прэстыжных міжнародных конкурсах. Вялікай заслугай беларускіх дзяцей Аляксандр Лукашэнка лічыць тое, што ў 2010 годзе Беларусі даверана ганаровае права прымаць у сябе дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне». «Гэта не заслуга дарослых. Гэта ваша заслуга. Вы зрабілі знакамітай нашу краіну», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Няхай цяпло і святло нашага свята разам з агнямі галоўнай ёлкі краіны разліцца па ўсіх кутках Беларусі», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

На свята ў Палацы Рэспублікі былі запрошаны 2370 дзяцей ва ўзросце 8—14 гадоў з розных рэгіёнаў Беларусі. У склад дэлегацыі ўключаны дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў; дзеці, якія выхоўваюцца ў апякунскіх і прыёмных сем'ях; дзеці з сем'яў бежанцаў; пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў.

Акрамя яркага казачнага музычна-сцэнічнага шоу ў выкананні лепшых творчых калектываў краіны, элементам праграмы свята стала ўручэнне дзецям падарункаў ад Прэзідэнта Беларусі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# БЮДЖЭТНІКАМ, ПЕНСІЯНЕРАМ І СЕМ'ЯМ З МАЛЫМІ ДЗЕЦЬМІ — ПРЫБАЎКІ

**З 1 студзеня памер тарыфнай стаўкі І разраду работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту ці карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, павялічыцца на 5,2 працэнта — з 77 да 81 тысячы рублёў.**

Пры гэтым да тарыфных ставак работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту ці карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, вызначаныя павышальныя і паніжальныя каэфіцыенты. Так, каэфіцыент для 1 разраду складае 2,419, для 27 разраду — 0, 978.

Плюс да таго, з 1 студзеня павялічваецца мінімальная зарплата. Яна складзе 258 600 рублёў — гэта адпавядае 103 працэнтам ад бюджэту пражытковага мінімуму.

Адначасова ўказам кіраўніка дзяржавы з 1 студзеня павялічваюцца і працоўныя пенсіі. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, са студзеня карэкціроўка фактычнага заробку пенсіянераў пры пераразліку будзе рабіцца зыходзячы з сярэдняй зарплаты за ІІІ квартал гэтага года — 1 034 512 руб. У выніку са студзеня працоўныя пенсіі павысяцца ў сярэднім на 9, а пенсіі па ўзросце ўзрастуць на 9,2 працэнта — адпаведна, на 38,5 і 41,1 тыс. рублёў.

У прыватнасці, сярэдні памер працоўных пенсій складзе 468 тыс., сярэдні памер пенсіі па ўзросце — 490,5 тыс., сярэдні памер мінімальнай пенсіі па ўзросце (пры стажы, не меншым за 20 гадоў у жанчын або не меншым за 25 гадоў у мужчын) — 217,7 тыс. рублёў. Пры гэтым, зазначылі ў міністэрстве, канкрэтны памер павелічэння ў кожнага пенсіянера будзе розным — зыходзячы з індывідуальнага стажу, каэфіцыента, права на надбаўкі і павышэнні.

Нарэшце, таксама з 1 студзеня, павялічваецца памер дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, — з 80 да 100 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму або з 200.060 да 250.070 рублёў. Прычым надалей гэтая дапамога будзе ўзрастаць штоквартальна — у сувязі са змяненнем БПМ.

Дарэчы, адзначаюць у міністэрстве, папярэднія захады па павелічэнні дзіцячых выплат (павелічэнне дапамогі на дзяцей да 3 гадоў з 65 да 80 працэнтаў БПМ, павелічэнне аднаразовых дапамог пры нараджэнні) далі пэўныя вынікі — у краіне адзначаецца павелічэнне паказчыкаў нараджальнасці. За студзень—кастрычнік гэтага года ў краіне з'явілася 92615 немаўлят — на 2,2 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд летась.

Пры гэтым, падкрэслілі ў міністэрстве, неабходныя сродкі на павелічэнне пенсій і дапамог на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў ёсць, так што ў 2010 годзе гэтыя выплаты павінны ісці без збояў.

**Сяргей ГРЫБ.**

белагропромбанк
традиции будущего

**ИЗМЕНЕНИЯ
в проспекты эмиссии облигаций
ОАО «Белагропромбанк»**

Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 23.12.2009 зарегистрированы изменения в проспекты эмиссии облигаций ОАО «Белагропромбанк» для физических лиц на предъявителя тридцатого, тридцать первого, сорок седьмого, сорок восьмого, сорок девятого, пятидесятого, пятьдесят первого выпусков и для юридических лиц пятьдесят третьего, пятьдесят пятого, пятьдесят шестого выпусков.

С изменениями в проспекты эмиссии вышеназванных выпусков облигаций можно ознакомиться в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата ОАО «Белагропромбанк» в течение их рабочего времени.

www.belapb.by

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь

# РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## У НАВАГОДНЮЮ НОЧ БУДУЦЬ МАРОЗ І СНЕГ

**У навагоднюю ноч надвор'е папесціць беларусаў марозам і невялікім снегам. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

— Ноч з 31 снежня на 1 студзеня будзе марозная. У Мінску тэмпература паветра складзе мінус 7—14 градусаў. Магчыма, пройдзе невялікі снег. Самае добрае надвор'е, каб вадзіць карагод вакол ёлкі, — адзначыў спецыяліст.

Значна халадней у навагоднюю ноч будзе ў паўночна-ўсходніх раёнах Беларусі — там слупок тэрмометра пакажа 16—18 градусаў марозу. На паўднёвым захадзе чакаецца мінус 4—6 градусаў.

## НАВАГОДНЯЯ ТРАЙНЯ

**Напярэдадні Новага года сям'я жыхароў Пінска адразу павялічылася ў два разы: было тры чалавекі, стала — шэсць. Тры дачушкі з'явіліся на свет у Брэсцкім раддоме, куды парадзіху даставілі па прычыне складанасці родаў.**

Варта зазначыць, што дзяўчаткі нарадзіліся здаровымі і з добрай для такога выпадку вагой: 2570, 2630, 3280 грамаў. Пасля нараджэння за дзецьмі ў палаце інтэнсіўнай тэрапіі ўрачы прыйшлі да высновы, што маці з новананароджанымі можна выпісаць дадому здаровымі. Паводле слоў намесніка галоўнага ўрача раддома Галіны Алешчанкі, такое бывае вельмі рэдка: звычайна дзяцей з трайні пераводзяць у аддзяленне нованароджаных дзіцячай бальніцы.

Пінская трайня стала чацвёртай з пачатку года ў Брэсцкім абласным радзільным доме.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЗНЁС ГАДЗІННІК ЗА... $10 000

**Сталічныя праваахоўнікі вышукваюць невядомага «кавалера» 30-гадовай мінчанкі, у якой гэты мужчына скраў гадзіннік «Ролекс» коштам 10 тысяч долараў ЗША.**

Няўдачны зладзюжка, які знаходзіўся ў пацярпелай у гасцях у кватэры на вуліцы Энгельса, напракудзіў пасля таго, як выпіў і закусіў з гаспадыняй. Калі ж «баль» скончыўся і невядомы сышоў, знік і дарагі гадзіннік.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПАГРАЖАЎ РАСПРАВІЦЦА З ДЗІЦЕМ...

**У Жодзіне каля гадзіны ночы ў нядзелю быў затрыманы злачынца, які ў кватэры сваёй сяброўкі ўчыніў сапраўдны кашмар: напачатку ён пагражаў падпаліць газ у жыллі, а потым прыставіў нож да шыі дзіцяці гаспадыні — дзяўчынкі 2006 года нараджэння...**

Раней судзімага за хуліганства 28-гадовага мясцовага жыхара па-сапраўднаму «пераклініла»: на пачатку адзінаццатай вечара ў суботу ён патэлефанаваў у мясцовы ГАУС і паведаміў пра тое, што збіраецца падпаліць жыллё, адчыніўшы вентыль газу. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, дзяжурны па аддзяленні ўнутраных спраў, каб супакоіць нецвярозага мужчыну, і не даць апошняму магчымасці выканаць пагрозы падпалу, а таксама нанясення фізічнай шкоды дзяўчынцы і сабе, па тэлефоне праводзіў перамовы з буянам. У сваю чаргу, у гэты час работнікі райгаза спынілі падачу блакітнага паліва ў жыллё. У перамовы са злачынцам уступіў таксама начальнік мясцовага ГАУС. На шчасце, усё абышлося без ахвяраў: каб папярэдзіць надзвычайнае здарэнне, намеснік начальніка Жодзінскага ГАУС і оперупаўнаважаны аддзялення крымінальнага вышуку праз балкон праніклі ў кватэру і затрымалі крымінальніка. Па факце заведзена крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## 10 ЧАЛАВЕК ПАЦЯРПЕЛІ

**пры лабавым сутыкненні ў Мінску на вуліцы Чыжэўскіх аўтамабіля БМВ з маршрутным таксі.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, дарожна-транспартнае здарэнне адбылося каля гадзіны дня. БМВ, за рулём якога знаходзіўся 31-гадовы кіроўца, вынесла на сустрэчную паласу, па якой рухалася маршрутка. Дзевяць пасажыраў маршрутнага таксі, а таксама кіроўца легкавушкі атрымалі лёгкія траўмы, удары і раны. Цяпер вядзецца дадатковы разбор гэтага здарэння, аднак, паводле папярэдніх звестак, кіроўца БМВ хоць і ехаў з невялікай хуткасцю, яго машыну ўсё ж такі занесла на сустрэчную.

**Ігар ГРЫШЫН.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

# «НА ПІВА» — У ПАБ?

**Ліцэнзійная вытворчасць сусветна вядомай гарэлкі «Nemiroff» можа распачацца ў І квартале 2010 года на базе РУП «Крышталь». Аб гэтым падчас сустрэчы з журналістамі паведаміў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван ДАНЧАНКА.**

Канкрэтныя схемы супрацоўніцтва з кампаніяй «Nemiroff» працягваюць вывучацца, тым не менш вядома — вытворчасць гарэлкі пад знакамітым брэндам у Беларусі будзе весціся з выкарыстаннем айчынных бутэлек, спірту і іншых кампанентаў. Як вынік, у канцэрне разлічваюць: гэты праект павінен павялічыць экспартныя магчымасці лікёра-гарэлачнай галіны.

Прычым сам па сабе падобны напрамак з'яўляецца найбольш актуальным. Калі ў 2004 годзе айчынныя прадпрыемствы выраблялі для ўнутранага рынку каля 70 млн, то сёлета гэты паказчык павялічыцца ці не ўдвая — да 140 мільёна літраў гарэлкі. З аднаго боку, павелічэнне вытворчасці дазволіла змякчыць праблему з нелегальным абаротам алкагольнай прадукцыі. Але з іншага даводзіцца канстатаваць: у краіне адбыўся значны рост спажывання «моцных напояў». Унутраны рынак быў перанасычаным, беларусы дасягнулі «крытычнай планкі». У сувязі з гэтым, падкрэсліў Іван Данчанка, прагназаваць значнае павелічэнне паказчыкаў вытворчасці і тавараабароту алкагольнай прадукцыі ў Беларусі ўжо нельга. Забяспечыць далейшы рост можна перш-наперш за кошт паставак за мяжу.

Тым часам, на думку Івана Данчанкі, для змяншэння аб'ёмаў спажывання «моцнага» алкаголю неабходна рабіць стаўку на вытворчасць піва. Пакуль беларусы выпіваюць па 40-45 літраў гэтага напою, тады як немцы — па 160 літраў. Зыходзячы з гэтага, магутнасці беларускіх бровараў павінны ўзрастаць, асабліва калі ўзяць пад увагу адзін факт — якасць айчыннага піва прызнаная ва ўсім свеце. Сёлета толькі «Крыніца» экспартавала 1,5 млн дэкалітраў, у тым ліку пастаўкі пачаліся ў такую даволі «кансерватыўную» краіну, як Вялікабрытанія. Аднак гэта яшчэ не мяжа. Як мяркуюць у канцэрне, экспарт той жа «Крыніцы» можа складаць 3-5 млн дал.

Адначасова, заўважыў Іван Данчанка, неабходна вырашаць праблему з месцамі спажывання піва. Канцэрн ужо звярнуўся з прапановай да ўладаў сталіцы выдзеліць айчынным заводам зямельныя ўчасткі ў арэнду — для стварэння пабаў з удзелам прыватных інвестыцый.

**Сяргей ГРЫБ.**

Ну і ну!

## Кітайскі гандлёвы цэнтр пабудаваў паркоўку для жанчын

**Гандлёвы цэнтр у горадзе Шыцзячжуан кітайскай правінцыі Хэбэй пабудаваў асобную паркоўку для жанчын. Як паведамляе AFP, парковачныя месцы на гэтай стаянцы большыя, чым на традыцыйных паркоўках.**



Кожнае машынамесца на «жаночай паркоўцы» на метр шырэйшае, чым звычайнае. Акрамя таго, тут усталяваныя спецыяльныя знакі, якія дапамагаюць аўтааматаркам прыпаркаваць сваю машыну без рызыкі зачапіць суседнія аўтамабілі. На новую паркоўку будуць пускаць толькі жанчын.

Варта нагадаць, што яшчэ ў 2002 годзе ў Вялікабрытаніі было праведзена даследаванне, вынікі якога паказалі, што жанчыны спраўляюцца з паркоўкай лепш за мужчын. Больш за 96 працэнтаў жанчын стараюцца прыпаркаваць свой аўтамабіль строга ў адведзеным для гэтага месцы, не заязджаючы на белыя лініі, што размяжоўваюць прастору стаянкі. Для параўнання, сярод мужчын падобнай «якасцю» паркоўкі могуць пахваліцца толькі 85 працэнтаў. Да таго ж, толькі два працэнты жанчын пакідаюць свае аўтамабілі на стаянцы так, што яны перашкаджаюць прыпаркавацца іншым кіроўцам. Аднак у адным мужчыны ўсё ж апярэдзілі кіроўцаў супрацьлеглага полу — сам працэс паркоўкі ў іх займае адчувальна менш часу: тры секунды супраць пяці ў жаночай часткі аўтааматараў. Пры гэтым мужчыны за гэты час паспяваюць зрабіць у сярэднім 2,3 манеўра, тады як жанчыны — 2,1 манеўра.

## Выбухаў будзе менш

Магчыма, таму, што перадвагодняя рэйды міліцыянераў Гомельскай вобласці заканчваюцца добрым «уловам» канфіскаваных піратэхнічных сродкаў. Так, у вёсцы Зашыр'е Ельскага раёна супрацоўнікі мясцовага аддзела ўнутраных спраў у аўтамашыне жыхара Лельчыцаў знайшлі 2830 штук небяспечных вырабаў. У Рэчыцы на рынку затрыманы 20-гадовы непрацуючы грамадзянін з 2683 піратэхнічнымі «цацкамі». Гамяльчаніна, індывідуальнага прадпрымальніка, з аналагічным таварам (4224 штук), затрымалі на рынку «Стары аэрадром». А ля ўваходу ў цэнтральны рынак Гомеля быў знойдзены пакет, у якім знаходзілася больш за тысячу прыладаў для феерверкаў. Хто яго кінуў? Праводзіцца праверка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Мытнікаў — больш, чэргаў — менш

**Для скарачэння чэргаў аўтамабіляў на беларуска-літоўскай мяжы прынятае рашэнне аб павелічэнні колькасці мытнікаў на пунктах пропуску. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта.**

Адначасова ў прэс-службе абверглі інфармацыю аб тым, што праблемы на мяжы ўзніклі ў сувязі з захворваннямі супрацоўнікаў беларускай мытні. Прычынай павелічэння чэргаў стала працяглае афармленне транспартных сродкаў менавіта літоўскім бокам. І ў тым ліку з-за масавага вывазу літоўскімі грамадзянамі аўтамабільнага паліва, тытунёвых і алкагольных вырабаў — сёння цэны на гэту прадукцыю ў Беларусі значна ніжэйшыя.

**Сяргей ГРЫБ.**

## НАФТАЗЛАДЗЕІ

Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, замаскіраваная ўрэзка знаходзілася ў лясным масіве каля вёскі Зашчэб'е пад Рэчыцай. Паляўнічыя на бясплатнае дызельнае паліва раскапалі нафтаправод, прасвідравалі адтуліну і ўманціравалі кран. Прынамсі, нафтапрадукты з Расіі ў Еўропу транспартуюць пад высокім ціскам. Таму любая саматужная спроба ўрэзкі можа пацягнуць сапраўдную экалагічную катастрофу. З невялікай адтуліны дыяметрам 8 міліметраў за гадзіну выліваецца больш за 10 тон паліва. Вылічваюць урэзкі з дапамогай электроннай сістэмы кантролю ціску ў нафтаправодах. Цяпер тыя, хто хацеў «на халяву» заправіцца, знаходзяцца ў вышуку. За крадзеж нафтапрадуктаў умельцам пагражае да 5 гадоў турмы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## АСЦЯРОЖНА: 31 снежня — месяцавае зацьменне

**Як паведамілі ў абсерваторыі БДУ, у навагоднюю ноч пры бязвоблачным надвор'і можна будзе ўбачыць месяцавае зацьменне.**

Гэта будзе прыватнае зацьменне з малой фазай, бачнае ў асноўным ва ўсходнім паўшар'і. Яно пачнецца ўвечары 31 снежня і найбольшай фазы дасягне ў 21 гадзіну 22 хвіліны, калі самы ніжні край Месяца зойдзе ў цень Зямлі і на некалькі хвілін прыкметна пацямнее.

Астролагі не лічаць неспрыяльны ўплыў зацьменняў толькі састарэлай выдумкай містычна настроеных старажытных людзей. У індывідуальнай астралогіі зацьменні да гэтага часу застаюцца адмоўным фактарам, які мае тэндэнцыю дрэнна ўплываць на лёс і здароўе чалавека. Перыяд зацьменняў — а гэта дата першага і апошняга зацьмення плюс—мінус тыдзень — асаблівы перыяд у жыцці людзей. Усё, што здараецца ў гэтыя дні, мае лёсавызначальны, фатальны характар. Яно можа мець доўгія наступствы, тэрмінам ад паўгода да 19 гадоў. Таму астролагі раяць перад тым, як штонебудзь рабіць у гэты перыяд, добра падумаць, ці трэба вам гэта.

**БЕЛТА.**

# «ЗАЛАТЫ МЯЧ-2009»:

## Эдуард Малафееў папрасіў прабачэння, а Алег Качан развітаўся з «арлом» — Сяргеем Крыўцом



Найлепшы футбаліст Беларусі Аляксандр КУЛЬЧЫ з жонкай Святланай.



Найлепшы футбаліст чэмпіянату Сяргей КРЫВЕЦ: «Усім дзякуй...»

Беларуская федэрацыя футбола афіцыйна завяршыла сезон і ўручыла ўзнагароды раней названым лаўрэатам. Своеасаблівы футбольны «Оскар» у айчынным выкананні, дзе найлепшыя футбалісты і трэнеры атрымалі падарункі з рук футбольных чыноўнікаў і ветэранаў гульні нумар адзін разам з парадамі на будучыню, прайшоў у Мінску.

Распачаў цырымонію «Залаты мяч-2009» фільм Леаніда Бандаровіча, дзе знакаміты дыктар дынамаўскага стадыёна расказаў пра футбольныя дасягненні гэтага года. Кіраўнік беларускага футбола Генадзь Нявыглас нагадаў прысутным, што свята сёлета двайное — беларуская федэрацыя адзначае якраз у гэтыя дні сваё дваццацігоддзе. 25 снежня 1989 года адбылося першае пасяджэнне выканкама Федэрацыі футбола БССР, дзе былі прызначаны службовыя асобы, зацверджаны вынікі і намінацыі, а першым кіраўніком федэрацыі быў абраны Яўген Шунтаў (цяпер ганаровы прэзідэнт Федэрацыі футбола). Наконт сезона-2009 Генадзь Нявыглас адзначыў, што гэта быў год, «багаты на інтрыгі і нетрадыцыйныя падзеі, што выклікалі гарачыя дыскусіі, у якіх удзельнічала ўся краіна». «Будзем спадзявацца, што ў наступным годзе любоў да спорту будзе толькі мацнець», — заўважыў старшыня Федэрацыі футбола і перайшоў да цырымоніі ўзнагароджання.

На сцэну паднімаліся чыноўнікі самага высокага рангу (ад міністра спорту і турызму Алега Качана да кіраўнікоў беларускага футбола) і ўручалі ўзнагароды найлепшым з лепшых у гульні нумар адзін. Футбольны клуб БАТЭ па колькасці намінацый быў па-за канкурэнцыяй.

СТАР. 2



# МАРОЗ ДАЖДЖУ НЕ БАІЦЦА!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Не зважаючы на хлюпанне пад нагамі і дождж над галавой, у беларускай сталіцы адбылося традыцыйнае шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак. Наш фотакарэспандэнт таксама прайшоў у дружнай марозавай калоне і пераканаўся, што любімыя навагоднія персанажы прыносяць радасць у любое надвор'е.

СТАР. 3

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.12.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 845,00 |
| ▼ 1 еўра | 4 092,82 |
| 1 латвійскі лат | 5 785,46 |
| 1 літоўскі літ | 1 185,96 |
| 1 чэшская крона | 154,96 |
| 1 польскі злоты | 986,20 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 96,13 |
| 1 украінская грыўня | 357,12 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 29,5952 |
| UAH | 36,9432 |
| 1000 BYR | 10,3516 |
| EUR | 42,5638 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X





# Гэткі светлы кірмаш

Нядзельная снежаньская раніца. Яшчэ задоўга да афіцыйнага адкрыцця 8-й перадсвяточнай духоўна-асветніцкай выставы-кірмашу «Раства Хрыстова» плошча выставачнага павільёна гудзе, як патрывожаны вулей, і яблыку сапраўды «няма дзе ўпасці». Ля кожнага гандлёвага прылаўка-куточка ланцужкі чэргаў. Адны ўпадабалі падарункі і сувеніры з праваслаўнай сімволікай, якія нідзе больш не знойдзеш, толькі як на перадкалядным кірмашы. Нехта гартае асветна-духоўную перыёдыку і кнігі. Бляск лампад і абразоў, вырабленых у Грэцыі, густы водар горных зёлак і лясных мядоў з манастыроў ад Украіны да ўсходу Расіі. Прылуцкія пернікі з-пад Мінска, духмяныя алеі з Закарпацця, абразы з санкт-пецярбургскага «Лявушынскага падворка». Цяжка пералічыць усе складнікі святочнага настрою. Нават мелодыі званоў, на якіх свае майстэрства дэманструюць выхаванцы Мінскай школы званароў, не здольныя «перакрычаць» гоман гэтага рознакаляровага і шматаблічнага кірмашу. А колькі сапраўдных святыняў сабрана пад адным дахам — цудадзейных абразоў з простых вясковых цэркваў і знакамітых манастырскіх прыстанкаў!



Традыцыя правядзення напярэдадні Калядаў кірмашоў па благаславенні Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта — ужо сталая і вельмі добрая. Але кожны раз, нібы ўпершыню, знаходзіш і адкрываеш нешта новае, часам экзатычнае. Манастыры, прыходы, брацтвы і сястрыцтвы, навучальныя ўстановы і мастацка-вытворчыя цэнтры намагаюцца звярнуць да сябе ўвагу найперш духоўнымі каштоўнасцямі, якія ідуць праз слова, падзяку, ахвяраванне і з'яўляюцца сутнасцю праваслаўнага жыцця. Да 5 студзеня будзе доўжыцца гэты прыгожы і прывабны кірмаш.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**





Антыкрызісная эканоміка

# ПРАГНОЗ НА ПАСКАРЭННЕ: ЗАРПЛАТА — 500 ДОЛАРАЎ, НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ — 20 ТЫСЯЧ

## 2010-ы павінен стаць годам паскоранага інтэнсіўнага развіцця

**СЕСІЯ Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў зацвердзіла прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэт рэгёна на наступны год.**

Год, які завяршаецца, быў скіраваны на **пераадоленне крызісу**. Улады працавалі на недапушчэнне абвалу ў эканоміцы, захаванне вытворчасцяў і працоўных калектываў, выкананне сацыяльных праграм.

Падзенне ў пачатку года, звязанае ў асноўным з арыентаванымі на экспарт прадпрыемствамі, выраўнялася ў апошнія месяцы. У лістападзе ўпершыню ўдалося перавысіць леташнія лічбы. Паводле папярэдніх ацэнак, увогуле за год аб'ёмы прамысловай вытворчасці ў параўнанні з 2008 годам складуць **97—98 %**.

Аднак такіх тэмпаў недастаткова для выканання бюджэту наступнага года. Кошт пытання: замацаванне станоўчай дынамікі ў рэальным сектары эканомікі і значнае паскарэнне. **План напружаны — 114—116 %** у параўнанні з 2009 годам, але толькі так можна выканаць пяцігодку і забяспечыць стабільны даход для сацыяльнай сферы.

— Дасягненне гэтых паказчыкаў — справа нашага гонару, — заявіў на сесіі **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**.

Галоўным прыярытэтам 2010 года магілёўскія ўлады назвалі павелічэнне ўзроўню жыцця людзей. Таму **заробак павінен павялічыцца да 500 долараў, у рэгіёне будуць створаны болей за 20 тысяч новых працоўных месцаў, а ў кожным сельскім раёне мяркуецца адкрыць 5—10 новых вытворчасцяў**.

Старшыняў райвыканкамаў папярэдзілі, што бюджэтная іголка не вырашыць усіх праблем: трэба дзейнічаць, вучыцца зарабляць грошы, ствараць на тэрыторыі новыя прадпрыемствы, якія будуць плаціць грошы ў бюджэт.

Дзе шукаць **новыя бізнэс-ідэі**? Напрыклад, у развіцці традыцыйных беларускіх рамёстваў. У фае Магілёўскага Дома саветаў працуе выстава рамеснікаў: усе валёнкі і шмат якія вырабы раскупілі ў першы ж дзень!

Адной з прыярытэтных задач на наступны год з'яўляецца **рэалізацыя выробленай прадукцыі**. Кіраўніцтва лічыць, што спажывецкія тавары ўвогуле нельга трымаць на складах, трэба зніжаць цэны і выстаўляць на продаж.

Усё ж павінны прыйсці і ў нашы крамы **сур'ёзныя зніжкі і распродажы.** Нядаўняя практыка Магілёўскага ўнівермага паказала: кампанія па продажы тавараў па зніжаных цэнах павялічыла выручку гандлёвага прадпрыемства ў два разы.

У наступным годзе **чакаецца павелічэнне экспарту**. Цяпер прадукцыя магілёўскіх прадпрыемстваў прадаецца ў 75 краін свету. Прадпрыемствы асвойваюць новыя рынкі збыту. Сёлета, напрыклад, істотна вырас экспарт у Кыргызстан, Таджыкістан, Данію, ААЭ, Пакістан, Грузію, В'етнам, Сірыю і Індыю.

Каб сальда было станоўчым, кіраўніцтва Магілёўшчыны прапанавала працаваць паводле лозунга: набыў імпарт на 100 долараў — як мінімум прадай на гэту ж суму, а яшчэ лепей — на большую.

— Цяжка, але крызіс — гэта часовая з'ява, — падбадзёрыў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый ІВАНОЎ**. — І калі ён скончыцца, то наш вопыт працы ў такіх складаных умовах стане падмуркам для паспяховага пасткрызіснага развіцця.

Пётр Руднік параіў кіраўнікам выканаўчай улады і прадпрыемстваў не паўтараць памылкі 2009 года: не чакаць заканчэння Калядных вакацый, а дзейнічаць ад першага дня, закасаўшы рукавы, каб выканаць напружаны прагноз.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «МАКСІМКА» НЕ ПРАЙШОЎ

**Спробу ўвозу буйной партыі «шэрага» спірту спынілі супрацоўнікі Віцебскай мытні сумесна з калегамі з КДБ і міліцыі.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, увагу прыцягнуў аўтамабіль УАЗ, які на вялікай хуткасці ўехаў на тэрыторыю Лёзненскага раёна з боку Расіі. Пры аглядзе транспартнага сродку высветлілася: у ім схавана адразу 240 поліэтыленавых пяцілітровых бутэлек са спіртам. Ніякіх суправаджальных дакументаў на тавар не было, затое неўзабаве на месца здарэння прыбыў невядомы, які прапанаваў «разысціся па-добраму»— за 3 тысячы расійскіх рублёў.

Калі ж гэта не спрацавала, ініцыятыву ўзяў вадзіцель. Са скаргамі на холад ён папрасіўся сесці ў аўтамабіль, каб пагрэцца. Аднак літаральна праз некалькі хвілін пакінуў салон — тут распачаўся пажар, прычынай якога, як высветлілася пазней, стаў падпал. Тым не менш груз захаваць удалося — ён канфіскаваны, па факце кантрабанды пачаўся разбор. Адначасова вырашаецца пытанне аб пачатку крымінальнай справы за спробу дачы хабару.

**Сяргей ГРЫБ.**

# АЛЁ-АЛЁ, ЧАРОЎНАЯ КНЯГІНЯ!

**АБ гісторыі развіцця паштовай сувязі на Гомельшчыне расказваюць прадметы з фондаў Гомельскага палацапаркавага ансамбля і тыя, што прадастаўлены Гомельскім філіялам РУП «Белпошта». Экспазіцыя мае старажытную назву «Паштовы дыліжанс» і дае магчымасць пазнаёміцца з амаль што невядомымі сёння прадметамі, якія на працягу стагоддзя служылі паштавікам верай і праўдай.**



Вядома, што першае памяшканне пошты ў Гомелі было пабудавана ў XIX стагоддзі на вуліцы Прабойнай (сучасная Савецкая). У 1850 годзе праз абласны цэнтр прайшла першая ў Расіі тэлеграфная лінія Пецярбург—Гомель. Дзякуючы гэтаму горад аказаўся ў арбіце паштова-тэлеграфных стасункаў. Прынамсі, і першы тэлефон у Гомелі быў уладкаваны менавіта ў палацы князёў Паскевічаў у той жа час, які можна назваць часам высокай актыўнасці адрасатаў, бо тысячы паштовак з горада над Сожам накіроўваліся ў розныя куткі зямнога шара.

У экспазіцыі знаходзяцца рарытэты, звязаныя з дзейнасцю паштовых кантор у мінулым: дакументы, розныя не зусім зразумелыя сёння прыстасаванні. Напрыклад, лічыльнікі XIX стагоддзя. Ёсць меркаванне, што з іх дапамогай у гомельскім маёнтку князёў Паскевічаў вяліся фінансавыя справы. Упрыгажэннем экспазіцыі сталі некалькі калекцый вельмі рэдкіх марак канца пазамінулага стагоддзя і паштовых штэмпеляў розных часін. Тут жа можна пазнаёміцца з фотаздымкамі, прысвечанымі гісторыі пошты ўвогуле, пабачыць, якая ўніформа была ў супрацоўнікаў пошты ў розныя гістарычныя перыяды, як яны дастаўлялі пасланні адрасатам. Асобная частка прысвечана сучаснай пошце, калекцыянаванню марак, канвертаў, паштовак.

Між тым, і сёлета Гомельскі філіял РУП «Белпошта» правёў некалькі мерапрыемстваў, звязаных з юбілейнымі датамі ў гісторыі Гомельскай вобласці. У ліпені адбылося гашэнне памятнай паштовай карткі да 100-годдзя сусветна вядомага дыпламата, які нарадзіўся на Гомельшчыне — Андрэя Грамыкі. У кастрычніку — гашэнне паштовай карткі, прысвечанай 200-годдзю закладкі Петрапаўлаўскага сабора ў Гомелі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# Баранавічы: адкрываецца Лядовы палац



**СЁННЯ ў Баранавічах урачыста адкрыюць Лядовы палац. А потым на лёд выйдзе хакейная каманда Прэзідэнта і хакеісты брэсцкага «Дынама».**

Трапіць на ўрачыстае адкрыццё Лядовага палаца здолеюць тыя, у каго будуць запрашальныя білеты, якія распаўсюдзілі праз арганізацыі і прадпрыемствы горада. Глядзельная зала лядовай арэны прыняць усіх ахвотных не дазваляе.

Пэўная колькасць гледачоў здолее ўбачыць урачыстасці і на вялікім экране, які ўсталявалі перад палацам, але каб трапіць на тэрыторыю Лядовага палаца, неабходна будзе прайсці праз металадэтэктары. З'ява не новая і зразумелая.

А цяпер крыху гісторыі. Узвядзенне Лядовага палаца пачалося напрыканцы 2007 года і будаўніцтва вялося даволі бурна, бо каб за два гады ўзвесці такі спартыўны комплекс, патрэбны былі вялікія намаганні. Напрыклад, да будаўніцтва прыступілі пасля падрыхтоўкі пляцоўкі пад палац. Грунт аказаўся непрыдатным і на месца вывезенага завезлі 83 тыс. $м^3$ пяску. Пэўны перыяд адчуваўся і недахоп грошай, якіх не было ў бюджэце горада. Будаўніцтва Лядовага палаца абышлося болей чым у 60 мільярдаў рублёў, а гэта — чвэрць гарадскога бюджэту 2009 года.

Але комплекс уражвае найперш знешнім выглядам — сапраўдны палац з бетону, металу і шкла. Плошча збудавання 22 тысячы $м^2$, а за хакейнымі баталіямі змогуць назіраць 2 тыс. гледачоў.

Лядовая арэна будзе прымаць не толькі хакеістаў, але і ўсіх ахвотных пакатацца на каньках. І цана невысокая. Для дзяцей (да 14 гадоў) адна гадзіна катання абыдзецца ў 3,5 тысячы, а для дарослых — 6 тысяч рублёў. Але гэта без пракату канькоў, а інакш давядзецца даплаціць яшчэ 3,5—4 тысячы.

У Лядовым палацы будуць дзейнічаць залы боўлінга, танцаў, більярда, мастацкай гімнастыкі і акрабатыкі...

Адным словам, спартыўны комплекс павінен зарабляць грошы, каб максімальна акупіць сябе. А таму ў палацы будуць праходзіць розныя масавыя мерапрыемствы, якія павінны прыцягнуць увагу гледача.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.**

Транспарт

# ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА Ў ДАРОГУ Ў СТУДЗЕНІ

**ДЗЯРЖАЎНАЕ прадпрыемства «Мінсктранс» скарэктавала расклад руху аўтобусаў па міжгародніх і прыгарадных маршрутах у перыяд з 6 па 10 і з 22 па 24 студзеня.**

Так, перавозка пасажыраў па міжгародніх маршрутах будзе весціся па наступным графіку: 6, 22 студзеня — як па раскладзе пятніцы; 7, 8, 23 студзеня — як па суботах; 9, 10, 24 студзеня — па раскладзе нядзелі.

Прыгарадныя перавозкі ў азначаныя тэрміны будуць «пабудаваныя» такім чынам: 22 студзеня аўтобусы будуць курсіраваць як па будных днях (чацвер); 6, 23 студзеня — па раскладзе пятніцы; 7, 8, 9 студзеня — як па суботах; 10, 24 студзеня — па раскладзе нядзелі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




***Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Малінаўшчызненскі спірта-гарэлачны завод «Аквадзіў» шчыра віншуе ўсіх спажыўцоў сваёй прадукцыі, шматлікіх партнёраў, чытачоў «Звязды» з Калядамі і Новым годам!***

*Слова **«Аквадзіў»** прыйшло на Беларусь з Заходняй Еўропы ў XVI стагоддзі. Яно мае лацінскія карані: «aqua» — вада, «divino» — натхненне. Дык натхнення Вам, удачы, моцнага здароўя, вясёлых і незабыўных прыгод у калядныя і навагоднія святы. І «Аквадзіў» спадзяецца на новыя прыемныя сустрэчы ў 2010 годзе.*

*Што датычыцца «Аквадзіва», то яго калектыў прыкладзе ўсе намаганні, каб у наступным годзе парадаваць сваіх прыхільнікаў новымі смачнымі і якаснымі напоямі.*





# МАРОЗ ДАЖДЖУ НЕ БАІЦЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І таму ў мінулую суботу адбылося штогадовае перадпавагодняе шэсце-шоу мінскіх Дзедаў Марозаў і Снягурак. Ад кожнага сталічнага раёна ў калоне (а яна выцягнулася на добрыя паўкіламетра), якая рушыла ад Палаца Спорту да высачэзнай ёлкі на Кастрычніцкай плошчы, было не менш за дваццаць пар самых любімых навагодніх персанажаў. Некаторыя з Дзядоў былі заўважаны не тое што ў звычайных чаравіках — у красоўках, што ніколечкі не ўплывала адмоўна на іх казачны імідж. Дапытлівая дзятва хоць і не бегала па Кастрычніцкай плошчы, як летась ці пазалетась, і за музычна-танцавальным спектаклем цярпліва назірала з-за межаў яшчэ нядаўняга катка, тым не менш пад гучныя воплескі была ўрачыста запалена галоўная, падобная на хрустальную, мінская ёлка.

Самым мудрым на гэтым святе быў Паазерскі Зюзя, бо на свае валёнкі ён надзеў глыбокія галошы і вада яму нічым не замінала, хоць вядома, што Зюзя холаду зусім не баіцца і нават у самыя лютыя маразы ходзіць босы. Сёлета Зюзя з'явіўся на снягурка-марозавым парадзе ўпершыню і кіраванне святам смела ўзяў у свае рукі. І, здаецца, сталіца нядрэнна паставілася да гэткага павароту падзей.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**





# НОВАЯ КАНЦЭПЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ БУДЗЕ РАСПРАЦАВАНА Ў БЕЛАРУСІ Ў 2010 ГОДЗЕ

**Гэта пытанне абмяркоўвалася 24 снежня ў час даклада Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Леаніда Мальцава.**

На сустрэчы ішла размова аб шляхах удасканалення сістэмы нацыянальнай бяспекі Беларусі і яе крытэрыях.

Існуючая сістэма нацыянальнай бяспекі Беларусі на практыцы паказала сваю эфектыўнасць: у рэспубліцы стабільная эканамічная, сацыяльная і палітычная сітуацыя. Аднак новыя выклікі і пагрозы, што з'яўляюцца ў свеце, патрабуюць удасканалення сістэмы нацыянальнай бяспекі.

Таму ў першай палове 2010 года плануецца распрацаваць новую канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, якая з'явілася б метадалагічнай асновай і арыенцірам для ўдасканалення работы ўсіх дзяржаўных структур. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, работа па ўдасканаленні сістэмы нацыянальнай бяспекі павінна пранізваць усе сферы жыццядзейнасці, пачынаючы ад канкрэтнага грамадзяніна, які павінен бачыць сваё месца і ролю ў гэтай сістэме, і заканчваючы дзяржаўнымі структурамі.

Новая сістэма будзе максімальна ўлічваць усе змяненні, якія адбыліся за гэты час у рэспубліцы, у рэгіёне вакол, у свеце ў цэлым. Удасканаленая сістэма нацыянальнай бяспекі павінна адэкватна рэагаваць на магчымыя выклікі і пагрозы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ СТРУКТУРНАЙ ПЕРАБУДОВЫ КІРАЎНІЦТВА СПРАВАМІ ПРЭЗІДЭНТА

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў структурнай перабудовы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта. Такую задачу ён паставіў 24 снежня ў час даклада Кіраўніка спраў Прэзідэнта Мікалая Корбута, нядаўна назначанага на гэту пасаду.**

Аляксандр Лукашэнка закрануў кадравы і арганізацыйны бакі работы непасрэдна Кіраўніцтва справамі. Кіраўнік дзяржавы зноў нагадаў пра сваё патрабаванне «чысціні кадраў», іх правільнай расстаноўкі, а таксама ўмацавання Кіраўніцтва за кошт высокакваліфікаваных, падрыхтаваных, сумленных, прыстойных супрацоўнікаў, здольных у сучасных умовах выконваць тыя задачы, якія стаяць у цэлым перад краінай.

Прэзідэнту далажана аб папярэдніх выніках работы прадпрыемстваў Кіраўніцтва справамі ў 2009 годзе. Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў неабходнасць выканання прадпрыемствамі прагнозных паказчыкаў, а таксама вызначыў напрамкі іх работы на 2010 год.

Асноўнае патрабаванне Прэзідэнта — прадпрыемствы павінны выпускаць патрэбную прадукцыю, а таксама шукаць новыя рынкі для экспарту.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу па далейшым развіцці сферы турызму, у тым ліку ў нацыянальных парках і запаведніках. Турыстычныя аб'екты павінны стаць прывабнымі як для нашых грамадзян, так і для замежных грамадзян. Для гэтага ў рэспубліцы рэалізуецца праграма, якая ў далейшым будзе скарэктавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Прэзідэнту таксама далажана аб ходзе рэалізацыі праекта па развіцці спартыўна-аздараўленчага цэнтра «Чырвоная паляна» паблізу Сочы. Паводле слоў Кіраўніка спраў, у наступным годзе гэты аб'ект пачне працаваць на поўную магутнасць і зможа прымаць турыстаў, а таксама спартсменаў і аматараў гарналыжнага спорту. На сустрэчы ішла размова аб развіцці санаторыя «Беларусь» у Сочы, рэканструкцыі і будаўніцтве тут новых аб'ектаў. Прэзідэнт даручыў, каб да зімовых Алімпійскіх гульняў 2014 года была створана ўся неабходная база для прыняцця як беларускіх спартсменаў, так і замежных гасцей.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# КОМПЛЕКСНАЯ ПРАВЕРКА ШЭРАГУ РАЁНАЎ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАКАЗАЛА АДСУТНАСЦЬ СІСТЭМНАСЦІ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ ДЫРЭКТЫВЫ № 2

**Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь правяла чарговы маніторынг ходу рэалізацыі Дырэктывы № 2 «Аб мерах па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату» ў рэгіёнах. 23 снежня ажыццёўлена выбарачная праверка выканання Дырэктывы № 2 у Мінскай вобласці. За паўгоддзе былі маштабна праверены таксама Гродзенская і Віцебская вобласці, паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.**

Пяць рэйдавых груп вывучылі, як у Лагойскім, Барысаўскім, Слуцкім, Салігорскім раёнах і горадзе Жодзіна рэалізуецца заяўны прынцып «аднаго акна», арганізуецца прыём грамадзян па асабістых пытаннях і работа з іх пісьмовымі зваротамі, як у цэлым функцыянуюць службы, якія выконваюць адміністрацыйныя працэдуры для насельніцтва.

Праверка паказала, што ва ўсіх пяці раёнах работа па ўкараненні прынцыпу «аднаго акна» належным чынам не арганізавана, і людзі не могуць выкарыстоўваць яго ў поўнай меры. Нават там, дзе для гэтых мэтаў створаны спецыяльныя структуры, яны функцыянуюць фармальна і сур'ёзнага ўплыву на паляпшэнне сітуацыі не аказваюць. Як вынік, грамадзяне па-ранейшаму вымушаны хадзіць па інстанцыях і збіраць увесь пакет неабходных дакументаў, хоць гэты абавязак ускладзены на адпаведныя дзяржаўныя органы.

У правераных раёнах Мінскай вобласці да гэтага часу адсутнічае магчымасць запыту ў электронным выглядзе дакументаў, неабходных для ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур.

Ёсць выпадкі парушэння парадку разгляду зваротаў грамадзян. У прыватнасці, заяўнікам не заўсёды накіроўваюцца пісьмовыя адказы на іх заявы, парушаюцца тэрміны іх разгляду. Нягледзячы на дзеючае ў краіне жорсткае патрабаванне, асобныя службовыя асобы на месцах ігнаруюць парадак і графік прыёму грамадзян. Так, амаль гадзіну давялося патраціць на тое, каб знайсці старшыню Глівінскага сельвыканкама Барысаўскага раёна, які ў гэты час павінен быў весці прыём грамадзян. У Слуцкім райвыканкаме і падпарадкаваных арганізацыях асобныя кіраўнікі пачалі прымаць людзей са спазненнем, беспадстаўна перапынялі ход прыёму.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь паставіў задачу абагульніць выяўленыя недахопы з мэтай кардынальнага паляпшэння стану спраў па выкананні Дырэктывы № 2 у Мінскай вобласці. Кіраўніцтву вобласці будуць унесены прадстаўленні аб пакаранні службовых асобаў, якія дапусцілі парушэнні.

Як падкрэсліў Уладзімір Макей, самае галоўнае патрабаванне Прэзідэнта — чула ставіцца да праблем людзей. Важна перш за ўсё на месцах здымаць усе праблемы, што ўзнікаюць у іх. Неабходна дзейнасць дзяржаўных органаў рабіць найбольш эфектыўнай, максімальна зручнай для грамадзян.

Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі прадоўжыць работу па кантролі за дакладным і сістэмным выкананнем патрабаванняў Дырэктывы № 2, накіраванай на рэалізацыю прынцыпу «дзяржава — для людзей».

**БЕЛТА.**

Хакей

# ПАДЫМАЮЧЫСЯ НА ШВЕЙЦАРСКІЯ ВЫШЫНІ

**У той час, калі пачаліся калядныя святы, і насельніцтва з асалодай праводзіла некалькі запар выхадных дзён, хакеісты мінскага «Дынама» ў рэжыме нон-стоп раз за разам выходзілі на пляцоўкі розных гарадоў. 23 снежня «бела-блакітныя» ў рамках чэмпіянату КХЛ прымалі маскоўскае «Дынама», а ўжо на наступны дзень адправіліся ў Швейцарыю на прэстыжны турнір «Кубак Шпэнглера».**

Аб усім па парадку. Гульня супраць масквічоў, на наступны дзень пасля паядынку з рыжскімі дынамаўцамі, яшчэ раз даказала, што чалавечыя сілы не бязмежныя. Вытрымаць два запар вечары на высокіх хуткасцях і з пільнай увагай у абароне — задача вельмі цяжкая. Трошкі асвяжыць склад быў закліканы навабранец — абаронца Цернаўскі, які раней выступаў за новакузнецкі «Металург». (Пачынае насцярожваць тэндэнцыя трэнерскага штаба: калі Хэнлан рабіў стаўку на фінаў і канадцаў, то Андрыеўскі запрашае расіян і ўкраінцаў, пакідаючы ў фарм-клубе беларусаў). Самы пачатак яшчэ раз падкрэсліў меркаванне аб стомленасці. Расійская каманда, у якой сярод «першых скрыпак» і форвард нацыянальнай зборнай Беларусі Аляксей Калюжны, ведаючы, напэўна, аб традыцыйна моцным пачатку ў выкананні гаспадароў, сама пайшла наперад. Мезіну давялося пару разоў паказваць узровень свайго майстэрства. На дванаццатай жа хвіліне не па-абарончы ўпэўнена за чужымі варотамі згуляў Уэскат, які выклаў пас на пятак Плату. Джэф кінуў дакладна. 1:0 — і адчуванне, што не ўсё так проста складзецца ў гэты вечар для заезджых зорак. Аднак лёгкае пачуццё разляцелася на маленькія кавалкі падобна да таго, як на пачатку другога перыяду рассыпалася чарговае шкло вакол пляцоўкі Палаца спорту. Пасля некалькіх хвілін паўзы Крысанаў, згуляўшы на дабіванні, зраўняў лік. Не згодным з такім рухам падзей выступіў Андрэй Міхалёў. Ужо на сямнаццатай секундзе апошняй дваццаціхвілінкі ён выдраў шайбу за варотамі і завярнуў «баброўскую» пятлю, накіраваўшы гульнявы снарад паміж шчыткоў Ерамеева. Тое, як змяняўся лік далей, можна смела, нават зусім не перабольшваючы, «спісаць» на стомленасць «зубраў». У іншым выпадку яны наўрад ці празявалі б галявыя выпады Омарка і Камарова. Апошняму галявы пас аддаваў Вайнхандль, дарэчы, у нядзелю названы сярод 23 гульцоў шведскай алімпійскай зборнай.

«Бела-блакітным» можна шчыра паспачуваць. Графік гульняў у іх зараз фантастычна насычаны. З 22 па 30 снежня, а гэта 9 дзён, дынамаўцаў чакае шэсць выхадаў на лёд. У выпадку выхаду ў фінал «Кубка Шпэнглера» — нават 7 за 10 дзён. Некалькі слоў пра сам турнір. Ён быў арганізаваны яшчэ ў 1923 годзе. І з таго часу швейцарскі горад Давос у калядныя дні традыцыйна прымае лепшыя еўрапейскія каманды. Найбольшая колькасць перамог за гаспадарамі — 14. Зборная Канады, складзеная з паўночнаамерыканцаў, якія выступаюць за еўрапейскія клубы, перамагала 12 разоў. Мінскае «Дынама» стала першай беларускай камандай, запрошанай на турнір такога рангу. І адразу ж патрэбна было супрацьстаяць гаспадарам. Не сказаць, што яны моцна здзівілі. Гульня іх нечым нагадвала гульню зборнай альпійскай краіны: моцна, старанна, нават выдрэсіравана, але без вялікай фантазіі. І канчатковы вынік — 3:2 на карысць швейцарцаў — склаўся, трэба сказаць, кур'ёзна. Зрабіўшы дубль, Рэта фон Аркс ні ў адным з гэтых выпадкаў нават не кідаў па варотах. На першай хвіліне паядынку цэнтральны нападаючы ў сярэдняй зоне падстаўляў клюшку пад моцны пас партнёра, каб не дазволіць арбітрам свіснуць пракід, але гульнявы дыск па неверагоднай траекторыі паляцеў у бок не чакаўшага такога падвоху Коваля і прашмыгнуў яму паміж шчыткоў. У другі раз Рэта дапамог наш абаронца Антонаў, ад канька якога шайба папала ў свае вароты. Беларусы, ці ў гэтым выпадку будзе лепш сказаць — дынамаўцы, закідвалі больш асэнсавана: і пасля камбінацыі Варламава з Качатковым, і пасля праходу Ёкелы. На жаль, гэтага не хапіла для станоўчага выніку, бо на 57-й хвіліне, пасля выдалення Дзямкова, Навуменка прынёс перамогу сваёй камандзе.

Ужо на наступны дзень супернікам мінчан стаў нямецкі «Мангейм», толькі распачынаючы турнір. У складзе нашай каманды не абышлося без зменаў. Трошкі адпачыўшы, на лёд вярнуліся Пелтанен і Плат. Месца ў варотах заняў Андрэй Мезін. Калі казаць пра ход паядынку, трэба, безумоўна, адзначыць, што цікавай гульня не была. Каманды стараліся, беларусы больш валодалі ініцыятывай, але хуткасці абодвум супернікам не хапала. Першая шайба ж, наадварот, атрымалася на дзіва імклівай: выстаяўшы ў меншасці, беларусы правялі хуткую «вертыкальную» атаку, напрыканцы якой Качаткоў вылажыў шайбу пад галявы кідок Варламава. Шайба стала другой для ўкраінца ў спаборніцтвах. А вось на пачатку трэцяга перыяду ўжо немцы добра згулялі на дабіванні, зраўняўшы лік. Быць бы дадатковаму часу, каб літаральна праз дзве хвіліны Кавыршын не вывеў беларусаў наперад. Свайго яны ўжо не саступілі. Ёсць першая перамога!

**Яўген ВАРАКСА.**

## А Ў ПАДАРУНАК КІНААМАТАРАМ — «ВІРТУАЛЬНАЯ КІНАЗАЛА»

З 24 снежня па 24 студзеня філіял «Мінская гарадская тэлефонная сетка» РУП «Белтэлекам» праводзіць акцыю — падарунак ад ZALA. Усім кліентам, якія звернуцца ў пазначаны час у сэрвісныя цэнтры сталіцы для падключэння інтэрактыўнага тэлебачання, паслуга «Віртуальная кіназала» будзе давацца бясплатна на працягу аднаго месяца з моманту падключэння.

«Віртуальная кіназала» дазваляе глядзець найбольш рэйтынгавыя і папулярныя фільмы сусветнага кінематографа ў зручны для кліента час. Паказ ажыццяўляецца згодна з папярэднім анонсам. Фільматэка «Віртуальнай кіназалы» рэгулярна абнаўляецца: кожны тыдзень можна глядзець не менш як 4-5 новых кінастужак. І, што немалаважна, трансляцыя ажыццяўляецца без рэкламных блокаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Памяць

# ЖЫЦЦЁ, ПРЫСВЕЧАНАЕ ГІСТОРЫІ



**СПОЎНІЛАСЯ 90 гадоў з дня нараджэння акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Іларыёна Ігнаценкі. Да гэтай даты было прымеркавана адкрыццё мемарыяльнай дошкі на доме, у якім працяглы час жыў і працаваў вядомы гісторык.**

У назве артыкула няма ніякага перабольшання. За час сваёй шматгадовай навуковай і арганізатарскай дзейнасці знакаміты беларускі вучоны Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка падрыхтаваў 56 кандыдатаў і 26 дактароў гістарычных навук. З-пад яго пяра выйшла больш за 200 буйных даследаванняў па розных праблемах беларускай гістарычнай навукі. На пераломных, лёсавызначальных этапах развіцця беларускай гістарычнай школы яму неаднаразова давяралася кіраўніцтва вядучымі навукова-даследчымі ўстановамі. У бібліятэках за спасціжэннем тайнаў кніг, асабліва дакументальных зборнікаў, за аналізам шматлікіх архіўных крыніц акадэмік Ігнаценка правёў не толькі ўсе свае працоўныя, але і значную большасць выхадных дзён.

І.М. Ігнаценка нарадзіўся 28 снежня 1919 г. у найпрыгажэйшым кутку беларускай зямлі — у вёсцы Дамамеркі Лоеўскага (цяпер гэта Брагінскі) раёна ў сялянскай сям'і. Глеба тут на вырошчванне даравітых людзей мабыць асаблівая, бо выйшаў з гэтага краю не толькі наш таленавіты гісторык, а і цэлы шэраг іншых шырока вядомых навуковых, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў.

З глыбіні сівой даўніны дайшлі да нас старадаўнія беларускія прафесіі — земляроба і педагога. Першая магла б стаць адзінай на ўсё жыццё і для Ігнаценкі, які ўжо ў 1939 г. закончыў Клімавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Але Вялікая Айчынная вайна адразу пераўтварае маладога чалавека ў актыўнага ўдзельніка ваенных падзей спачатку на Ціхім акіяне, а затым на Чорным моры. Прафесійнае самавызначэнне працягвалася ў пасляваенны час, але ў бок педагагічнай працы. У 1950 г. Іларыён Ігнаценка пасля атрымання дыплома выпускніка гістарычнага факультэта Гомельскага педагагічнага інстытута назаўсёды аддаецца прафесіі гісторыка, яе даследчыка, вучонага-педагога.

Першым значным укладам Іларыёна Ігнаценкі ў абагачэнне беларускай гісторыі стала яго шырока дакументаваная доктарская дысертацыя «Бяднейшае сялянства — саюзнік пралетарыяту ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі (1917—1918)», якую ён з поспехам абараніў у чэрвені 1964 г. Да гэтага разгляданыя тут гістарычна важныя тэарэтычныя і практычныя пытанні вывучаліся, як правіла, схематычна, амаль пад капірку работ па гісторыі станаўлення і развіцця цэнтральных прамысловых раёнаў Расіі. Доктарская дысертацыя Ігнаценкі, яе адзінаймённае кніжнае выданне і сёння карыстаюцца павагай і попытам сярод вучоных, краязнаўцаў, простых чытачоў.

Сапраўды багатымі на станоўчыя з'явы былі для І.М. Ігнаценкі 60—70-я гады. Пад яго кіраўніцтвам і пры яго актыўным удзеле ў рэспубліцы выходзяць «Гісторыя Беларусі» ў 5 тамах, «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі», вучоны адыграў значную ролю ў з'яўленні 12-томнай Беларускай энцыклапедыі, асабліва яе 8-га тома, цалкам прысвечанага гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Натхнёна і вынікова ён працягвае вывучаць вытокі зараджэння Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай ССР, лёс беларускага сялянства ў перыяд пераходу ад буржуазнага грамадства да сацыялістычнага, станаўленне беларускага нацыянальнага рэвалюцыйнага руху, аспекты культурнага і грамадска-палітычнага жыцця Беларусі, якія да таго былі слаба раскрытыя. Іларыён Мяфодзьевіч двойчы ўзначальваў элітную па мерках таго часу навукова-даследчую ўстанову — Інстытут гісторыі партыі пры ЦК Кампартыі Беларусі, быў дырэктарам аўтарытэтнага і паважанага не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, з годнасцю прадстаўляў інтарэсы беларускай гістарычнай навукі ў такім важным усесаюзным каардынацыйным органе вучоных, як Вышэйшая Атэстацыйная Камісія СССР. Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка ў 1969 годзе выбіраецца членам-карэспандэнтам, а ў 1974 г. — правадзейным членам Акадэміі навук БССР. Ён унёс важкі ўклад у выданне першага ў СССР трохтомніка «Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны», у вяртанне з паклёпаў і домыслаў сумленнага імя І.К. Кавалёва як аднаго з галоўных арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага антыфашысцкага падполля.

Ён быў і застаецца сучасным вучоным. Гэта, у прыватнасці, пацвярджае даследаванне ім на апошнім этапе свайго жыцця такіх тэмаў, як асаблівасці фарміравання беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гісторыі нацыянальнага і дзяржаўнага самавызначэння Беларусі, узаемаадносіны беларускай дзяржавы з іншымі краінамі Еўропы і свету, суадносіны нацыянальнага, духоўнага і сацыяльнага ў фарміраванні і развіцці беларускай нацыі.

Выхадзец з вёскі, ён усё жыццё заставаўся сціплым, простым і ў нейкім сэнсе патрыярхальным чалавекам. Гэта зрабіла пэўны адбітак і на навуковую дзейнасць, дзе ён прайшоў шлях нястомнага і бескарыслівага працаўніка, які ніколі і нічога не патрабаваў для сябе, акрамя аднаго — свабоды выбару тэмы даследавання і інструментарыя навуковага пазнання.

**Яўген БАРАНОЎСКІ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

Купляй сваё — жыві лепш!

Ляхавіцкі кансервавы:

# ЭКСПАРТ ВЫРАС У ЧАТЫРЫ РАЗЫ!

**Калі прачытаў у інтэрнэце, што Ляхавіцкі кансервавы завод сёлета павялічыў пастаўкі сваёй прадукцыі на экспарт у чатыры разы, то адразу ж патэлефанаваў дырэктару прадпрыемства Леаніду ЛЕЙЧАНКУ і дамовіўся аб сустрэчы.**



— Сёння многія крызісам прыкрываюцца, як парасонам у час дажджу, а вы паў-Расіі завалілі кансервамі, — пачаў я з парога.

Л. Лейчанка замахаў рукамі. Маўляў, пра што размова, прадпрыемства наша невялікае і аб'ёмы прадукцыі — таксама. Але затым размова наладзілася.

Ляхавіцкі кансервавы завод, як і малочны — прадпрыемствы не буйныя, але ў раёне яны самыя вялікія. Марынаваныя гуркі, салаты, павідла ды абедзенны асартымент (боршч, бацвінне) — вось і ўся прадукцыя, што выпускаецца заводам.

Убачыўшы кансервавую гародніну ў слоіках савецкага перыяду, падумаў: «І хто яе купляе?» Але бяруць, і не абы-дзе, а найперш у Маскве і Пецярбургу. Магчыма, там настальгія па звыклым тавары ў знаёмай упакоўцы?

— Уся сутнасць у тым, што наша прадукцыя хоць і не ў эфектных слоіках замежнага ўзору, але вельмі якасная і таму запатрабаваная, — растлумачыў Леанід Паўлавіч.

**— А ці не губляецца яна сярод аналагічнай прадукцыі на паліцах крамаў, бо якіх толькі сёння кансерваў няма?**

— Як ні дзіўна, але не прадпрыемства шукала спажыўцоў, а яны самі на нас выйшлі. Адна мінская фірма авансуе наш завод. Атрымаўшы 1-2 мільярды рублёў на доўгі тэрмін, мы вяртаем грошы гатовай прадукцыяй, якая адпраўляецца ў Расію. Для нас гэта вельмі выгадна. А што датычыцца не дужа эфектнай упакоўкі, то ў нас ужо пабудаваны новы цэх і неўзабаве і нашы кансервы спажывец убачыць у тары еўрапейскага ўзору.

У такой сферы дзейнасці, як эканоміка, нічога з наскоку не бывае, патрэбны напрацоўкі, бачанне перспектывы і сумленныя адносіны з партнёрамі. Шахер-махер, які квітнеў у дзевяностыя, сёння не пройдзе.

За чатыры гады (2006—2009) аб'ёмы вытворчасці на заводзе выраслі на 143,8 %. І з 31 года працы Л. Лейчанкі на прадпрыемстве заўсёды выконваўся план, яно ніколі не несла стратаў.

А мы кажам пра крызіс, хоць у харчовай прамысловасці канкурэнцыя надзвычай жорсткая.

— Крызіс і на наш завод наклаў свой адбітак. Рэалізацыя прадукцыі знізілася ў Беларусі на 30 %. Але мы думаем, што здолеем выправіць сітуацыю за кошт дадатковых паставак у Расію, а калі будзе дзейнічаць Мытны саюз, то выйдзем і на Казахстан, — разважае дырэктар. — У цэлым мінулы год для завода быў адносна добрым.

Цуд бывае, калі чалавек зробіць яго сваімі рукамі. І ён на кансервавым заводзе ў тым, што на прадпрыемстве дзейнічае безадходная вытворчасць. У прадпрыемства 180 гектараў зямлі, свая ферма, тут лісце ад капусты не выкідваецца і нестандартную агародніну на звалку не вывозяць — ідзе каровам на корм. Ураджай сабралі, самі перапрацавалі, а гэта дае магчымасць знізіць сабекошт прадукцыі.

І ніякіх цудаў, і ніякіх сакрэтаў. Зазірнуў да **старшыні райвыканкама Дзмітрыя БУРДУКА** і пачуў:

— Такі кіраўнік, як Леанід Лейчанка, запатрабаваны часам, а час такая рэч — калі крыху адстаў, затрымаўся, то застанешся на абочыне. Лейчанка з месяца ў месяц выконвае ўсе паказчыкі і мае канкрэтную праграму працы. А калі ёсць нейкія агрэхі, то выпраўляюцца тут жа. Ды ён і сам кажа, што трэба працаваць, каб не было сорамна, найперш перад сабой.

Сумленне ў рабоце кіраўніка — гэта добра, але яшчэ ён павінен быць і гаспадаром, як у нашым выпадку.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Ляхавіцкі раён.*

# УСМЕШКА НА ФОНЕ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ СТАНЦЫІ

**БЯСПЕКА — самы галоўны клопат усіх, хто застаўся падтрымліваць жыццё побач з Чарнобыльскай станцыяй. І гаворка не толькі пра людзей, якія тут працуюць і за чыім здароўем — асаблівая пільнасць. Не толькі пра журналістаў ці іншых шукальнікаў прыгод, якія імкнуцца залезці за эксклюзівам туды, куды не трэба.**

Бяспечнасць — у сусветным маштабе. Бо вядома дакладна, што ўнутры чацвёртага энергаблока застаецца каля 95 % паліва, якое знаходзілася ў ім на момант аварыі. Зараз сумарная яго актыўнасць складае прыкладна 16 мільёнаў кюры. Яшчэ ўнутры аб'екта 2 тысячы тон матэрыялаў, якія могуць гарэць: графіт, кабель, пласцікат, драўляныя канструкцыі. Журналістам трох краін усё гэта дабро паказваюць на макеце, які расчыняецца. Скрыня Пандоры дае магчымасць уявіць сапраўдную небяспеку аб'екта. Насамрэч, прызнаюцца спецыялісты, яны пастаянна сустракаюцца са складанасцямі, бо доступ усярэдзіну энергаблока абмежаваны нават для спецыяльнай тэхнікі.

Між тым, работы па ліквідацыі аварыі на Чарнобыльскай станцыі за 23 гады не прыпыняліся ніколі. Вада трапляла ў аб'ект, у ім адбываліся адпаведныя дэструктыўныя працэсы. Сёння спецыяльная апаратура дапамагае наглядаць за тым, што адбываецца ў разбураным энергаблоку. Гэта сапраўды ўнікальны і складаны праект, над якім працуюць не толькі ўкраінскія, але ж і міжнародныя арганізацыі.

Сённяшні аб'ект «Укрыццё» — збудаванне, узведзенае над пашкоджаным чацвёртым блокам Чарнобыльскай АЭС. У гэтым выглядзе ён быў закончаны летась. Цяпер у праекце — новы «саркафаг», які будзе называцца «канфайнмент». Да 2012 года збудаванне ў выглядзе велізарнай аркі павінна закрыць сённяшні відарыс чацвёртага энергаблока. Пакуль што рыхтуецца тэрыторыя, дзе будзе збірацца арка. Адна з умоў да новай канструкцыі — выгрузка з чацвёртага энергаблока ядзернага паліва. Між тым, цяпер усе неразбураныя рэактары — пустыя, у іх няма ядзернага паліва. Частка выгружана ў басейны вытрымкі на першым і другім энергаблоках. А частка перавезена ў сховішча адпрацаванага ядзернага паліва на тэрыторыі побач са станцыяй.

Усе гэтыя будынкі сёння ўяўляюць звычайны прамысловы пейзаж. Узгадваюцца словы маёй бабулі, якая казала, як і многія старыя людзі ў той час: «І дзе тая рацыя? Нічога ж не бачна...» Вось будаўнічыя краны, якія замерлі назаўсёды 23 гады таму — гэта недабудаваныя пяты і шосты энергаблокі Чарнобыльскай станцыі. Тым не менш без тлумачэнняў вучоных складана зразумець: чаму вось тут радыяцыя ёсць, а вось тут, побач, яе няма.

— Я працаваў над праектам, які быў звязаны з забруджваннем паветра, — кажа **доктар біялагічных навук Валерый КАШПАРАЎ**. — Нашы нямецкія калегі вызначылі, што ў зоне адчужэння канцэнтрацыя звычайных аэразоляў — палявых часцінак пылу — ніжэйшая, чым у еўрапейскіх Альпах, прыкладна такая, як у Антарктыдзе. Яны нам кажуць: сюды людзей з лёгачнымі захворваннямі трэба прывозіць — паветра такое чыстае. Мы ім: відаць, таму, што тут няма ніякай тэхнічнай дзейнасці. А яны лічаць, што, напрыклад, у Германіі асноўная праблема ў дачыненні да гэтых часцінак — аэразолі амонію, якія ўтвараюцца на мясцовых свінафермах. І зараз за станам паветра ў зоне адчужэння пастаянна вядуцца назіранні.

Асноўная ўвага вучоных сёння звернута да рэчыва пад назвай цэзій-137. Між іншым, па тых яго дозах, якія ўтрымлівае глеба, можна людзям жыць і ў 30-кіламетровай зоне. Але навошта, калі тут няма неабходнай інфраструктуры? Тым больш што і Украіна мае паўночныя тэрыторыі, чыстыя вёскі на якіх выміраюць натуральным чынам. І яшчэ адзін элемент табліцы Мендзялеева прыцягвае асаблівую ўвагу навукоўцаў. Размова аб плутоніі-239.

— Ён мае перыяд паўраспаду 24 тысячы гадоў. За гэты тэрмін яго актыўнасць паменшыцца толькі ў два разы. Была 0,2 кюры, будзе 0,1. Піраміды пабудавалі 4 тысячы гадоў таму, а плутоній распадзецца напалову праз 24 тысячы гадоў, — працягвае прасвятляць Валерый Кашпараў. — Калі, вядома ж, не з'явяцца новыя тэхналогіі, не прыдумаюць, што з ім рабіць, і калі не дэзактывуюць гэтую тэрыторыю.

Работы па дэзактывацыі зямлі ў зоне даўно не вядуцца — іх завяршылі ў першыя гады пасля аварыі. Занадта каласальныя аб'ёмы зямлі, якую патрэбна зняць. Радыенукліды за гэты час праэмігравалі. Кабаны перарылі зямлю так, што трэба знімаць практычна 20 сантыметраў.

— Палічыце — колькі гэта зямлі будзе — і куды яе потым падзець? — дырэктар Украінскага НДІ сельскагаспадарчай радыялогіі Нацыянальнага ўніверсітэта біярэсурсаў і прыродакарыстання Валерый Кашпараў ведае праблему асабіста. — У зоне каля 800 магільнікаў, дзе былі пахаваныя будматэрыялы, зямля. У 1987 годзе тэрыторыя вакол станцыі была знятая, поўнасцю дэзактываваная — ніводнага дрэва не было. У першыя гады забруджаная зямля захоўвалася амаль што стыхійна, а потым прыйшлося весці работы па паспартызацыі магільнікаў.

**Галоўны рэдактар газеты «Бранскі рэгіён» Віталь ХАРКЕВІЧ** кажа, што на тэрыторыі Бранскай вобласці таксама існуе сёння праблема: дзе знаходзіцца знятая ў 1986 годзе і перапахаваная зямля. Ва ўкраінскай зоне адчужэння прыйшлося наноў шукаць і высвятляць, дзе тыя траншэі, у якіх былі закапаныя машыны, дрэвы, бетонныя пліты...

У 1987 годзе побач з Чарнобыльскай станцыяй лес у адзін момант стаў рыжым. Хвоя тады пад уздзеяннем вялікай дозы радыяцыі стала рудой і адразу апала. Сёння на гэтым месцы растуць нашчадкі тых дрэў, якія знутры забруджаныя значна больш, чым іх продкі. Сутнасць у тым, што карані ідуць у магільнікі з забруджанай зямлёй — падыходзіць блізка да гэтых дрэў людзям не раяць. І растлумачваецца гэта вядомымі хімічнымі працэсамі, як кажа наш экскурсавод па зоне адчужэння біёлаг Валерый Кашпараў.

— Цэзій — поўны хімічны аналаг калію, жыццёва неабходнага элемента. Гэтак жа як стронцый — поўны аналаг кальцыю. Любы жывы арганізм разам з каліем і кальцыем бяруць цэзій і стронцый. Вось і дрэвы ў чарнобыльскай зоне іх увабралі.

Наступны пункт, які мы наведваем — мёртвы горад Прыпяць.

*(Працяг будзе.)*

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**



## УГНАЕННІ КАНТРАБАНДАЙ

**Позна вечарам на аўтадарозе Брэст — Тамашоўка брэсцкія міліцыянеры праверылі дзве аўтамашыны «Фальксваген ЛТ40».**

Беспрацоўныя грамадзяне Украіны не мелі дакументаў на калійныя ўгнаенні, якія хацелі перавезці ў Валынскую вобласць. 7 тон угнаенняў канфіскавалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**ОАО «НАФТАН»**
**РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ**
(С ПОВЫШЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ) **АВТОМОБИЛИ:**

- **Шевроле-Вандуро**, 1993 г.в., начальная цена — 8212030 руб.;
- **ВАЗ 21043**, 1997 г.в., начальная цена — 1634610 руб.;
- **ГАЗ 3221**, 2001 г.в., начальная цена — 3896380 руб.;
- **ВАЗ 21103**, 2001 г.в., в аварийном состоянии, начальная цена — 3116070 руб.;
- **ГАЗ 33023**, 1997 г.в., начальная цена 2781440 руб.;
- **ГАЗ 33021**, 1996 г.в., начальная цена 2556480 руб.

Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 с пометкой «В комиссию по реализации неиспользуемого имущества» до 27 января 2010 года. Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by.** Контактные телефоны: **8 (0214) 59 46 61, 8 (0214) 59 82 19.**

УНП 300042199

**В связи с преобразованием в процессе приватизации УП «Белкоммунмаш» в ОАО «Белкоммунмаш» объявляем о сборе заявлений от лиц, имеющих право на приобретение акций создаваемого ОАО на льготных условиях и в обмен на ИПЧ «Имущество».**

Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО — 40 368 244 400 рублей.

Номинальная стоимость одной акции — 4400 рублей.

Размер средств, вносимых работниками ОАО и приравненными к ним лицами, производится по цене на 20 % ниже номинальной стоимости и на сумму, не превышающую 100 базовых величин на одного покупателя на дату государственной регистрации акций.

Продажа акций за деньги на льготных условиях осуществляется в течение 5 месяцев со дня регистрации акций, но не более 8 месяцев с момента принятия решения о создании ОАО.

Обмен акций на ИПЧ «Имущество» осуществляется в течение 5 месяцев со дня регистрации акций.

УНП 100205408.

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»**

**сообщает об отказе от проведения аукциона, назначенного на 29 декабря 2009 года в 12.00** (газета «Звязда» от 28 ноября 2009 года № 226) по продаже **лота № 1** – капитального строения (инв. № 600/С-82710), расположенного по адресу: Минская область, Минский район, Хатежинский с/с, район д. Хатежино, находящегося в республиканской собственности, оперативном управлении Учреждения «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства», и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания объекта.

УНП 100128686.

**Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового свидетельства** по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2 РП серии ТС № 0032554 **считать недействительным**.

**Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску бланки страховых полисов** по обязательному медицинскому страхованию иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь, формы 2 РН серии БВ № 2249119 и № 2249120 **считать недействительными**.

# КАЛЯДНЫ КІРМАШ ПАД ДАЖДЖОМ

**У Брэсце традыцыйны калядны кірмаш па вуліцы Гогаля распачаўся разам з праліўнымі дажджамі, якія прыйшлі на змену непрывычным маразам. Гандляры-прадпрымальнікі старанна нацягвалі палаткі, каб максімальна абараніць ад ветру і дажджу тавар. Яркасць і стракатасць спецыфічнага навагодняга асартыменту, разнастайнасць жывых і штучных ялін усё-такі стварылі святочны настрой, перабіваючы нязручнасці непагадзі.**

— А я зусім не змерзла, — гаварыла сваёй начальніцы прадавец з прадуктовай палаткі Камянецкага спажыўтаварыства ў адказ на прапанову пайсці ў магазін і пагрэцца.

Каапэратары бліжэйшых ад абласнога цэнтра раёнаў прывезлі на кірмаш свежае мяса, паўфабрыкаты і не прагадалі. Да мясных палатак актыўна падыходзілі пакупнікі. Спрацоўвала, варта заўважыць, і ўмелая рэклама. Жанчыны-прадаўцы даводзілі цікаўным, што іх мяса мае найлепшыя спажывецкія вартасці, бо спажыўкааперацыя купляе жывёлу ў насельніцтва, якое гадуе цялят-парасят «экалагічна чыстым» дзедаўскім спосабам. Як было ўстаяць перад такімі аргументамі? Ваша пакорная слуга таксама купіла ладны кавалак мяса да навагодняга стала.

А маларыцкая спажыўкааперацыя прапанавала цукеркі — самыя звычайныя, мінскіх, гомельскіх вытворцаў. Але па цэнах са значнымі зніжкамі. Зноў давялося затрымацца ля палаткі, дзе ўжо ўтварылася невялікая чарга. Гандляры мандарынамі з Эквадора і яблыкамі з Брэсцкага раёна зніжкамі не парадавалі, таму нельга сказаць, што пакупнікі тоўпіліся.

І ўсё ж абсалютная большасць удзельнікаў кірмашу выставіла на продаж менавіта навагодні тавар — ёлачныя ўпрыгажэнні, сувеніры-падарункі. Наборы былі традыцыйныя. Лідарства трымаў імяннік будучага года — тыгр. Тыграў на ўсе густы: і паласатых, і зубатых, і зробленых з натуральнага футра — прадавалі ледзь не ў кожнай палатцы. Гэты тавар, вядома, найбольш цікавіў дзяцей. Малыя цягалі за рукі маці ці бацьку ад аднаго павільёна да другога ў спадзяванні набыць упадабанага звера, а то і двух.

На фоне звычайнага асартыменту звярнула на сябе ўвагу палатка з шыльдачкай «Рамесніца Алена Штык». Тут былі развешаны лялькі, нібы яны толькі што сышлі са сцэны адпаведнага тэатра. У ляльках, анёлах, казачных персанажах няцяжкім уяўлялася ўгадаць ручную працу. А гэта значыць: еўрапейская мода на эксклюзіўныя вырабы, на тавары ручной працы дайшла да нашай памежнай правінцыі. Майстрыха Ніна Каралевіч з задавальненнем паказвала ляльку Цільду і яе сяброўак. Кожная з лялек выглядае іначай. Што і казаць, адметныя вырабы, вырабленыя з душою, падаюцца цікавымі і незвычайнымі. Акрамя лялек брэсцкія майстрыхі прапануюць у якасці калядных падарункаў ручной працы паштоўкі, цацкі і ўпрыгажэнні з воўны, якія выкананы ў тэхніцы фільцавання — валяння з шэрсці. Ёсць у іх і цёплыя рукавіцы, і процьма маленькіх самых разнастайных сувеніраў. Хоць цэны на прадукцыю рамесніц не назавеш нізкімі, але кажуць, што яны меншыя за кошт аналагічнай прадукцыі на сталічных рынках.



Рамесніца Ніна КАРАЛЕВІЧ з лялькамі.

Ну а ялін на такіх кірмашах з кожным годам становіцца больш. Пластыкавыя навагоднія дрэвы сёлета прапаноўваюцца ў самых розных колеравых варыяцыях: ад традыцыйна зялёных да белых, нібы пакрытых інеем. Жывыя прадаюцца таксама на розны густ і кашалёк. Невялікія густыя дрэўцы ў кадушках цягнуць на 60—80 тысяч рублёў, большыя — адпаведна болей. Але ж выглядаюць яны вельмі прывабна. Да таго ж гандляры абяцаюць, што дрэва будзе расці, калі яго пасля святаў пасадзіць у грунт. Самыя недарагія елкі прадаюць лясгасы. Як сведчыць стэнд-таблічка, Кобрынскі доследны лясгас прапануе яліны па 7700 рублёў да метра вышынёю, ад метра да двух — 10 900 рублёў, ад двух да трох метраў — 12 800 рублёў.

Кірмаш па вуліцы Гогаля будзе доўжыцца да Новага года. Думаю, што аўтар «Сарочынскага кірмашу» яго не зганіў бы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Не інтэрнат, а дом!

**Новы спосаб паляпшэння жыллёвых умоў работнікаў практыкуюць на прадпрыемстве «Камволь».**

Адзін з інтэрнатаў прадпрыемства на вуліцы Сонечнай, 30 рэканструююць пад жылы дом. У ім у маі 2010 года адзначаць уваходзіны 99 работнікаў, якія знаходзяцца на ўліку ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Як расказала намеснік генеральнага дырэктара па кіраванні персаналам і ідэалогіі ААТ «Камволь» Алена Пляскова, капітальны цагляны будынак інтэрната калідорнага тыпу налічвае больш як 7 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы. Ён быў узведзены ў 1958 годзе. Замест правядзення капітальнага рамонту было вырашана ператварыць будынак у паўнацэнны жылы дом з добраўпарадкаванымі кватэрамі. У Мінгарвыканкаме ініцыятыву прадпрыемства падтрымалі, быў сфарміраваны ЖБПК «КамвольБуд». Тых, хто пражываў на Сонечнай, 30, рассялілі па трох іншых інтэрнатах прадпрыемства, і ў ліпені 2008 года пачалася рэканструкцыя. На сёння цалкам замененыя ўнутрыдамавыя камунікацыі і абсталяванне, дах, замест старых акон усталяваныя шклопакеты, выкананая цеплавая рэабілітацыя сцен і пры гэтым захавана ранейшае архітэктурнае аблічча фасада з лепкай і іншымі дэкаратыўнымі элементамі. Адзіны новы штрых — прыбудавалі невялікія балконы. Цяпер вядуцца апрацоўчыя работы.

Прадпрыемства не мае намеру на гэтым спыняцца. На чарзе рэканструкцыя пад жылы дом інтэрната па вуліцы Марата, 21, пабудаванага ў 1974 годзе. Паводле слоў Алены Плясковай, гэта дазволіць не толькі вырашыць жыллёвую праблему яшчэ часткі чаргавікоў, але і знізіць затраты па абслугоўванні будынкаў інтэрнатаў.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».**

# У БЕЛАРУСКАГА ДЗЕДА МАРОЗА ПРОСЯЦЬ КРУТЫЯ МАБІЛЬНІКІ

## По словах Дзеда Мароза, у лістах дзеці і дарослыя звычайна просяць круты мабільны тэлефон, горны веласіпед, ноўтбук і нават аўтамабіль

— У кожным лісце ўтрымліваецца нейкая просьба. Ёсць і такія лісты, якія пачынаюцца словамі «Дзед Мароз, дашлі мне...», а далей ідзе цэлы пералік таго, што хоча дзіця, — расказвае Дзядуля Мароз. — Напрыклад, тату спінінг на шасці падшыпніках, маме дарагую касметыку, сястрычцы ноўтбук, яму канькі, лыжы і горны веласіпед, бабулі лекі, якія яна не можа купіць, дзядулю таксама. Але такіх лістоў не так шмат. Звычайна нам распавядаюць пра сябе, пра клас, пра тое, як любяць сям'ю, маму, тату, брацiка і сястрычку. Такія лісты хочацца чытаць і перачытваць.

Прыходзяць і вельмі праблемныя лісты, калі Дзеду Марозу пішуць як апошняй аддушыне.

— Бывае і такое, што пішуць старыя людзі, — гаворыць Дзед Мароз. — Аднойчы прыйшоў ліст ад дзядулі, якому 83 гады. Ён пісаў: «Я такі адзінокі і вырашыў напісаць табе, каб паразмаўляць з якім-небудзь блізкім і дарагім чалавекам». У такіх лістах пішуць пра сітуацыі са здароўем і побытам. І яны вельмі кранаюць. Мы на іх стараемся адразу адказаць. А калі становішча зусім цяжкае, то паведамляем у спецыяльныя службы.

Пішуць Дзядулю Марозу на працягу года. А ў навагодні перыяд рэзідэнцыя ў Белавежскай пушчы атрымлівае да 1,5 тысячы лістоў кожны дзень. Гэта лісты з усіх куточкаў Беларусі, а таксама з Канады і Ізраіля, Германіі, Нарвегіі, Украіны, Расіі і інш. На ўсе лісты Дзядуля Мароз стараецца адказаць.

— Праўда, бываюць лісты, на якія мы не можам адказаць, таму што няма дакладнага зваротнага адраса, — тлумачыць Снягурка. — Пазначана проста: Мінск, дзявяты паверх, Колю. А пасля прыходзіць ліст, маўляў, Дзед Мароз, я табе пісаў, а ты мне не адказаў.

— Быў у нас адзін цікавы выпадак. Хлопчык з Забайкалля нейкім дзівам даведаўся наш індэкс і напісаў: а\я Калыма, Дзеду Марозу. Ліст прыйшоў. Я асабіста яму адказаў. А праз паўтара тыдня ён даслаў вялікі пакет. Там былі і вершы, і малюнкі, і фотаздымкі. Ён напісаў: «Вялікі дзякуй, беларускі Дзед Мароз. Я цяпер вучуся ў восьмым класе і, пачынаючы з чацвёртага класа, пісаў у Вялікі Усцюг. Але там ніхто не адказваў».

Дзед Мароз паабяцаў, што на Новы год абавязкова будзе снег. А наконт таго, якім чакаць 2010 год, адказаў наступнае:

— Новы год — гэта год тыгра. Гэта жывёла са сваім норавам. Яна любіць ласку, павагу да асобы. І, натуральна, патрабуе ад нас рэалізацыі сваіх разумовых і фізічных здольнасцяў, працаздольнасці, а таксама імкнення ўпэўнена дасягаць пастаўленай мэты. Без гэтага будуць, на мой погляд, пэўныя складанасці. Але наш народ працавіты, памяркоўны, таму, я вас запэўніваю, усё будзе цудоўна!

**Настасся ЗАНЬКО.**

# РЫБАЛКА КАЛЯ ЛЯДОВАГА ПАЛАЦА,

## альбо Чыя рыба лепшая







Лепшая — гэта, у першую чаргу, азначае таннейшая і смачнейшая. А тое, што беларусы на добрую рыбу ласыя (як на каўбасы), яшчэ раз пацвердзілася на двухдзённым рыбным кірмашы каля сталічнага Лядовага палаца. І хоць якраз у гэтыя выхадныя недалёка ад Мінска адбываўся чэмпіянат па рыбнай лоўлі, больш плённая «рыбалка», на мой суб'ектыўны погляд (вядома, праз аб'ектыў), прайшла менавіта на гэтай гарадской плошчы. Таўсталобік, карп рознагатунковы, фарэль, асятровыя рыбы... Не было хіба шчупака ды плоткі. Жывых. А сушаныя былі.

І ўсё ж чыя рыба лепшая? Рыбгасаў «Сялец» і «Лактышы» з Брэстчыны? «Чырвонай Слабады», «Волмы», «Любані» ці «Альбы» з Міншчыны? Ці рыба з-пад Лукомля Чашніцкага альбо з Петрыкаўскага раёна? Вядома ж, спажывец, у першую чаргу, глядзіць на кошт. І там, дзе ён ніжэйшы, хутка выстройваецца даўжэзная чарга. Таму канкурэнтам даводзілася не раз перапісваць цэннікі. Карп каштаваў ад пяці да шасці тысяч за кілаграм. Таўсталобік ацэньваўся па 5280. Фарэль за 22 000. А экзатычны для нас асётр прадаваўся нават за 27 тысяч за кіло. Але куплялася і першае, і другое, і трэцяе. Вадзіцель і грузчык з рыбгаса «Альба» Нясвіжскага раёна Іван Пяроў і прадавец з гаспадаркі «Лактышы» Ганцавіцкага раёна Таццяна Боўт сказалі, што гандаль у іх быў гэтым разам удалы. Іхнія аўтамабілі-рыбавозы стаялі побач і гандлявалі яны адным відам рыбы — карпам. Тым не менш пакупнікоў хапіла ўсім. Яно і зразумела: на навагодні стол рыба будзе да месца. А яшчэ апошнім часам модна стала казаць: рыба на стале — здароўе ў целе.

І толькі ніхто не спрачаўся, чыя юшка лепшая? Бо на ўвесь рыбны кірмаш была ўсяго адна паходная кухня, якая палілася звычайнымі дровамі. Стала добрай традыцыяй на рыбных кірмашах частаваць (за паўтары тысячы) гарачай юшкай.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**





# «НАВОШТА ПЛАЦІЦЬ БОЛЬШ?»

**Так назваў свой праект навагодняй ёлкі малады гомельскі дызайнер Яўген Іваноў. Яго ёлка, абутая ў чалавечыя боты і ўпрыгожаная мандарынавай лупінай, уразіла журы конкурсу, вынікі якога падведзены ў Гомельскім палаца-паркавым ансамблі.**

Усе праекты творцаў прапануюць выратоўваць жывыя дрэвы і ствараць сваімі рукамі незвычайныя штучныя. Між тым і ёлка-пераможца, што «сядзіць» на крэсле, намякае, што дрэвы — такія ж жывыя істоты, як і людзі. Не менш цікавыя праекты іншых мастакоў. Аказваецца, папулярны навагодні брэнд можна «вырасціць» з гітары, нітак або пенапласту. Асаблівая ўвага наведвальнікаў — да вечназялёнай доларавай прыгажуні. Праўда, іх чакае расчараванне: грашовыя галінкі-купюры — толькі імітацыя. Між тым, ідэяй можа скарыстацца кожны. Зрабі такое дрэва дома — і не трэба будзе клапаціцца пра падарункі для ўсёй сям'і. Галоўнае, каб сваякі потым не пабіліся.

А вось і іншая ідэя: рэтра-ёлка, якая круціцца на старажытным патэфоне. Яе ствараальнік Марыя Маладзькова кажа, што ёй цікава даваць новае жыццё старым рэчам.

— Такая арт-ёлка — гэта быццам бы невялікая навагодняя казка, у якой кожны пабачыць свой сюжэт.

Яшчэ рэцэпты, якія можна выкарыстаць пры стварэнні навагодняга крэатыву. Стары бот, маток нітак або фотаздымак дзіцяці могуць стаць «іскрынкай» святочных упрыгажэнняў. Між тым, самім зрабіць цацкі для ёлкі сёлета прапанавалі ў музеі гісторыі горада Гомеля. І ўсё — па старажытных узорах. Прынамсі, яшчэ стагоддзе таму была такая сямейная традыцыя: дарослыя разам з дзецьмі стваралі цацкі для ёлкі. Матэрыялы выкарыстоўваліся самыя звычайныя, якія і сёння можна знайсці: папера, шкарлупіна яйка, вата.



Прыкладна ў тым жа напрамку пайшлі і стваральнікі сёлетняй галоўнай ёлкі горада над Сожам. Упершыню ў Гомелі на цэнтральнай плошчы ўсталявана навагодняя ёлка са штучных галін. Па словах першага намесніка генеральнага дырэктара гарадскога прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рыгора Тураўца, такі варыянт не толькі экалагічны, але і эканамічны. Штучнай ёлцы гарантаваны не менш чым пяцігадовы тэрмін «жыцця». Не пачуюць стук сякеры сёлета 170 дрэў, якія ў мінулыя гады высякалі ў Рэчыцкім раёне для стварэння шматпавярховай канструкцыі з калючых дрэў у Гомелі. Асаблівасць новай ёлкі яшчэ і ў тым, што яна ўпрыгожаная гірляндай, якая разлічана на 120 варыянтаў светлавога эфекту. Між іншым, у раёнах абласнога цэнтра пакуль што ёлкі традыцыйныя, сапраўдныя.

Яшчэ адзін спосаб выратавання зялёных сімвалаў Новага года прапануюць светлагорскія леснікі: букеты з яловых галінак зручна ўсталёўваць у малагабарытных кватэрах. І пах ёсць, і сумленне за загінулае дрэва мучыць не будзе. У кожным букеце ад светлагорскіх леснікоў — пяць лапак, і цана прымальная — тысяча рублёў.

Ну а Гомельская абласная арганізацыя Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа ў трэці раз правяла дабрачынную акцыю «Ёлка жаданняў». У вялізных крамах і іншых месцах абласнога цэнтра, дзе шмат людзей, з'явіліся ёлкі з фотаздымкамі выхаванцаў сацыяльных устаноў і іх просьбамі аб канкрэтным падарунку. Сабраныя падарункі валанцёры арганізацыі напярэдадні Новага года прывязуць непасрэдна дзецям: у сацыяльна-педагагічныя цэнтры, у Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, у абласныя клінічную і дзіцячую бальніцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

**Извещает о проведении аукциона по продаже недвижимости 14 января 2010 г.**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Продавец | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (столовая и магазин) | г. Гомель, ул. Объездная, 12 | Управляющий в деле о банкротстве УП «Торговый дом «Гомельпласт» | Год постройки – 1985, материал стен – кирпич, ж/б панели, общая площадь изолированного помещения – 867,8 $м^2$, помещения расположены в 4-этажном здании | 243 516 722 | 24 350 000 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **До 17.00 13 января 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| Дата, время, место проведения аукциона | **14 января 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| Номер р/с для перечисления залога | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |
| Условие продажи | Без условий. Цены указаны без НДС. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 4 % |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).** УНП 102353509.

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Проектирование вариантов раздела домов и земельных участков

Для всех форм собственности. Для любых целей

**Извещает о проведении аукциона по продаже собственности 13 января 2010 г.**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Производственное помещение общей площадью 89,5 $м^2$ | 35 789 085 | 3 500 000 |
| 2 | Помещение многофункциональное общей площадью 339,5 $м^2$ | 135 758 597 | 13 500 000 |
| 3 | Производственное помещение общей площадью 134,9 $м^2$ | 53 943 548 | 5 400 000 |
| 4 | Производственное помещение общей площадью 146,8 $м^2$ | 58 702 097 | 5 800 000 |
| 5 | Складское помещение общей площадью 206,8 $м^2$ | 82 694 780 | 8 200 000 |
| 6 | Производственное помещение общей площадью 66,4 $м^2$ | 26 551 902 | 2 600 000 |

Помещения расположены в одноэтажном кирпичном здании.
**Адрес объектов:** г. Гомель, ул. Добрушская, 51. **Продавец имущества:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Новобелицкого района. Цены указаны без НДС.

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **До 17.00 12 января 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| Дата, время, место проведения аукциона | **13 января 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация». |
| Номер р/с для перечисления залога | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |
| Условие продажи | Без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 %. |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 52 78, 77 52 87 (факс).** УНП 102353509.

**РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
- Оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и пр.)
- Организация и проведение аукционов

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА У ОАО ЗАВОД «ВИЗАС»**

**Продавец: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Октябрьского района г. Витебска**

**ЛОТ:** Здание кузнечного цеха № 10, инв. № 9020, пл. 3483 кв. м (фундамент – ж/б; стены, перекрытия – ж/б; кровля – рулон; полы – цемент, плиты; проемы – простой работы; электричество, отопление, водопровод, канализация, газоснабжение – имеется), труба кирп. – 2 шт., инв. №№ 9060, 9061, аэратор ПАМ-24 – 5 шт., инв. № 75, кран мостовой – 2 шт., инв. №№ 193, 203, сверл. станок НС12, инв. № 637, воздуходувка В8/800 – 2 шт., инв. № 1117, печь газовая инв. № 1128, печь нагрев. инв. № 1134, сварочный аппарат ДВ306 инв. № 1137, вентилятор ЦП-6-45 – 2 шт. инв. 1345, молот пневматический – 5 шт., инв. №№ 1807, 1810, 1812, 1893, 1939, станок для заточки пил инв. № 2017, кран-балка, инв. № 2306, станок для заточки пил, инв. № 2370, печь нагревательная камерная – 6 шт., инв. № 2463, 2477, 2480, 2483, 2484, автомат отрезной круглопильный – 2 шт., инв. №№ 2715, 2717 настольно-сверлильный станок 2М112, инв. № 5055, пылесос, инв. № 6123, дороги внутризаводские, инв. № 9064, с прилегающим благоустройством и инженерными коммуникациями, расположенные по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83 с начальной ценой продажи* 1 104 142 000 рублей, сумма задатка – 110 414 200 рублей.

Аукцион состоится **29 января 2010 года** в 15.00 по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по **28.01.2010 г.** включительно по адресу: г. Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников с 14.30 до 15.00 в день проведения торгов.

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 года № 559.

2. Для участия в аукционе приглашаются юр. лица и физ. лица. Участнику необходимо подать заявление, копию платежки о внесении задатка в размере 10 % от стоимости лота и документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты Республики Беларусь) – легализованную в установленном порядке доверенность. Задаток перечисляется на р/с № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», Витебск, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

3. Победитель возмещает фактические затраты по организации и проведению аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с реализуемым имуществом.

* Начальная цена продажи утверждена без учета налога на добавленную стоимость.

**Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 43 54 35; 8 (029) 591 00 02; www.Ocenka.by**

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

Для всех форм собственности. Для любых целей

**Извещает о проведении аукциона по продаже собственности 20 января 2010 г.**

| № лота | Наименование объекта/ краткая характеристика | Адрес объекта | Продавец | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Асфальтное покрытие территории 209 кв.м (инв. № 107)<br>Склад ГСМ (инв. № 39)<br>Навес (инв. № 64)<br>Гараж (инв. № 62)<br>Забор кирпичный 151 кв.м (инв. № 29)<br>Емкость 75 м.куб. (инв. № 5032)<br>Ворота металлические (инв. № 17950001) | г. Гомель, ул. Шевченко, 27 | ОАО «Гомельский подшипниковый завод» | 61 709 995 | 6 170 000 |
| 2 | Здание раздачи ГСМ (инв. № 20016)<br>Пожарный резервуар 100 м.куб. (инв. № 34) | | | 15 992 045 | 1 590 000 |
| 3 | Емкость для аварийного слива 3 м.куб. (инв. № 766)<br>Емкость для кислот 3,12 м.куб. (инв. № 4739)<br>Емкость 20 м.куб. (инв. № 590)<br>Емкость для масла 10 м.куб. (инв. № 440)<br>Емкость для масла индустриального 3,12 м.куб. (инв. № 765)<br>Емкость для химпродукции 9,63 м.куб. (инв. № 797)<br>Емкость для химпродукции 3,12 м.куб. (инв. № 799)<br>Бак для хранения кислот 2,9 м.куб. (инв. № 4924)<br>Емкость для транспорта 4,4 м.куб. (инв. № 4799)<br>Эстакада металлическая для установки емкостей<br>Колонка для дизтоплива КЗР-50-1 (инв. № 5292) с насосом НВ-3-20 (инв. № 4652)<br>Колонка для дизтоплива КЗР-50-1 (инв. № 5731) с насосом НВ-3-20 (инв. № 4651) | | | 25 130 706 | 2 510 000 |
| 4 | Склад для хранения кислот (инв. № 42) | | | 4 735 982 | 470 000 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **До 17.00 19 января 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| Дата, время, место проведения аукциона | **20 января 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация». |
| Номер р/с для перечисления залога | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 331, УНН 102353509 |
| Условие продажи | Без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 52 78, 77 52 87 (факс).** УНП 102353509.

Краіна здароўя
Выпуск № 54 (168)

Прамая лінія

# ВЯРТАННЕ Ў ДЗЯЦІНСТВА

**На пытанні чытачоў адказаў загадчык спецыялізаванага псіхагерыятрычнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксандр ГОЛУБ.**

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 22, 23 снежня.)*

***☎— Мінск, Алена. Бабуля маёй сяброўкі — абсалютна бездапаможны чалавек. Яна амаль увесь час знаходзіцца дома, пакольку не арыентуецца ў прасторы. Такога чалавека практычна немагчыма пакінуць без нагляду, яна не тое што забываецца на імёны, але нават не ўсведамляе, што робіць. Скажыце, ці ёсць у нас спецыялісты, якія маглі б наглядаць за такімі людзьмі? Куды ў такім выпадку можна патэлефанаваць?***

— Калі размова ідзе аб урачэбным назіранні, то амбулаторнае назіранне ажыццяўляе псіханеўралагічны дыспансэр. Калі ж пытанне ў аказанні сацыяльнай дапамогі, догляду, то можна звярнуцца ў камерцыйныя медцэнтры, дзе ёсць спецыяльныя медсёстры. Можна дамаўляцца і ў прыватным парадку. У тым ліку з суседзямі, знаёмымі. А дзяржаўнай службы такога кшталту няма. Звычайна канкрэтнай дапамогай займаюцца валанцёры. Медсёстры паліклінік і дыспансэраў ажыццяўляюць толькі агульны догляд.

***— У якіх выпадках старых людзей шпіталізуюць у ваша аддзяленне? Дзе яшчэ ў нашай краіне дзейнічаюць падобныя аддзяленні?***

— Пацыент, які пакутуе ад зніжэння інтэлекту, адаптуецца да пэўных абставінаў, у якой па меры сваіх сілаў і магчымасцяў і здольны функцыянаваць. Калі ж змяніць абставіны, то можна назіраць пагаршэнне стану хворага. Заўсёды трэба мець на ўвазе гэты аспект. Таму пры вызначэнні са шпіталізацыяй кіруюцца паняццем мінімальнай шкоды. Шпіталізацыя адбываецца пры наяўнасці відавочных прыкмет псіхічнага расстройства — у выглядзе галюцынацый, трызнення, агрэсіўных паводзінаў, калі падабраць лячэнне ў хатніх умовах праблематычна.

***— А дзе яшчэ функцыянуюць падобныя аддзяленні?***

— Тры аддзяленні ў нашым цэнтры — для жанчын, мужчын і ветэранаў Вялікай Айчыннай. У абласцях спецыялізаваных аддзяленняў няма, і таму хворыя шпіталізуюцца ў звычайныя псіхіятрычныя аддзяленні.

***☎— Брэсцкая вобласць, Зоя Андрэеўна. Ці заўсёды старасць суправаджаецца зніжэннем памяці, увагі і г.д.? Якія захворванні спрыяюць старэчай разгубленасці? Што вы параілі б рабіць, каб прадухіліць бездапаможную старасць?***

— Старасць суправаджаецца зніжэннем памяці, увагі і г.д. Гэта прыкметы так званага фізіялагічнага старэння. Яны маюць этапнасць і адпавядаюць пэўнаму ўзросту. Зніжаецца фізічная і псіхічная актыўнасць, звужаецца кола знаёмых, работ, якія звычайна выконваліся, але пацыент можа адаптавацца да гэтых падзей.

***— А назапашванне любых іншых хранічных захворванняў узмацняе працэс старэння ў цэлым?***

— Усе захворванні ўплываюць. А пагоршыць стан пры зніжэнні інтэлекту можа змена абставінаў, вялікая колькасць людзей, якія апынаюцца побач, новыя ўмовы пражывання — новая шафа, ложак, а таксама спадарожныя захворванні, абвастрэнне хранічных захворванняў.

***☎— Магілёўская вобласць, Алена Барысаўна. Калі стары чалавек у надта бездапаможным стане, ці можна выклікаць урача для агляду дамоў?***

— Гэта называецца псіхіятрычным засведчаннем. Калі пацыента немагчыма даставіць да ўрача, то можна напісаць заяву на імя галоўнага ўрача псіханеўралагічнага дыспансэра ці раённай бальніцы. Тады псіхіятр робіць агляд дома. Калі пацыента паставілі на ўлік, то спецыяліста можна выклікаць ужо і па тэлефоне. Калі ж узнікаюць неадкладныя станы, то сваякі выклікаюць «хуткую дапамогу» і прыязджае псіхіятрычная брыгада.

***— Як трапіць на прыём да герыятра? Ці варта спачатку наведацца да тэрапеўта?***

— Герыятр аказвае спецыялізаваную дапамогу, і да яго на прыём трапляюць па накіраванні. Дастаткова звярнуцца да тэрапеўта. Калі ж з'явіліся прыкметы псіхіятрычнага захворвання, то звяртаюцца да псіхіятра па месцы жыхарства.

***☎— Глыбоцкі раён, Юрый. Мой дзед — яму 89 гадоў — жыве з бабуляй у вёсцы. Некалькі гадоў таму ён пачаў забывацца на тое, што вось толькі рабіў, не пазнае ні дзяцей, ні ўнукаў. Але ж ніхто са сваякоў да сябе яго пакуль не бярэ. Думаем, што змена месца жыхарства не пойдзе яму на карысць. Ці правільна мы лічым? Што вы параіце рабіць, калі аднойчы ён раптам застанецца адзін?***

— Калі сям'я трывалая, і сваякоў шмат, значыць, трэба дамаўляцца аб тым, каб аказваць дастатковую дапамогу па месцы жыхарства. Змена абставінаў можа не пайсці на карысць пры псіхічных парушэннях. Акрамя таго, старыя людзі ў прынцыпе складана мяняюць стэрэатыпы, вельмі дрэнна ставяцца да новых абставінаў. Яны пастаянна думаюць аб тым, што некаму перашкаджаюць, словам, у іх з'яўляецца неспакой з гэтай нагоды. Таму магу параіць сачыць за тым, каб падтрымліваць старых па іх месцы жыхарства настолькі, наколькі гэта магчыма. Калі ж ваш дзядуля застанецца адзін, то гэта само па сабе будзе стрэсавым фактарам. Мужчыны наогул горш пераносяць падобныя змены. Стрэсам будзе і тое, што тую працу, якая раней дзялілася на дваіх, цяпер давядзецца выконваць аднаму. У любым выпадку вы павінны зрабіць для яго ўсё, што ў вашых сілах.

***☎— Мінск, Тамара Сяргееўна. Пастаянна прымаю прэпараты для зніжэння ціску. Перыядычна — для зніжэння ўзроўню халестэрыну. Заўважаю, што пагаршаецца памяць. Ці звязана гэта з утрыманнем халестэрыну? Што вы параіце мне рабіць?***

— Узровень халестэрыну і ліпапратэідаў у крыві паказвае, што сасуды верагодна пашкоджаныя атэрасклератычнымі бляшкамі. Халестэрын не ўплывае на памяць. На яе ўплывае ступень пашкоджання сасудаў і стадыя артэрыяльнай гіпертаніі. Дапамагаюць падтрымліваць памяць не толькі лекі, але і здаровы лад жыцця, правільнае харчаванне, умераная фізічная актыўнасць, пазбяганне стрэсаў.

***☎— Гомель, Галіна. Ці можа разумовая слабасць быць спадчынным захворваннем?***

— Гэты стан называецца дэменцыя. Пры ім адбываецца поўны распад усіх псіхічных функцый, калі чалавек зусім бездапаможны, можа знаходзіцца ў ляжачым становішчы і нагадвае расліну. Яго трэба пастаянна дагледзець. Што датычыцца спадчыннасці, то ёсць пэўныя захворванні, якія прыводзяць да дэменцыі. У такіх выпадках спадчыннасць адыгрывае пэўную ролю. Ёсць жа набытае захворванне, звязанае са знешнімі фактарамі, напрыклад, з траўмамі ці інтаксікацыямі. Інакш кажучы, у некаторых выпадках дэменцыі спадчыннасць адыгрывае сваю ролю, аднак ёсць і такія сітуацыі, калі нават пры дрэннай спадчыннасці захворванне не ўзнікае.

***☎— Гродна, Алена. Ці існуюць нейкія спосабы аднаўлення функцыі паралізаваных канечнасцяў пасля інсульту?***

— Гэта пытанне не зусім да мяне, больш да неўролага. Але магу сказаць наступнае. Пасля вострага перыяду хваробы пачынаецца аднаўленчы, які цягнецца да 6 месяцаў. У гэты перыяд важна аднавіць рухальныя функцыі канечнасцяў. Калі пацыент не можа сам рухаць канечнасцю, яму трэба дапамагчы, пакуль ён не пачне рабіць гэта самастойна. Вельмі важную ролю тут адыгрывае масаж, які трэба праводзіць як мага часцей. Неабходна сачыць за тым, каб пашкоджаная канечнасць займала гарызантальнае становішча. Бо калі яна ўвесь час будзе апушчаная ўніз, то ў ёй пачне парушацца кровазварот, што, безумоўна, адаб'ецца на яе функцыі. Канечнасць трэба трымаць у цяпле, калі халодна — ухутваць. У пакоі неабходна падтрымліваць дастаткова камфортную тэмпературу.

***☎— Мінск, Антаніна Пятроўна. Маёй маці 67 гадоў. Апошнія 7 гадоў у яе дыягназ —дысцыркуляторная энцэфалапатыя. Лячэнне не дапамагае, пастаянныя моцныя галаўныя болі, моташнасць. Як можна ёй дапамагчы?***

— Дыягназ дысцыркуляторная энцэфалапатыя больш адлюстроўвае неўралагічную сімптаматыку і менш псіхіятрычную. Хоць тут можна дапусціць, што пастаянныя галаўныя болі могуць быць сімптомам нейкай дэпрэсіўнай рэакцыі. Але гэта, зразумела, не абавязкова. Моташнасць можа сведчыць пра тое, што павышаецца артэрыяльны ціск. У такім выпадку вельмі важна яго мераць і падтрымліваць на аптымальным узроўні. Яшчэ неабходна падбіраць лячэнне сасудзістымі прэпаратамі. Гэта можа зрабіць неўролаг у паліклініцы ці ўчастковы тэрапеўт. Калі ж лячэнне не дае ніякага тэрапеўтычнага эфекту, трэба звярнуцца да псіхіятра. Вы можаце пад'ехаць на кансультацыю да спецыяліста ў Мінскі псіханеўралагічны дыспансэр, які знаходзіцца па вул. Бехцерава, 5.

***☎— Магілёўская вобласць, Генадзь Пятровіч. Ці існуюць нейкія практыкаванні, каб палепшыць памяць у пажылым узросце?***

— Так, такія практыкаванні існуюць. Аднак яны працаёмкія, нецікавыя і хутка надакучваюць. Паляпшэнню памяці ў людзей сталага веку спрыяе актыўная жыццёвая пазіцыя, цікавасць да падзей, хобі, пастаянныя зносіны з навакольнымі. Чым больш чалавек размаўляе з роднымі, суседзямі, сябрамі, тым больш інфармацыі ён можа ўспрымаць, а гэта і ёсць стымул для ўмацавання памяці.

***☎— Магілёў, Юрый Віктаравіч, 74 гады. Вельмі скарджуся на сваю памяць. Памятаю тое, што было ў дзяцінстве і юнацтве, а вось тое, што адбылося паўгадзіны таму, не памятаю. Прачытаю артыкул у газеце — а праз некалькі хвілін забываюся, пра што ён быў. Нават доўга ўспамінаю, навошта я перайшоў з пакоя ў пакой. Што рабіць?***

— Я вас разумею, Юрый Віктаравіч. Гэта, зразумела, вялікая няёмкасць, калі чалавек не можа запомніць тое, што актуальна і важна менавіта зараз. У такіх выпадках я раю вам запісваць у кніжку ці сшытак тое, што сапраўды важна і трэба запомніць. А яшчэ вам лепш трэба звярнуцца да псіхіятра па месцы жыхарства, і ён вам парэкамендуе канкрэтныя прэпараты, якія лепш прымаць для таго, каб функцыя памяці не так цярпела. І такі момант. Да пагаршэння памяці могуць прыводзіць спадарожныя захворванні, якія абавязкова трэба лячыць.

***— У мяне ёсць гіпертанія...***

— Так, гіпертанічная хвароба ў вашым выпадку мае вялікае значэнне. Таму яе тэрапеўтычнае лячэнне павінна быць дастаткова эфектыўным. Звярніцеся да ўчастковага тэрапеўта, каб ён падабраў тыя прэпараты, што дапамогуць падтрымліваць ціск на аптымальным узроўні.

***☎— Бабруйск, Тацяна Мікалаеўна. Мой 20-гадовы сын трапіў у залежнасць ад 65-гадовай жанчыны. Ён проста як прывязаны да яе. Як дапамагчы яму ад гэтай залежнасці пазбавіцца?***

— У мяне недастаткова інфармацыі, каб вызначыць, ці з'яўляецца гэта залежнасцю, і даць вам параду. Тут важная думка самога вашага сына, яго ацэнка сітуацыі ва ўзаемаадносінах з гэтай жанчынай. Напэўна, вам трэба звярнуцца па месцы жыхарства да псіхатэрапеўта, каб спецыяліст папр ацаваў з вашым сынам.

***☎— Навагрудак, Галіна Мікалаеўна. Маёй маці 89 гадоў. Яе дыягназ — дысцыркуляторная энцэфалапатыя. Прымае пірацэтам, вінпацэцін. Ці можна ёй прымаць гэтыя прэпараты?***

— Вырашаць, якія прэпараты трэба прымаць, можа толькі той урач, які назірае пацыента. Усё залежыць ад таго, як чалавек сябе адчувае. Калі ўзнікаюць нейкія праблемы, і вы іх звязваеце з прыёмам канкрэтнага прэпарата, то трэба сказаць пра гэта доктару. Магчыма, лякарства неабходна замяніць на аналаг, які не дае пабочных эфектаў.

***☎— Мінск, Сяргей Пятровіч. Скажыце, ці ёсць прамая сувязь паміж галаўным болем і інсультам?***

— У некаторых выпадках можна праводзіць нейкія паралелі. Але ўсё залежыць ад тых фактараў, якія выклікаюць галаўны боль. Калі галаўны боль звязаны з павышаным ціскам, то, безумоўна, трэба звярнуцца да ўрача з прычыны лячэння гіпертанічнай хваробы. Пры правільным і эфектыўным лячэнні ёсць верагоднасць, што інсульт можа быць «адкладзены». І галаўны боль не будзе з'яўляцца яго сімптомам. Галаўны боль можа быць сімптомам пры розных захворваннях, напрыклад, пры неўралгіі, шыйным астэахандрозе і нават дэпрэсіі.

***☎— Клічаў, Лідзія. Маёй маці 78 гадоў. Скажыце, якія вітаміны ёй лепш за ўсё атрымліваць?***

— У сталым узросце вельмі важнае паўнацэннае харчаванне, якое лёгка засвойваецца. Інакш кажучы, тая ежа, якую мы самі гатуем. Але варта выключыць з меню смажанае і вэнджанае. Яны нагружаюць пячонку і не рэкамендуюцца людзям ва ўзросце. Таксама не рэкамендуецца выкарыстоўваць кансерваваныя прадукты. А вітаміны лепш за ўсё ўжываць тыя, што ўтрымліваюцца ў садавіне і гародніне. У зімовы і веснавы час можна прымаць комплекс полівітамінаў і мінералаў. У аптэках ёсць вялікі выбар, але варта вытрымліваць рэкамендаваную дозу і працягласць курсу.

***☎— Смаргонь, Вікторыя Пятроўна. У 70 гадоў я зламала шыйку бядра. Лячэнне было працяглым, перажыла аперацыю. Цяпер хаджу з кавенькай. І ўвесь час баюся, што траўма можа паўтарыцца. Ці можна засцерагчыся ад гэтага?***

— Парады не мудрагелістыя. Варта ўлічваць надвор'е, калі вы выходзіце на вуліцу, пазбягаць галалёду ў зімовы час. Сачыць за тым, каб усялякія перашкоды ў кватэры, у выглядзе маленькіх табурэтак, цацак, дывана не заставаліся ў непадыходных месцах. Важны і абутак, які не павінен быць слізкім.

***☎— Мінск, Еўдакія. Маёй маці 75 гадоў. У яе вельмі высокі артэрыяльны ціск. Верхні, бывае, даходзіць да 190. Тады яна прымае прэпарат і можа збіць ціск да 160. Ці можна ў такім узросце дабіцца зніжэння ціску да 140?***

— Зніжэннем артэрыяльнага ціску і лячэннем гіпертанічнай хваробы пераважна займаюцца тэрапеўты, таму выбар прэпаратаў, якія будуць рэгуляваць ціск, у іх кампетэнцыі. Калі прэпарат не эфектыўны, трэба звярнуцца да свайго тэрапеўта і папрасіць лекі змяніць. Варта памятаць, што хуткае зніжэнне артэрыяльнага ціску можа выклікаць слабасць і галавакружэнне. Таму лепш прымаць прэпараты працяглага дзеяння, якія не выклікаюць рэзкіх хістанняў артэрыяльнага ціску.

***☎— Дзяржынск, Нэла Іванаўна. Мне 73 гады. Вельмі моцна шуміць у галаве. Прымала пірацэтам, цынарызін. Раней дапамагалі ўколы пірацэтаму, а цяпер не дапамагаюць. Раней шум быў толькі пры высокім ціску, а цяпер пастаянны. Не магу нават хадзіць, мяне хістае...***

— У гэтым выпадку варта пракантраляваць ціск і сачыць за яго лічбамі, каб яны былі прыкладна на адным узроўні. Калі прэпарат неэфектыўны, яго варта змяніць. Займаюцца гэтым тэрапеўты, якія лечаць гіпертанічную хваробу. Што датычыцца шуму ў галаве, то існуюць прэпараты, якія ў нейкай ступені могуць зменшыць праявы гэтага пабочнага сімптому. Але іх падбірае доктар, які вас лечыць.

***☎— Бабруйск, Галіна Карлаўна. Маці 74,5 года. Апошнія паўгода ў яе пагоршыўся стан. Яна страчвае памяць, не пазнае родных, гаворыць абы-што. Няма моцы глядзець на гэта, я вельмі турбуюся за яе, калі знаходжуся на працы...***

— Мяркуючы па тым, як вы апісваеце паводзіны сваёй маці, яна знаходзіцца ў стане дэкампенсацыі, дэзадаптацыі. Вам варта звярнуцца да псіхіятра па месцы жыхарства, каб ён прызначыў невялікае карэкцыйнае лячэнне па прычыне яе неспакойных паводзінаў.

***— А ці можна псіхіятра дадому выклікаць?***

— Механізм выкліку спецыяліста дадому існуе. Гэта можна зрабіць па тэлефоне. Калі не атрымаецца, трэба напісаць афіцыйны ліст на імя галоўнага ўрача псіханеўралагічнага дыспансэра. У запісцы апісаць усю сімптаматыку, якая вас турбуе, і папрасіць аб медыцынскім аглядзе дома псіхіятрам.

**Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.**



СНЕЖАНЬСКІЯ ПАЛЁТЫ

Фота БЕЛТА.

## Напярэдадні навагодняга застолля лепш налягаць на агародніну і садавіну

Наперадзе любімае дзятвой і дарослымі свята — Новы год. Па традыцыі святочны стол будзе шчодры на мноства самых розных страў. Параду, як пазбегнуць непрыемных наступстваў пераядання, даюць спецыялісты Міністэрства аховы здароўя.

Частая памылка заключаецца ў тым, што, як правіла, 31 снежня многія стараюцца абмежаваць сябе ў ежы, а ўжо за святочным сталом навярстаць прапушчанае. Гэта не правільна. Не варта садзіцца за стол на галодны страўнік, бо гэта прамы шлях да пераядання. Лепш на працягу дня есці агародніну і садавіну, тады на тлустыя салаты і іншыя стравы не будзе цягнуць так моцна.

Безумоўна, кожная гаспадыня стараецца паказаць сваё майстэрства, асабліва ў свята. І як тут не разгубіцца? Тут самая галоўная парада: паглядзеўшы на святочны стол, лепш адразу вызначыцца з тым, што вы будзеце каштаваць, і пакласці адразу ўсё з намечанага спісу. Яшчэ адна рэкамендацыя: каб не з'есці больш, чым належыць, варта выпіць шклянку вады перад ядой. Нельга накідвацца на ўсё запар, а таксама запіваць ежу газаванымі напоямі. Акрамя таго, неабходна старанна перажоўваць ежу, бо ўжо сама па сабе добра перажаваная ежа папярэджвае пераяданне. Бо чалавек, які старанна перажоўвае ежу, менш з'ядае і хутчэй адчувае насычэнне. Будзе карысна наладжваць 15-хвілінныя паўзы пасля кожнай новай стравы.

Безумоўна, святочнае застолле трэба чаргаваць з фізічнай актыўнасцю. Можна патанцаваць, парухацца або выйсці, напрыклад, на прагулку да навагодняй ёлкі.

Як адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, начальнік аддзела першай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Жылевіч, з-за стала трэба ўставаць з лёгкім адчуваннем голаду. Акрамя таго, трэба памятаць, што алкаголь, смажаныя стравы ўзбуджаюць апетыт. Такой жа ўласцівасцю валодаюць цытрусавыя, цыбуля, часнок, пятрушка, хрэн, кроп, сельдэрэй. А вось у свежых яблыках, грушах утрымліваецца клятчатка, якая дапамагае страўніку хутчэй справіцца з атрыманай ежай. Дэсерт можна есці праз гадзіну пасля асноўнага застолля.

Вяртацца да нармальнага харчавання трэба паступова, што дазволіць арганізму адаптавацца да правільнага рэжыму. Акрамя таго, для здароўя карысна раз у 7—9 дзён наладжваць разгрузачныя дні. Іх сэнс у тым, што змяншаецца колькасць ужытай высокакаларыйнай ежы. Такія дні падрыхтоўваюць стрававальную сістэму да рэжыму, які быў да святаў.

**Кар. БЕЛТА.**

## БРЫТАНСКІЯ ЎРАЧЫ НАВУЧЫЛІСЯ ЛЯЧЫЦЬ ГІПЕРТАНІЮ ЗА ГАДЗІНУ

**Унікальную аперацыю на нерве, якая дазваляе вылечыць артэрыяльную гіпертэнзію, паспяхова правялі брытанскія ўрачы. Першым пацыентам стаў 68-гадовы мужчына, які хварэў на дыябет, глыбокі вянозны трамбоз і перанёс інсульт, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на «Дэйлі тэлеграф».**

Для пазбаўлення ад артэрыяльнай гіпертэнзіі, на якую пакутуюць мільёны людзей, не патрабуецца агульны наркоз, а ўся працэдура займае каля гадзіны. Аперацыя стала часткай міжнародных клінічных выпрабаванняў новай методыкі, якая ўжо названая спецыялістамі самым прыкметным прарывам у гэтай галіне медыцыны за апошнія паўстагоддзя.

Сутнасць методыкі ў тым, што пры дапамозе спецыяльнага правадка, які ўводзіцца праз крывяносны сасуд, наносяцца маленечкія апёкі на нерв, які адказвае за перадачу з мозга ў ныркі пэўнага сігналу. Гэта аперацыя называецца аблацыяй ныравчнага сімпатычнага нерва. Яна дазваляе заблакіраваць нервовы імпульс, з дапамогай якога мозг прымушае органы нарасціць крывяны ціск.

Падчас правядзення першай аперацыі пацыент заставаўся ў прытомнасці і размаўляў з урачамі. Ён быў на суткі пакінуты пад наглядам медыкаў. Аднак у будучыні, калі будзе назапашаная неабходная дадатковая інфармацыя аб перыядзе рэабілітацыі, цалкам магчыма, што пацыентаў будуць выпісваць у дзень правядзення працэдуры. Канчатковы эфект пасля аперацыі, паводле папярэдніх падлікаў медыкаў, надыдзе праз тры месяцы.

**Кар. БЕЛТА.**

## Святочны графік паліклінік

**У сувязі з пераносам працоўных дзён у студзені 2010 года ў графік работы амбулаторна- паліклінічных арганізацый былі ўнесеныя пэўныя карэкціроўкі.**

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя, 1 і 7 студзеня амбулаторна-паліклінічныя ўстановы будуць працаваць па графіку работы ў святочныя дні. 2 і 9 студзеня — па суботнім графіку работы. 3 і 10 студзеня — па нядзельным. Разам з тым у прыёмных аддзяленнях, аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі, траўматалагічных пунктах бальнічных арганізацый, якія знаходзяцца недалёка ад месцаў масавых мерапрыемстваў, у святочныя дні дзяжурыць будуць найбольш кваліфікаваныя спецыялісты. Дарэчы, у апошнюю навагоднюю ноч у Мінску было зарэгістравана 15 выпадкаў траўмаў, звязаных з выкарыстаннем піратэхнічных вырабаў. Мінская гарадская станцыя хуткай медыцынскай дапамогі будзе працаваць у навагоднюю ноч у штатным рэжыме. Брыгады хуткай дапамогі будуць дзяжурыць ва ўсіх месцах масавых гулянняў мінчан, у тым ліку і ў месцы правядзення святочнага феерверку. Усяго ў сталіцы працуюць 148 брыгад хуткай дапамогі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## САМЫЯ НЕБЯСПЕЧНЫЯ МЕСЦЫ — ГАНКІ І ПРЫСТУПКІ ГРАМАДСКАГА ТРАНСПАРТУ

**У найбліжэйшыя дні сіноптыкі прагназуюць складаныя ўмовы надвор'я: моцны працяглы снег, завіруху, снежныя заносы і галалёдзіцу. Работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі і медыкі актыўна рыхтуюцца да капрызаў беларускай зімы. Як паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Эдмунд Грышкавец, гэта служба з гонарам здала першы экзамен — моцныя снегапады і рэзкае паніжэнне тэмпературы не паралізавалі рух аўтатранспарту, як гэта назіралася ў той жа Заходняй Еўропе: «Нам нават не давялося прыбягаць да нейкіх надзвычайных мераў — уся работа была толькі планавая». Па словах спецыяліста, у зімовы час на беларускіх дарогах шчыруюць 2,5 тысячы адзінак уборачнай тэхнікі, а таксама больш як тысяча самазвалаў і трактароў, прызначаных для вывазу снегу. Для супрацьстаяння галалёдзіцы было нарыхтавана больш як 300 тысяч тон пясочна-саляной сумесі. І ўсё ж такі і дарожнікі, і работнікі ДАІ, і медыкі самай небяспечнай лічаць нулявую тэмпературу.**



— Пры такіх умовах рэзка павышаецца рызыка дарожна-транспартных здарэнняў, — паведаміў **старшы інспектар УДАІ МУС Станіслаў САЛАВЕЙ**. — А што мы назіраем сёння: вадзіцелі не паспелі прыстасавацца да зімовых умоў ваджэння. Многія не падрыхтавалі загадзя свой транспарт да зімы: ні шыны, ні паліва, ні вадкасці для ачышчэння шкла... Таксама варта мець на ўвазе, што аб'ёмныя зімовыя курткі і абутак на шырокай падэшве мала падыходзяць для людзей, якія садзяцца за руль аўтатранспартнага сродку.

**Загадчык прыёмнага аддзялення РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Сяргей КАЗАЕЎ** упэўнены, што мяняць «гуму» на колах трэба не толькі вадзіцелям, але і пешаходам. Адно з галоўных правілаў — абутак павінен быць устойлівым. Лепш за ўсё для зімы падыходзяць боты ці чаравікі на пляскатай падэшве. Дапускаюцца шырокія абцасы вышынёй не больш за 3-4 сантыметры. Палепшыць счапленне з зямлёй могуць наклееныя на падэшву ў вобласці мыска і пяткі кавалкі лейкапластыру (толькі не выбірайце танюсенькі імпартны лейкапластыр). А вось аматаркі высокіх абцасаў і вузкіх загнутых насоў моцна рызыкуюць атрымаць пры падзенні пералом галёнкі. Нячышчаных вуліц і раскатаных лядовых дарожак трэба пазбягаць. Лепш зрабіць лішні круг, згубіць час, чым правесці наступны месяц на бальнічным ложку. Па слізкай дарозе рухацца трэба, быццам бы ідзеш на лыжах...

Прычынай падзення даволі часта становіцца сумка на доўгіх ручках, асабліва перагружаная, якая звісае з пляча сваёй гаспадыні. Такая сумка не толькі перамяшчае цэнтр цяжкасці і не дазваляе своечасова зманеўраваць, але і цягне жанчыну каменем уніз. Тая, каб не аказацца пасярод вуліцы ў распластаным стане і не згубіць сваё аблічча, размахвае рукамі і спрабуе схапіцца «за паветра».

— Падаць абавязкова трэба на бок, паспрабаваўшы пры гэтым згрупавацца (уцягнуць галаву і прыцiснуць локці да бакоў), — папярэдзіў Сяргей Казаеў. — Калі чалавек падае на спіну, то пагрозе траўміравання падвяргаецца яго пазваночнік і галава. Асабліва небяспечныя падзенні на прыступках лесвіцы. А калі чалавек спрабуе змякчыць прызямленне выстаўленымі рукамі, ён рызыкуе атрымаць пералом прамянёвай косткі ці траўму кісці.

**За чатыры дні (з 24 па 27 снежня) у РНПЦ траўматалогіі і артапедыі звярнуліся каля 400 чалавек, якія пацярпелі з-за галалёдзіцы. Пік траўмаў у сталіцы прыйшоўся на вячэрнія гадзіны 23 снежня, калі мінчане вярталіся з працы: ніхто не чакаў, што замест мокрага снегу з неба пальецца дождж, які ператварыў у сапраўдны каток і тратуарную плітку, і асфальт, і прыступкі лесвіц...**

Зразумела, што ў горадзе ёсць асабліва траўманебяспечныя месцы: гэта ганкі крамаў, ЖЭСаў, аптэк і многіх іншых арганізацый, пры будаўніцтве якіх выкарыстоўвалася плітка, якая ператвараецца зімой у сапраўдную лядовую пляцоўку. Тратуарную плітку, якой упрыгожаны цэнтр сталіцы і многія гарадскія скверы, таксама бяспечнай нельга назваць, хоць гарадскія ўлады і спрабуюць пераканаць нас у экалагічнасці і зручнасці гэтага матэрыялу. Не менш небяспечныя аказваюцца прыступкі транспартных сродкаў і той адрэзак праезнай часткі, на які даводзіцца спускацца, каб перабрацца ў транспартны салон. Асабліва рызыкуюць жанчыны, якія носяць доўгія паліто ці шубы. Дарэчы, капюшоны, якія звужаюць агляд, медыкі таксама з задавальненнем бы забаранілі. Скажам, пры пераходзе вуліцы чалавек з такім галаўным уборам не можа своечасова ацаніць сітуацыю на дарозе. А на пешаходных пераходах таксама можа быць вельмі слізка, да таго ж і тармазны шлях у аўтатранспартных сродкаў падчас галалёдзіцы істотна павялічваецца.

— Паколькі пераход да моцных маразоў быў у гэтым годзе рэзкім, то і нашы дарогі не паспелі ператварыцца ў непераадольную перашкоду, калі пад снежнай крупой хаваецца лёд ці калі снег падае на зямлю і тут жа ператвараецца ў слізкае покрыва. Хоць у зімовы час колькасць вулічных траўмаў традыцыйна павялічваецца, — дадаў Сяргей Казаеў. — Карыстаючыся выпадкам, я хацеў бы папрасіць немаладых людзей у галалёдзіцу ўвогуле не выходзіць без суправаджэння з дому. З узростам каардынацыя ў чалавека пагаршаецца, а косці становяцца асабліва крохкія. Самая распаўсюджаная траўма ў немаладых людзей — пераломы шыйкі сцёгнаў, якія вельмі доўга і не заўсёды зрастаюцца. А калі ўсё ж немагчыма адкласці выхад з дому, трэба абавязкова прыхапіць з сабой кіёчак з металічным наканечнікам, які дазволіць зменшыць слізганне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## НОВЫ МЕТАД ВЫЗНАЧЭННЯ ПОЛУ БУДУЧАГА ДЗІЦЯЦІ?

Вучоныя з Нідэрландаў распрацавалі новы бяспечны метад вызначэння полу будучага немаўляці, які можна прымяняць ужо на пятым тыдні цяжарнасці. Справаздача аб рабоце даследчыкаў апублікавана ў часопісе «Obstetrics and Gynecology».

Пол дзіцяці вызначаецца па ўзорах крыві маці. Даследчыкі аналізуюць наяўнасць тых ці іншых генетычных палавых прыкмет у ДНК плода, якая ўтрымліваецца ў крыві цяжарнай. Уся працэдура займае 2—4 дні, а дакладнасць новага метаду набліжаецца да 100 %. Даследаванне доўжылася 6 гадоў, у ім узяла ўдзел 201 цяжарная жыхарка Нідэрландаў. Ва ўсіх выпадках вынікі аналізаў аказаліся правільнымі. Кіраўнік навуковага праекта Петэр Шефер адзначыў, што больш ранняе вызначэнне пола дзіцяці дазволіць, у выпадку неабходнасці, правесці дадатковыя даследаванні для выяўлення спадчынных паталогій, звязаных з палавымі храмасомамі. Акрамя таго, новы метад дазволіць пазбегнуць ускладненняў, магчымых пры выкарыстанні традыцыйных спосабаў вызначэння полу дзіцяці на ранніх тэрмінах цяжарнасці. Гэтыя спосабы патрабуюць правядзення пункцыі плоднага пухіра і траўматычныя для маці.

Сіла слова

## «НА ЎСЁ ДОБРАЕ І ЗДАРОВАЕ...»

Не здзіўляе і той факт, што па аналогіі са шматлікімі дзеяннямі, умовамі і акалічнасцямі, людзі імкнуліся любым чынам пазбавіцца ад грыжы — выгрызаючы яе. Лічылі, што раз яна ўгрызаецца ў любое, у самае здаровае і чыстае цела, не баючыся нічога і нікога, то і ад яе можна пазбавіцца менавіта такім шляхам. Хвароба, якая рэзала, калола, мучыла чалавека, таксама была асуджана на гэткія ж пакуты. Яе і запалохвалі, і лякалі, і забівалі, але найчасцей — адсылалі ў нейкія глухія мясціны, якія ў продкаў цвёрда асацыяваліся з нежыццёвай прасторай, дзе заўсёды ўладарылі гэткія ж самыя чорныя і непажаданыя сілы. Адпаведна, туды сумленнаму вяскоўцу шлях быў замоўлены і забаронены. Там мог пабываць, ці пабірацца толькі чорны, зласлівы знахар, які меў на мэце ўчыніць нешта благое астатнім. Гэта ведалі з даўніх часоў, так засталося і ў адвечнай традыцыі. Сустракаліся выпадкі, калі чытаючы ці прамаўляючы такія вуснапаэтычныя творы, інфарматары паварочваліся да далёкага лесу або балота спінаю. А то і наадварот — тварам. «Першым разам, божым часам, Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся, ранняй зары папрашу: «Зоры-заранiцы, божыя памачніцы, прыдзіце, памажыце рабе божай Таццяне, грызь угаварыце. Грызь-грызішча, ідзі на дубовае пнішча, ідзі на дубовы сук, а не на Таццянін пуп. Я з словам, а Гасподзь з помаччу. Амінь» («Ад грыжы», в. Галева); «Ты — грызь, ты — грызь, ты — грызь, а я каза (тры разы). Я цябе поедам паем. Так ты сук-яловік, як табе ад грызі, так, каб у цябе грызі ніколі не было. Замову прамаўляць, тройчы плюнуўшы на яловы, а калі яго не было паблізу, то на любы, сук» («Ад грызі», в. Пінкавічы); «Ты — грызь, ты — грызь, а я — каза. Я цябе адразу паем (тры разы паўтарыць). Так ты, сук-ялоўнік, як табе атныне нету, так каб і табе ад грыжы атныне не было. Гаварыць замову, тройчы плюнуўшы на сук у сцяне». («Замова ад грызі», в. Круглае); «Як на тым суку отрасці не бываць, так у етага младзенца (імя) грызі не бываць: ірвотныя, паспешныя, малочныя, падзіўныя, прыгаворныя, намоўныя, жаночыя, хлапечыя, мужчынскія, дзявоцкія. Грызь грызача і кусача, я ж у цябе, у младзенца (імя) выкалываю і выгрызаю, каб у етага младзенца грызі не бываць, дзе загырчаю, там табе і прападаць. Ні я выгаварываю, выгаварывае Ісус Хрыстос сваім духам і святам (дзень). Амінь» («Ад грызі», в. Лемяшэвічы); «Рыжа-грыжа, добрая ты маладзіца, не грызі майго цела. Як у полі каменне, а ў лесе — паленне. Амінь» («Замова ад грыжы», в. Сошна).

І ўсё ж асноўную ўвагу нашы продкі заўсёды звярталі не на жывёл і вядзенне гаспадарчых спраў, хоць ніколі не забываліся і пра гэта, а на самога чалавека. Найперш — на жанчыну. На жанчыну-маці, жонку, сястру. Ведалі сапраўдную іхнюю ролю ў жыцці. Вядома, шмат у чым яна была па традыцыі заніжана, звужана, але гэта з-за таго, што не жадалі мужчыны прызнаваць верх слабай палавіны ў многіх гаспадарчых і хатніх справах. А калі гаворка заводзілася пра дзяцей, то тут прыціхалі ўсе чыста, нават самыя злосныя прыхільнікі таго, што менавіта мужчыны цягнуць на сабе ўвесь жыццёвы воз, на іхніх плячах ён трымаецца, а калі толькі пахіснуцца ці адвернуцца, дык усё адразу і абрынецца, не ўстаіць. Затое рэальнасць жыцця сведчыла пра адваротнае. Вопытныя, умудроныя жыццём бабкі-павітухі ніколі не забываліся, што жанчына перад родамі і падчас іх вельмі слабая, і яе ў гэты час, як ні ў які іншы, неабходна падтрымліваць, даваць спакой, надзею на добрыя адносіны, многае даравальна, не паднімаючы крыку-гвалту, лішні раз не чапляючыся і не спрабуючы ў абавязковым парадку разбіраць нейкія спрэчныя сітуацыі.

*(Працяг будзе.)*

**Аляксей НЕНАДАВЕЦ.**

# Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ АДУКАЦЫІ

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 кастрычніка 2009 года*
*Ухвалены Саветам Рэспублікі 22 кастрычніка 2009 года*

**Артыкул 1.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 года «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 1998 года (ЗЗ БССР, 1990 г., № 4, арт. 46; Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1998 г., № 28, арт. 461; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1173; 2007 г., № 119, 2/1321) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. Артыкул 10 пасля слова «пашпарт» дапоўніць словамі «грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, дыпламатычны і службовы пашпарты грамадзяніна Рэспублікі Беларусь».

2. Частку другую артыкула 16 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Калі асоба, якая звярнулася па выкананне натарыяльнага дзеяння, не валодае мовай, на якой вядзецца натарыяльнае справаводства, пераклад тэксту дакумента, які афармляецца, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб натарыяце.».

3. У артыкуле 20 словы «, іншых» замяніць словамі « Рэспублікі Беларусь, іншых войсках і».

4. Другі сказ часткі першай артыкула 21 выкласці ў наступнай рэдакцыі: «Гэта права забяспечваецца сістэмай дашкольных, агульнаадукацыйных устаноў, устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, спецыяльных устаноў адукацыі і сацыяльна-педагагічных устаноў.».

5. Артыкулы 22—24 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 22. Мова навучання і выхавання ў дашкольных і сацыяльна-педагагічных установах**

У Рэспубліцы Беларусь навучанне і выхаванне ў дашкольных і сацыяльна-педагагічных установах ажыццяўляюцца на беларускай і (або) рускай мовах.

У адпаведнасці з пажаданнямі выхаванцаў і іх законных прадстаўнікоў па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, узгодненым з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, могуць ствараюцца групы ў дашкольных установах або дашкольныя ўстановы, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляюцца на мове нацыянальнай меншасці або вывучаецца мова нацыянальнай меншасці.

**Артыкул 23. Мова навучання і выхавання, вывучэнне моў у агульнаадукацыйных установах**

У Рэспубліцы Беларусь навучанне і выхаванне ў агульнаадукацыйных установах ажыццяўляюцца на беларускай і (або) рускай мовах.

У агульнаадукацыйных установах вывучэнне дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь, а таксама адной з замежных моў з'яўляецца абавязковым, за выключэннем асобных катэгорый асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Катэгорыі асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і парадак вывучэння імі дзяржаўных і замежнай моў вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб спецыяльнай адукацыі. Парадак вывучэння беларускай і (або) рускай моў вучнямі, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі, вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Асноўная мова навучання (беларуская або руская) вызначаецца заснавальнікам агульнаадукацыйнай установы з улікам пажаданняў вучняў і іх законных прадстаўнікоў. Абавязковая для вывучэння замежная мова вызначаецца заснавальнікам агульнаадукацыйнай установы з улікам патрабаванняў дзяржавы і магчымасцяў установы адукацыі.

У адпаведнасці з пажаданнямі вучняў і іх законных прадстаўнікоў па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, узгодненым з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, могуць ствараюцца класы ў агульнаадукацыйных установах або агульнаадукацыйныя ўстановы, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляюцца на мове нацыянальнай меншасці або вывучаецца мова нацыянальнай меншасці.

**Артыкул 24. Мова навучання і выхавання ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі**

У Рэспубліцы Беларусь навучанне і выхаванне ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, ажыццяўляюцца на беларускай і (або) рускай мовах. Ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, навучанне і выхаванне таксама могуць ажыццяўляцца на іншых мовах пры атрыманні адукацыі замежнымі грамадзянамі.

Беларуская мова ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, вывучаецца незалежна ад іх падпарадкаванасці і формаў уласнасці.».

6. Артыкул 29 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 29. Мова аб'яў, паведамленняў і рэкламы**

Тэксты афіцыйных аб'яў, паведамленняў, плакатаў, афіш і іншай інфармацыі выконваюцца на беларускай і (або) рускай мовах.

Рэклама размяшчаецца (распаўсюджваецца) на беларускай і (або) рускай мовах. Гэта палажэнне не распаўсюджваецца на рэкламу, што размяшчаецца (распаўсюджваецца) на радыё, тэлебачанні ці ў друкаваных выданнях, якія ажыццяўляюць дзейнасць выключна на замежных мовах, рэкламу зарэгістраваных таварных знакаў і (або) знакаў абслугоўвання, а таксама на рэкламу, што змяшчае агульнапрынятыя замежныя тэрміны і абазначэнні, якія ўвайшлі ў прымяненне ў арыгінальным напісанні і не маюць абазначэння на беларускай і (або) рускай мовах, або запрашэнне на працу ці вучобу асобаў, якія свабодна валодаюць замежнымі мовамі.

У рэкламе дапускаецца выкарыстанне разам з беларускай і (або) рускай мовамі замежнай мовы пры ўмове ідэнтычнасці па змесце і тэхнічным афармленні тэксту на замежнай мове тэксту на беларускай і (або) рускай мовах.».

**Артыкул 2.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1991 года «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 2004 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 20, арт. 291; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 87, 2/1031) наступныя змяненні:

1. У абзацы трынаццатым артыкула 12 словы «устаноў адукацыі, што забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй,» замяніць словамі «агульнаадукацыйных устаноў, устаноў, што забяспечваюць атрыманне».

2. Артыкул 45 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 45. Установы адукацыі ў галіне культуры**

1. Да ўстаноў адукацыі ў галіне культуры належаць установы, якія падпарадкоўваюцца Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь або галоўным упраўленням, упраўленням, аддзелам культуры мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і забяспечваюць атрыманне агульнай базавай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку работнікаў культуры, а таксама пазашкольнае выхаванне і навучанне ў сферы культуры.

2. Установы адукацыі, якія не належаць да ўстаноў адукацыі ў галіне культуры, могуць вырашаць асобныя задачы ў галіне культуры.».

**Артыкул 3.** Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 кастрычніка 1991 года «Аб адукацыі» ў рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2002 года (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1991 г., № 33, ст. 598; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 37, 2/844; 2004 г., № 123, 2/1060; 2005 г., № 104, 2/1124; 2006 г., № 92, 2/1220; № 179, 2/1265; 2007 г., № 171, 2/1350) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. Артыкул 4 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 4. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і сфера яго прымянення**

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб адукацыі грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, складаецца з актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь і прымяняецца да адносінаў, якія ўзнікаюць у сферы адукацыі, з удзелам фізічных і юрыдычных асобаў Рэспублікі Беларусь, а таксама замежных грамадзян, асобаў без грамадзянства, замежных і міжнародных арганізацый, замежных дзяржаў, калі гэтыя адносіны ўзніклі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь вызначаны іншыя правілы, чым тыя, якія ўтрымліваюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.».

2. У артыкуле 5:

частку першую пасля першага сказа дапоўніць сказам наступнага зместу: «Ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, навучанне і выхаванне таксама могуць ажыццяўляцца на іншых мовах пры атрыманні адукацыі замежнымі грамадзянамі.»;

у частцы другой слова «школах» замяніць словам «установах»;

частку трэцюю выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«У адпаведнасці з пажаданнямі выхаванцаў, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, узгодненым з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, могуць ствараюцца групы ў дашкольных установах, класы ў агульнаадукацыйных установах або дашкольныя і агульнаадукацыйныя ўстановы, у якіх навучанне і выхаванне ажыццяўляюцца на мове нацыянальнай меншасці або вывучаецца мова нацыянальнай меншасці.».

3. Абзац пяты артыкула 6 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца ўстановы адукацыі, у межах іх паўнамоцтваў у сферы адукацыі.».

4. У артыкуле 10:

частку шостую дапоўніць трэцім сказам наступнага зместу: «Правілы прыёму ў магістратуру ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, для працягу адукацыі на другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.»;

частку дзявятую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Парадак пераводу навучэнцаў ва ўстановах адукацыі ў іншыя ўстановы адукацыі, на навучанне па іншай спецыяльнасці альбо на іншую форму атрымання адукацыі, а таксама парадак іх адлічэння, аднаўлення вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Парадак і ўмовы аднаўлення студэнтаў, адлічаных з устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь. Перавод навучэнцаў у дзяржаўных установах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, з платнага навучання на навучанне за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў ажыццяўляецца на ўмовах, прадугледжаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, і ў парадку, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь.»;

з часткі дзясятай словы «якія выконваюць вызначаныя патрабаванні,» выключыць;

частку дванаццатую пасля слоў «мясцовых бюджэтаў» дапоўніць словамі «, у тым ліку па дагаворы аб мэтавай падрыхтоўцы,»;

частку чатырнаццатую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Малады рабочы (служачы), малады спецыяліст, якія не адпрацавалі тэрмін працы па размеркаванні, прадугледжаны часткай трынаццатай гэтага артыкула, абавязаныя вярнуць сродкі, затрачаныя на іх падрыхтоўку з рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, у адпаведны бюджэт. Асобы, якія не адпрацавалі тэрмін працы па размеркаванні ў сувязі з паступленнем у год атрымання дакумента аб вышэйшай адукацыі ў магістратуру, аспірантуру (ад'юнктуру) на дзённую форму атрымання адукацыі і завяршылі навучанне ў вызначаным парадку, вызваляюцца ад звароту названых сродкаў. Іншыя падставы для вызвалення ад звароту названых сродкаў вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.»;

з часткі пятнаццатай словы «а таксама падставы для вызвалення ад звароту названых сродкаў» выключыць.

5. Артыкул 11 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 11. Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь**

Адукацыйныя стандарты Рэспублікі Беларусь утрымліваюць агульныя патрабаванні да ўзроўняў адукацыі і тэрмінаў навучання, тыпаў устаноў адукацыі, класіфікацыі спецыяльнасцяў, кваліфікацый і прафесій, дакументаў аб адукацыі, абавязковы мінімум зместу адукацыі, максімальны аб'ём навучальнай нагрузкі навучэнцаў, узровень падрыхтоўкі выпускнікоў, крытэрыі ацэнкі якасці адукацыі.

Распрацоўка, прыняцце, змяненне і адмена адукацыйных стандартаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.».

6. У артыкуле 12:

пасля часткі другой дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«У агульнаадукацыйных установах, спецыяльных установах адукацыі, на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, у аздараўленчых лагерах з круглагадовым рэжымам працы вучэбныя заняткі ў навучальным годзе ажыццяўляюцца з 1 верасня па 1 чэрвеня. Калі названыя даты прыпадаюць на нерабочы дзень, то вучэбныя заняткі ў навучальным годзе пачынаюцца ў наступны і заканчваюцца ў папярэдні рабочы дзень.»;

часткі трэцюю — дзявятую лічыць адпаведна часткамі чацвёртай — дзясятай;

частку пятую пасля слоў «Рэспублікі Беларусь» дапоўніць словамі «, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь,»;

частку дзясятую пасля слоў «установы (службы)» дапоўніць словамі «, навучальна-метадычныя аб'яднанні».

7. У частцы другой артыкула 13:

слова «экстэрна» замяніць словам «экстэрнату»;

словы «або ўпаўнаважаным ім дзяржаўным органам» выключыць.

8. У артыкуле 14:

у частцы першай:

словы «(за выключэннем дашкольнай)» выключыць;

пасля слоў «адпаведнай адукацыі» дапоўніць частку словамі «(за выключэннем узроўню дашкольнай адукацыі і I ступені агульнай сярэдняй адукацыі)»;

у частцы другой словы «вырабу зацвярджаюцца» замяніць словамі «запаўнення і выдачы вызначаюцца»;

першы сказ часткі пятай дапоўніць словамі «ў парадку, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь».

9. У артыкуле 15:

у абзацы трэцім часткі другой словы «ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне пачатковай, базавай, агульнай сярэдняй,» замяніць словамі «агульнаадукацыйныя ўстановы, установы, якія забяспечваюць атрыманне»;

частку дзясятую выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Установы адукацыі, якія забяспечваюць падрыхтоўку кадраў для Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, спецыяльныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы могуць быць толькі дзяржаўнымі.».

10. Частку першую артыкула 16 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Установы адукацыі, якія забяспечваюць падрыхтоўку кадраў для Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, дзяржаўныя ўстановы адукацыі са статусам універсітэта або акадэміі ствараюцца, рэарганізуюцца і ліквідуюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанымі імі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.».

11. У артыкуле 18:

першы сказ часткі першай дапоўніць словамі «, а таксама якая пацвярджае адпаведнасць установы адукацыі вызначаным крытэрыям ацэнкі адпаведнасці ўстановы адукацыі пэўнаму тыпу»;

у частцы другой слова «пераўтварэнне» замяніць словам «змяненне»;

у частцы шостай словы «Планавая дзяржаўная» замяніць словам «Дзяржаўная».

12. У артыкуле 21:

у частцы першай словы «дзіцячы садок-школа» замяніць словамі «яслі-садок — школа, дзіцячы садок — школа»;

у частцы пятай словы «у агульнаадукацыйнай навучальна-выхаваўчай установе» і «гэта» замяніць адпаведна словамі «на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі» і «агульнаадукацыйная».

13. Главу 5 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

### «Глава 5
### АГУЛЬНАЯ СЯРЭДНЯЯ АДУКАЦЫЯ

**Артыкул 22. Мэты і структура агульнай сярэдняй адукацыі, тэрміны навучання**

Агульная сярэдняя адукацыя заклікана забяспечыць духоўнае і фізічнае развіццё асобы, падрыхтоўку маладога пакалення да паўнацэннага жыцця ў грамадстве, выхаванне грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, авалоданне навучэнцамі асновамі навук, дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, навыкамі разумовай і фізічнай працы, фарміраванне маральных перакананняў, культуры паводзінаў, эстэтычнага густу і здаровага ладу жыцця, гатоўнасці да самастойнага жыццёвага выбару, пачатку працоўнай дзейнасці і працягу адукацыі.

Структура агульнай сярэдняй адукацыі ўключае ў сябе тры ступені і два ўзроўні (агульную базавую адукацыю і агульную сярэднюю адукацыю).

I ступень агульнай сярэдняй адукацыі забяспечвае атрыманне агульнай навучальнай адукацыі і з'яўляецца абавязковай для працягу навучання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць узровень агульнай базавай адукацыі. Атрыманне агульнай базавай адукацыі дае права на працягу адукацыі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

I, II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць узровень агульнай сярэдняй адукацыі. Атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі дае права на працягу адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Тэрмін атрымання:

агульнай базавай адукацыі складае 9 гадоў (для асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — 9—10 гадоў);

агульнай сярэдняй адукацыі складае 11 гадоў (для асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — 11—12 гадоў);

агульнай сярэдняй адукацыі ў вячэрніх школах, класах, навучальна-кансультацыйных пунктах, у якіх навучанне ажыццяўляецца па тыпавым навучальным плане вячэрняй школы, складае 12 гадоў (для асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — 12—13 гадоў).

Тэрміны навучання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складаюць:

на I ступені — 4 гады (для асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — 4—5 гадоў);

на II ступені — 5 гадоў;

на III ступені — 2 гады, у вячэрніх школах, класах, навучальна-кансультацыйных пунктах, у якіх навучанне ажыццяўляецца па тыпавым навучальным плане вячэрняй школы, — 3 гады.

**Артыкул 23. Установы адукацыі, якія ажыццяўляюць навучанне і выхаванне на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі**

Да ўстаноў адукацыі, якія ажыццяўляюць навучанне і выхаванне на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, адносяцца:

агульнаадукацыйныя ўстановы;

спецыяльныя ўстановы адукацыі;

установы, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;

аздараўленчыя лагеры з круглагадовым рэжымам працы.

Агульнаадукацыйныя ўстановы — установы, якія забяспечваюць атрыманне агульнай пачатковай, агульнай базавай, агульнай сярэдняй адукацыі, асноўнай функцыяй якіх з'яўляюцца навучанне і выхаванне на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

Да агульнаадукацыйных устаноў адносяцца пачатковая школа, базавая школа, сярэдняя школа, вячэрняя школа, гімназія, ліцэй, школа-інтэрнат, санаторная школа-інтэрнат, спецыяльная школа закрытага тыпу, спецыяльная агульнаадукацыйная школа (школа-інтэрнат), а таксама навучальна-педагагічны комплекс (яслі-садок — школа, дзіцячы садок — школа, базавая школа — каледж мастацтваў, сярэдняя школа — каледж мастацтваў, гімназія — каледж мастацтваў, лінгвістычная гімназія — каледж, сярэдняя школа — вучылішча алімпійскага рэзерву). У адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь могуць ствараюцца іншыя тыпы агульнаадукацыйных устаноў.

Да спецыяльных устаноў адукацыі, якія ажыццяўляюць навучанне і выхаванне асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі, адносяцца цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, дапаможная школа (школа-інтэрнат) і спецыяльная агульнаадукацыйная школа (школа-інтэрнат).

Ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, з адначасовым атрыманнем прафесійна-тэхнічнай адукацыі могуць ажыццяўляцца навучанне і выхаванне на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, і на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, з адначасовым атрыманнем сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць ажыццяўляцца навучанне і выхаванне на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, могуць ажыццяўляцца навучанне і выхаванне на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У аздараўленчых лагерах з круглагадовым рэжымам працы могуць ажыццяўляцца навучанне і выхаванне на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

**Артыкул 24. Атэстацыя навучэнцаў. Дакументы аб агульнай базавай адукацыі, аб агульнай сярэдняй адукацыі**

Атрыманне агульнай пачатковай, агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі суправаджаецца бягучай і прамежкавай атэстацыяй і завяршаецца падагульняючай атэстацыяй навучэнцаў.

Выпускніку, які паспяхова прайшоў падагульняючую атэстацыю, за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі выдаецца пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі, за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі — атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі, а за выдатныя поспехі ў вучобе і прыкладныя паводзіны за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі — пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай, за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі — атэстат асобага ўзору з узнагароджаннем залатым або сярэбраным медалём.

Выпускнік за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі за асобыя поспехі ў вывучэнні асобных прадметаў і прыкладныя паводзіны ўзнагароджваецца пахвальным лістом.

Палажэнне аб залатым, сярэбраным медалях і пахвальных лістах зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.».

14. У артыкуле 25:

у частцы другой словы «прафілюючых агульнаадукацыйных прадметаў» замяніць словамі «асобных навучальных прадметаў (прадметаў)»;

з часткі трэцяй слова «(прафесійнае)» выключыць.

15. З часткі трэцяй артыкула 26 словы «ліцэйскія аддзяленні (групы), іншыя» выключыць.

16. У артыкуле 27:

частку трэцюю выключыць;

частку чацвёртую і пятую лічыць адпаведна часткамі трэцяй і чацвёртай.

17. У артыкуле 28:

частку трэцюю выключыць;

частку чацвёртую лічыць часткай трэцяй.

18. У артыкуле 30:

у частцы першай словы «сярэдня школы-каледжы мастацтваў, гімназіі-каледжы мастацтваў, лінгвістычныя гімназіі-каледжы» замяніць словамі «базавыя школы — каледжы мастацтваў, сярэднія школы — каледжы мастацтваў, гімназіі — каледжы мастацтваў, лінгвістычныя гімназіі — каледжы, сярэднія школы — вучылішчы алімпійскага рэзерву»;

у частцы другой словы «Сярэдняя школа-каледж мастацтваў, гімназія-каледж мастацтваў, лінгвістычная гімназія-каледж» замяніць словамі «Базавая школа — каледж мастацтваў, сярэдняя школа — каледж мастацтваў, гімназія — каледж мастацтваў, лінгвістычная гімназія — каледж, сярэдняя школа — вучылішча алімпійскага рэзерву».

19. Дапоўніць Закон артыкулам $31^1$ наступнага зместу:

**«Артыкул $31^1$. Узаемадзеянне з арганізацыямі ў падрыхтоўцы кадраў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй**

У мэтах забеспячэння патрэб арганізацый у спецыялістах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і (або) рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, садзейнічання развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, праходжання навучэнцамі практыкі ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і арганізацыі могуць заключаць дагавор аб узаемадзеянні, які прадугледжвае падрыхтоўку спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і (або) рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй для арганізацыі. Арганізацыя, якая заключыла дагавор аб узаемадзеянні, з'яўляецца арганізацыяй — заказчыкам кадраў.

Арганізацыя — заказчык кадраў, якая прыняла ў адпаведнасці з дагаворам аб узаемадзеянні абавязацельствы па стварэнні і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы, па арганізацыі практыкі навучэнцаў установы, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прызнаецца для гэтай установы адукацыі базавай. Базавая арганізацыя мае пераважнае права на забеспячэнне сваіх патрэб у спецыялістах з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй і (або) рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Палажэнне аб базавай арганізацыі, формы дагавора аб узаемадзеянні ўстановы, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і арганізацыі — заказчыка кадраў і дагавора аб узаемадзеянні ўстановы, якая забяспечвае атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, і базавай арганізацыі зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.».

20. Артыкулы 32 і 33 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 32. Мэты і структура вышэйшай адукацыі**

Вышэйшая адукацыя заклікана забяспечыць найбольш поўнае развіццё здольнасцяў і інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы, магчымасць актыўнага, свабоднага і канструктыўнага ўдзелу грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у развіцці грамадства для задавальнення патрэб грамадства і дзяржавы ў спецыялістах высокай кваліфікацыі.

Структура вышэйшай адукацыі ўключае ў сябе дзве ступені:

першая ступень вышэйшай адукацыі забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і завяршаецца прысваеннем кваліфікацыі і выдачай дыплома аб вышэйшай адукацыі;

другая ступень вышэйшай адукацыі (магістратура) забяспечвае фарміраванне ведаў і навыкаў навукова-педагагічнай і навукова-даследчай работы і завяршаецца прысваеннем ступені «магістр» і выдачай дыплома магістра.

Палажэнне аб першай ступені вышэйшай адукацыі і другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 33. Установы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі**

Да ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, адносяцца класічны ўніверсітэт, профільны ўніверсітэт (акадэмія, кансерваторыя), інстытут, вышэйшы каледж.

Установа, якая забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі, — навучальная ўстанова, якая ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў на першай ступені вышэйшай адукацыі і (або) другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) і можа ажыццяўляць падрыхтоўку для паступлення ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па дадатковай спецыяльнасці (спецыялізацыі), падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй па асобных спецыяльнасцях, прафесійную падрыхтоўку, падрыхтоўку па асобных сертыфікаваных курсах, навучанне на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Установы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, павінны адпавядаць крытэрыям, што вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь, установам, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі, могуць быць нададзены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі і статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў галіне.».

21. Артыкул 34 выключыць.

22. Артыкул 35 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

**«Артыкул 35. Атэстацыя студэнтаў. Дакументы аб вышэйшай адукацыі**

Атрыманне вышэйшай адукацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі і на другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) суправаджаецца бягучай атэстацыяй і завяршаецца падагульняючай атэстацыяй студэнтаў.

Асобе, якая завяршыла навучанне на першай ступені вышэйшай адукацыі і паспяхова прайшла падагульняючую атэстацыю, прысвойваецца кваліфікацыя і выдаецца дыплом аб вышэйшай адукацыі.

Асобе, якая завяршыла навучанне на другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура) і паспяхова прайшла падагульняючую атэстацыю, прысвойваецца ступень «магістр» і выдаецца дыплом магістра.».

23. У частцы першай артыкула 37 словы «вышэйшыя навучальныя ўстановы» замяніць словамі «ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі».

24. Частку другую артыкула 41 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пазашкольнае выхаванне і навучанне ў дзяржаўных установах адукацыі, за выключэннем дзяржаўных дзіцячых школ мастацтваў у сферы культуры, бясплатнае. Памер платы за пазашкольнае выхаванне і навучанне ў дзяржаўных дзіцячых школах мастацтваў у сферы культуры і парадак яе збірання вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.».

25. У частцы першай артыкула 43 словы «вышэйшай навучальнай установы» замяніць словамі «установы, якая забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі».

26. Частку трэцюю артыкула 44 пасля слоў «апякунскія саветы» дапоўніць словамі «, бацькоўскія камітэты».

27. Частку шостую артыкула 48 пасля слова «вызначаюцца» дапоўніць словамі «заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і».

28. У артыкуле 49:

у частцы трэцяй словы «які вызначаецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, а таксама часовай прапіскай» замяніць словамі «які вызначаны заканадаўствам Рэспублікі Беларусь»;

у частцы пятай словы «сельскіх агульнаадукацыйных навучальна-выхаваўчых устаноў» замяніць словамі «агульнаадукацыйных устаноў, размешчаных у сельскіх населеных пунктах,»;

у частцы сёмай:

абзац другі выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«пакрыццё расходаў па найме жылля ў выпадку незабеспячэння месцамі ў інтэрнатах і інтэрнатах у памерах і парадку, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;»;

абзац чацвёрты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«забеспячэнне стыпендыяй на ўмовах і ў парадку, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;».

***(Працяг будзе.)***



Рэзананс

## «З многімі думкамі аўтара ліста я не згодная»

Шаноўная рэдакцыя! Напісаць гэты ліст мяне прымусіў ліст Алеся Шыяна, які вы надрукавалі ў газеце 9 снежня гэтага года. Настаўнік — прафесія, пра якую можна марыць? Так! Працую ў школе 24 гады і ўвесь час упэўнена ў тым, што правільна выбрала прафесію. У школу да вучняў іду, як на свята. Вучні розныя. Шмат сярод іх такіх, якім ніякія веды не патрэбныя. Дрэнна вучацца, дрэнна паводзяць сябе. Тым не менш, нават да іх у большасці выпадкаў удаецца дастукацца, выклікаць цікавасць да прадмета (выкладаю гісторыю). А што казаць пра тых, хто твой урок сапраўды чакае з нецярпеннем?! Іх дапытлівыя позіркі, іх цікавыя пытанні, дыскусіі са старшакласнікамі — усё гэта напаўняе маё жыццё сэнсам, дае магчымасць самарэалізавацца. Як прыемна, калі былыя вучні віншуюць са святам, усім класам прыходзяць у госці ці тэлефануюць і просяць дапамагчы. Як прыемна, калі ў класе вучацца ўжо дзеці тваіх выпускнікоў і з гонарам кажуць аднакласнікам: «А гэта настаўніца і майго тату і маму вучыла». А калегі! Разумныя, ветлівыя, заўсёды прыйдуць на дапамогу. Наогул, лічу сябе шчаслівым чалавекам, бо мне пашанцавала і з прафесіяй, і з калегамі, па праўдзе кажучы, і з адміністрацыяй.

А вось з многімі думкамі аўтара ліста я не згодная. Калі казаць пра знешні выгляд, то настаўніца з голым пупам, згадзіцеся, гэта ўсё-такі, выключэнне. А ці вельмі добра, калі дзеці заўсёды бачаць настаўніцу ў цёмным невыразнага колеру касцюме, з гладка зачэсанымі валасамі, без макіяжу? І ў тым, што дзеці не носяць школьную форму, вінаватыя не настаўнікі. На бацькоўскім сходзе бацькі могуць канкрэтна дамовіцца па гэтым пытанні, а не чакаць валявога рашэння класнага кіраўніка ці дырэктара школы, каб потым яшчэ абвінаваціць апошніх у адсутнасці свабоды і дэмакратыі.

Наконт рэпетытарства. Скажу па гісторыі Беларусі і грамадазнаўстве. Яшчэ пару гадоў таму, калі ў тэстах часта сустракаліся пытанні не з падручніка, я таксама раіла сваім вучням звяртацца да рэпетытара. Цяпер сітуацыя змянілася і, у прынцыпе, моцны вучань можа падрыхтавацца сам.

Аплата працы настаўніка, мякка кажучы, не на тым узроўні, як падае аўтар ліста. Сярэднестатыстычная зарплата — гэта, як той выраз: «Аднаму — бублік, другому — дзірка ад бубліка». Каб атрымаць 850 тысяч рублёў, настаўнік павінен мець 2 стаўкі, вышэйшую катэгорыю і вялікі стаж працы. А класныя кіраўнікі, наогул, лічу, працуюць амаль бясплатна і часта цягнуць на сабе абавязкі бацькоў, якім часу не хапае на роднае дзіця. Водпуск у нас добры, а вось на канікулах адпачываюць толькі вучні. У нас столькі спраў на канікулах, што гэта можа зразумець толькі чалавек, які сам працуе настаўнікам, ці працуюць яго дзеці . Так званыя нулявыя ўрокі, асабліва для малодшых школьнікаў, гэта недапушчальна. Расклад урокаў зацвярджаецца ўрачамі РЦГіЭ. Бацькам можна звярнуцца да адміністрацыі школы па тлумачэнні альбо да ўрачоў, якія праверацць правільнасць выканання санітарна-гігіенічных нормаў у школе.

На вялікі жаль, у нас у грамадстве ўжо даўно існуе не вельмі добрае стаўленне да настаўнікаў. У нас усе ўмеюць вучыць — толькі не настаўнікі, у нас усе ўмеюць лячыць — толькі не ўрачы. З настаўніка часта незаслужана робяць хабарніка, чалавека, які здзекуецца з дзіцяці, чалавека помслівага і нахабнага. Дрэнна ад гэтага нам — настаўнікам. Але паверце, нічога добрага такое стаўленне да настаўнікаў не дадуць ні грамадству, ні бацькам, дзеці якіх не прывучаныя адказваць за свае ўчынкі, але вельмі добра навучаныя крытыкаваць настаўнікаў.

**З павагай настаўніца гісторыі ХРАПАВІЦКАЯ Тамара Аркадзьеўна,**
*г. Паставы.*

Памяць

## ФІЛОЛАГІ ЗГАДАЛІ АЛЕГА ЛОЙКУ

**На філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта адбылася канферэнцыя, прысвечаная памяці доктара філалагічных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алега Лойкі.**



У ёй узялі ўдзел пісьменнікі, навукоўцы, былыя і сённяшнія студэнты-філолагі з многіх гарадоў Беларусі.

Канферэнцыю адкрыла доктар філалагічных навук прафесар Таццяна Шамякіна, якая адзначыла заслугі Алега Антонавіча ў гісторыі нашай навукі, літаратуры, педагогікі і культуры, падкрэсліўшы пры гэтым, што Алег Лойка заўсёды быў генератарам цікавых ідэй на ніве беларускай філалогіі і навукі.

Доктар філалагічных навук прафесар Вячаслаў Рагойша, які вёў канферэнцыю, сказаў, што Алег Лойка быў чалавекам незвычайным, а тое, што ён зрабіў у літаратуразнаўстве, варта самай вялікай пахвалы. «Ён напісаў гісторыю беларускай літаратуры ад старажытнасці да пачатку XX стагоддзя. Тое, што па сутнасці робяць цэлыя інстытуты, а ён зрабіў адзін. Я, напрыклад, не ведаю ў рускай літаратуры такога чалавека, які б адзін напісаў гісторыю літаратуры ад старажытнасці да нашых дзён. У нас такі чалавек быў. Гэта Алег Лойка. Ён першы і адзіны пакуль беларус, які выдаў у Маскве ў серыі ЖЗЛ кнігі пра Францыска Скарыну і Янку Купалу».

«Мы разам некалі паступалі з ім на філалагічны факультэт БДУ. І з таго часу ўсё жыццё шчыра сябравалі», — прыгадаў пісьменнік Уладзімір Дамашэвіч.

Прафесар Міхась Мушынскі ў сваім выступленні падкрэсліў наступнае: «Алег Лойка вельмі моцна перажываў катаклізмы грамадскага, псіхалагічнага і палітычнага характару, якія напаткалі нас на пачатку XXI стагоддзя. Ён таксама адчуваў і сваю адказнасць за лёс нашай краіны, літаратуры і культуры. Гэта вельмі моцна ўздзейнічала на яго фізічны стан і на яго псіхалагічнае адчуванне. Алег Лойка быў маім сябрам таксама шмат гадоў. Ён з'яўляўся маім апанентам па абароне кандыдацкай і доктарскай дысертацый».

Пісьменнік кандыдат філалагічных навук Янка Саламевіч расказаў пра тое, як ён стаў філолагам, дзякуючы Алегу Лойку. А таксама шчыра прыгадаў пра свайго земляка: «Алег Лойка мне больш за іншых дапамагаў. Спрабаваў вучыць пісаць рэцэнзіі, хоць іх не друкавалі. Дапамагаў разбірацца ў літаратуры. Як аспірантам, мною афіцыйна кіраваў загадчык кафедры беларускай літаратуры філфака БДУ Міхась Рыгоравіч Ларчанка. Але трэба ўжо нарэшце прызнацца, што ён нават не прачытаў маёй работы. Алег жа чытаў, правіў, крэсліў, падказваў, што і як лепш рабіць, як пісаць навуковую працу. Калі на абароне ў маі 1971 года я сказаў у заключным слове, што ў мяне было два кіраўнікі — Міхась Ларчанка і Алег Лойка, Ларчанка нават пакрыўдзіўся, бо круціў носам. На банкет, праўда, прыйшоў.

Бацька Алега Лойкі, Антон Цімафеевіч, быў вельмі задаволены, што мы з Алегам сябруем. Алегава маці, Марыя Іванаўна, была маёй матулькаю-хроснаю, трымала мяне малога ў Альбярціне да Хрыста. Бацькі былі бедныя, поп і ксёндз бралі за хрышчэнне болей, дык яны, толькі каб дзіця было ахрышчана, аддалі мяне-малечу ў рукі ўніяту. У мяне ёсць метрыка майго хрышчэння ў Альбярціне, падпісаная самім Антонам Неманцэвічам.

Колькі мы, калі я жыў блізка ад Алега, на вуліцы Янкі Маўра ў Мінску, перагаварылі, гуляючы кожны вечар па дарожцы ў дварах. Я даў нават назву аднаму з яго зборнікаў вершаў «Дзівасіл». У мяне ўсе яго кнігі з аўтографамі. А гэта ні многа ні мала — 101! Калі я выдаў манаграфію пра Міхала Федароўскага, падпісаў яе цётцы Надзі, старэйшай бацькавай сястры, у чыёй хаце на Цагельнай вуліцы ў Слоніме яе напісаў, падпісаў матульцы, якая сказала, што гэта пасля Алегавых кніг для яе самы дарагі падарунак, Алегу і Лілі, натуральна, былі падпісаны самыя першыя экзэмпляры. Так што Алег Лойка — быў і застаецца самым дарагім, самым сардэчным, самым разумным, шчырым, самым вялікім сябрам. Яго я любіў больш за ўсіх на свеце! Ён быў маім настаўнікам, маім аднадумцам, кумірам, маім вечным захапленнем!»

Цікава прыгадалі пра Алега Лойку пісьменнікі і навукоўцы Алесь Бельскі, Міхась Тычына, Дзмітрый Бугаёў, Людміла Сінькова, Анатоль Верабей, Генадзь Праневіч. Кандыдат філалагічных навук, загадчыца кафедры гісторыі беларускай літаратуры, дацэнт Таццяна Казакова паведаміла, што сёлета быў першы юбілей факультэта, які адзначаўся без Алега Лойкі. Тым не менш у наступным годзе ў пачатку мая ва ўніверсітэце адбудуцца навуковыя чытанні, прысвечаныя Алегу Лойку. А пісьменнік Анатоль Верабей дадаў, што цяпер рыхтуецца кніга ўспамінаў пра вялікага вучонага, педагога і літаратара.

Падчас канферэнцыі студэнты і выкладчыкі паглядзелі дакументальныя фільмы пра Алега Лойку і пазнаёміліся з выставай яго кніг.

**Сяргей ЧЫГРЫН, фота аўтара.**



Прэм'ера

# ДЫЯМЕНТАВЫ ГАДЗІННІК, ЗАГІПСАВАНАЯ НАГА

**У нашым Вялікім тэатры з'явіўся яшчэ адзін казачна-навагодні балет. Да «Шчаўкунка» П. Чайкоўскага ў пастаноўцы Валянціна Елізар'ева (з гэтым балетам нашы артысты, паводле традыцыі, цяпер гастралююць у Паўднёвай Карэі) далучылася «Папялушка» С. Пракоф'ева, «нованароджаная» расійскім харэографам Юрыем Пузаковым.**

Казкі часта выводзяць на шматлікія паралелі. Так і тут: маўляў, беларуская трупа, вольная ад харэографаў, «бярэ шлюб» (на час падрыхтоўкі спектакля) з заморскім Прынцам — пастаноўшчыкам з Расіі. Бо, відаць, папраўдзе «закахалася» ў яго: Ю. Пузакоў ставіў у нас «Каханне пад вязамі», якое, на жаль, не сталася суперадкрыццём. Дарэчы, а ці прыйшліся Папялушцы па назе чароўныя пантофлікі?

У новым балеце вядомы сюжэт крыху змяніўся. Папялушка імкнецца не столькі на баль, колькі на харэаграфічны конкурс, што праходзіць у каралеўскім палацы. І, зразумела, перамагае, бо Фея і Царыцы танца шчодра адарылі яе талентам. Але апоўначы, калі Папялушка, сустрэўшы Прынца, забываецца на час, з'яўляюцца валацугі. Дзяўчына ў роспачы збягае, хлопец шукае яе па ўсім свеце, знаходзіць — і... гераіня прачынаецца. Але з-за пазухі дастае гадзіннічак, падораны Феяй: значыць, гэта быў не сон?..



Падчас спектакля мне таксама часам не верылася: можа, гэта толькі сон? Праўда, не такі цудоўны, як хацелася б. Сам па сабе спектакль вельмі яркі: на бале ўсе шпацыруюць выключна ў чырвоных ды малінавых спадніцах (мастак па касцюмах — Элеанора Грыгарук). І хоць святло на сцэне крыху «прыглушанае», затое колькі сцэнаграфічных спецэфектаў! Без усялякай іроніі — яны выклікаюць непадробленае захапленне.

На баль Папялушка спяшаецца ў раскошным аўто пачатку XX стагоддзя, куды перанесена дзеянне (мастак-пастаноўшчык — Аляксандр Касцючэнка). Прынц на яе пошукі накіроўвае суцэльную эскадру самалётаў: круцячы прапелерамі, тыя лунаюць пад каласнікамі (праўда, паводле тэхнікі бяспекі, без артыстаў). Падарожжа пралягае праз пустыню, дзе вярблюд верціць галавой. Ну, а Кароль увесь баль праводзіць у інвалідным вазку, з загіпсаванай нагой.

Як ні дзіўна, але тая «псаванагіпсаваная» нага ды вярблюд (зразумела, гарбаты) становяцца ледзь не «візітоўкамі» пастаноўкі, якой відавочна не хапае адметнай харэаграфіі. Асноўным кірункам была абрана неакласіка. У Ю. Пузакова яна складаецца наступным чынам: да безаблічных урокаў класічнага танца далучаюцца нетанцавальныя рухі і элементы іншых стыляў. Гатовы «вінегрэт» падаецца не «пад соусам» аўтарскага пераасэнсавання, а як міска абы-як пакрамсаных інгрэдыентаў. Вядома, такі вынік не ўражвае ні балетных эстэтаў, ні прыхільнікаў мадэрн-харэаграфіі. Дый само спалучэнне пластыкі, сцэнаграфіі і музыкі нагадвае байку пра Лебедзя, Рака ды Шчупака.

А між тым, па трох дзеях параскідана безліч неблагіх ідэй — на жаль, так і не распрацаваных. На завесе і задніку раз-пораз узнікаюць дэталі гадзіннікавых механізмаў, але таго канструктывізму няма ні ў пластыцы, ні ў музыцы. Сімвалам цяжкай долі Папялушкі становяцца два вялізныя прасы. Яна ўзнімае іх угару, быццам «скаланаючы паветра», але так і не танцуе з імі. Як не танцуе і з вешалкай, якая паўстае ў вобразе партнёра. Дый Караля проста возяць па сцэне, хоць апошнім часам распаўсюджаны нават спаборніцтвы па танцах у інвалідных вазках. Харэаграфічна «не абыграны» ні аўтамабіль, ні лесвіца ў палацы. Класічныя ж фрагменты глядзець сумнавата, бо ўсе яны — бы на адзін твар, як тыя госці на балі. Ну, а шмат якія дробныя дэталі дрэнна бачныя нават у партэры, не кажучы ўжо пра балконы: таблічкі з абрысам балетнай ножкі ў пуанце і сумай узнагароды «за знаходку», кукіш, які Матухна паказвае Папялушцы, нават гадзіннічак, падобны на маленькі медальён...

Не распрацаваны ў балеце і некаторыя вобразы. Загадкай застаюцца Паж, якога ўвасабляе не хлопчык, а артыстка балета (прытым, што танцаваць у гэтай партыі няма чаго — хіба прайсціся туды-сюды), Кароль, Прынц. Не паддаюцца логіцы паводзіны Матухны, зацікаўленай, каб прыслуга яе прыватнай харэаграфічнай студыі заставалася такой нягеглай: каб не распужаць патэнцыяльных вучняў, яна першая павінна была прымусіць Папялушку заняцца пластыкай, а не забараняць ёй гэта.

Скажаце, я хвалююся дарма? Маўляў, якой логікі чакаць ад казкі? Можа, і так. Але балеты Елізар'ева выхавалі ўдумлівага гледача, звыклага да багатых мастацкіх асацыяцый і філасофскіх абагульненняў. Гэтая ж пастаноўка накіравана на іншую публіку, выгадаваную на мульціках, «мыльных операх», кліпах. І на іншых артыстаў — якія проста рухаюцца па сцэне, а не паміраюць і наноў нараджаюцца на ёй...

**Наталля ЛІПНІЦКАЯ,**
**фота Ігара КУЗНЯЦОВА.**

## ПЕРШЫ КРОК ДА ПРЫЗНАННЯ

Шэсць музычных камандаў былі адзначаны дыпломамі і ўзнагародамі рок-фестывалю «Такія пернікі», арганізаванага ўпраўленнем па справах культуры БДУ пры падтрымцы музычнай кампаніі «BOOM». Званне лаўрэатаў атрымалі групы «Floor Sixteen» і «The Moonshiners High School». У намінацыі «За развіццё рок-руху ў БДУ» перамогу святкавала група «Green Fence Band», у намінацыі «Лепшае кампазіцыйнае рашэнне» — група «AMAROKA», у намінацыі «За пошук і эксперымент» — група «SHOUM». Асноўнымі задачамі рок-фестывалю «Такія пернікі» з'яўляюцца падтрымка маладых выканаўцаў і крэатыўная самарэалізацыя маладых людзей.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «МЯНЕ ВЫХОЎВАЛА СВЯТЛО З-ПАД ДЗВЯРЭЙ КАБІНЕТА БАЦЬКІ...»

## Пра сямейныя каштоўнасці — мовай старадаўніх прадметаў

**Можна парадаваць не толькі гродзенцаў, але і тых, хто тэлефануе ў адзіны ў Беларусі музей гісторыі рэлігіі са сталіцы і іншых рэгіёнаў нашай краіны з пытаннем: «Калі ж вы нарэшце адчыніцеся?» Шматпакутная рэстаўрацыя будынка XVIII стагоддзя на вуліцы Замкавай у гістарычным цэнтры горада над Нёманам, дзе размешчаны музей, нарэшце завяршылася і ўжо ідзе праца над стварэннем экспазіцыі. Сярод вітрынаў, дарэчы, ёсць і так званыя трансформеры, якія могуць прымаць розную форму ў залежнасці ад зместу выставы.**

— Такое ўражанне, што мы ўсё жыццё нешта будуем, — кажа дырэктар музея Людміла Карнілава, запрашаючы карэспандэнта «Звязды» азнаёміцца з, па сутнасці, вернутым да жыцця былым палацам Храптовічаў, які затым належаў гарадзенскаму старасту Антонію Тызенгаўзу і магнацкаму роду Ляхніцкіх.

Аднаўленне будынка яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя распачыналі Гродзенскія рэстаўрацыйныя майстэрні, аднак арганізацыя была нежыццяздольнай, а затым наогул спыніла сваё існаванне. І тады чатыры гады таму заказчыкам рамонту будынка і прыстасавання яго пад музей выступіла ўпраўленне капітальнага будаўніцтва аблвыканкама, а выканаўцам стаў «Гроднапрамбуд».

— Работы выканалі на добрым узроўні, — лічыць Людміла Аляксандраўна. — І цяпер усё будзе залежаць ад нашага падзвіжніцтва. Марым, каб гэта быў не проста музей, а культурны цэнтр.

Дарэчы, адна з залаў, дзе цяпер рыхтуецца выстава да Каляд, будзе спецыяльна прызначана для працы з дзецьмі. А ў канцэртнай зале камернага плана, у які арганічна ўпісаўся камін канца XIX — пачатку XX стагоддзя, ужо адкрыла свой новы сезон Гродзенская капэла.

Пры гэтым, зазначае Людміла Карнілава, асноўная праблематыка музея застанецца, безумоўна, ранейшай:

— Будуць прадэманстраваны прадметы па тэмах, якія раскрываюць нам і архаічныя вераванні на тэрыторыі Беларусі, і гісторыю прыняцця хрысціянства на нашых землях. Пазнаёміць з традыцыйнымі канфесіямі — праваслаўем, каталіцызмам, ісламам, іўдаізмам і пратэстантызмам, з тым, што кожная з гэтых канфесій унесла ў культуру нашай зямлі. І разам з гэтым мы хочам раскрыць тэму «Сям'я і яе традыцыйныя каштоўнасці». Бо менавіта рэлігія была тым складнікам, які ў многіх фарміраваў нашы традыцыі, культуру.

У музейных фондах шмат прадметаў з побыту нашых продкаў XVIII — пачатку XX стагоддзя і ў вітрынах выстаўлена толькі малая іх частка. І як жа шмат (асабліва калі побач з вамі такая знаўца, як Людміла Карнілава) могуць расказаць, здавалася б, звычайныя рэчы!

— У аднаго з заснавальнікаў квантавай механікі я нядаўна знайшла такі выраз: «Мяне выхоўвала святло з-пад дзвярэй кабінета бацькі...». І, паказваючы, што магло быць у такім кабінеце, мы гаворым не толькі пра тое, чым бацька займаўся, але і пра яго ролю ў выхаванні дзяцей. Альбо вось сталовы посуд — талерка, соуснік ці званочак, якім мама запрашала на абед усіх членаў сям'і. Прычым мы павінны памятаць, што сталовая была не толькі месцам для прыёму ежы, але і выконвала вельмі важную камунікатыўную функцыю, што шмат значыла ў выхаваўчым плане. Мы страцілі гэта, нават у нядзелю не можам усе сабрацца... Дарэчы, у кабінет бацькі можна было зайсці толькі з яго дазволу. А прыйшоўшы па сігнале мамінага званочка ў сталоўку, кожны член сям'і спыняўся каля свайго крэсла і толькі пасля малітвы прымаў ежу. Моўчкі. І толькі потым пачыналася пасляабедзенная дыскусія.



Ці ведаеце, каму падавалі першую талерку з ежай? Старэйшаму члену сям'і — дзядулю, бабулі, бацьку, маме. І толькі потым — дзецям. Гэта таксама была традыцыя, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне. А паглядзіце, што ў нас робіцца? Будуць сядзець за сталом дарослыя людзі і сямігадовы хлапчук — уся ўвага яму. А гэта ж выхаваўчы момант. Памятаеце, у пятай запаведзі сказана: «Паважай бацьку свайго і маці сваю».



— Альбо вось традыцыя вячэрняга чаяпіцця, якая таксама служыла згуртаванню сям'і, — працягвае аповед Людміла Карнілава. — Пры гэтым, як можна ўбачыць, сервізы былі не толькі шматпрадметнымі, але і, так бы мовіць, «тэт-а-тэт», для двух чалавек. Былі ў палацах і більярдныя, курыльныя пакоі. Здавалася б, тытунь — вораг. Але мы павінны ведаць, што не было паўсюднага, штохвіліннага курэння, гэта, хутчэй, быў рытуал. І не выпадкова тыя ж люлькі, бачыце, упрыгожваліся сярэбранымі пласцінкамі і іншымі дарагімі матэрыяламі... Жанчыны ж у вячэрні час займаліся рукадзеллем — вязаннем, вышыўкай, прычым пераважала біблейская тэматыка з вобразамі святых, Багародзіцы. Напрыклад, вось гэты габелен вышыты шэрсцю, а вось той — бісерам.

Зрэшты, вольны час многія з нашых продкаў прысвячалі не толькі люлькам і вышыўцы, але і падарожжам, у тым ліку з мэтай паломніцтва. Пра гэта сведчаць прадстаўленыя ў музейнай экспазіцыі сувеніры, прывезеныя з Іерусаліма, Рыма, Бары і іншых мясцінаў. Асабліва ўражвае сувенірная бутэлька з Траецка-Сергіеўскай лаўры, кожны прадмет унутры якой быў разборным і і непасрэдна ў бутэльцы збіраўся майстрам спецыяльнымі пруткамі.



...Людміла Аляксандраўна запрашае ў залу, якая таксама мовай старажытных прадметаў знаёміць з першымі крокамі па выхаванні дзяцей і іх далучэння да царквы. Гэта і медалі, што выраблялiся ў памяць аб хрышчэнні, і нацельны крыжык, які адзяваўся пры хрышчэнні і, як правіла, не знімаўся ўсё жыццё, і патэфонная пласцінка пачатку мінулага стагоддзя з калыханкай, і малітоўнікі для дзяцей... І, вядома ж, цацкі. У параўнанні з сучаснымі яны былі прасцейшымі, але вельмі добрымі. Як прыгадваў князь Яўстафій Сапега, цацак у яго дзяцінстве было няшмат, аднак і сярод іх былі самыя любімыя, які-небудзь плюшавы мішка. І чым больш патрапаны — тым больш любімы.

Дарэчы, адным з самых каштоўных падарункаў на Каляды, ды і ў іншыя святы на беларускіх землях здаўна была кніга. А на Вялікдзень у заможных сем'ях дарылі фарфоравыя яйкі, зробленыя на Імператарскім і іншых вядомых заводах. Дзецям, да таго ж, прыносілі і прысмакі. Старадаўнія каробкі ад цукерак і пячэння можна таксама ўбачыць у музейнай экспазіцыі.

— Гаворачы пра падарунак, мы неяк не задумваемся пра сэнс гэтага слова, — лічыць Людміла Карнілава. — Проста ведаем, што падарунак — гэта бязвыплатная, добраахвотная перадача ўласнасці. І забываем пра тое, што, згодна з хрысціянскай традыцыяй, першым дарыльшчыкам быў Гасподзь. Менавіта ён дараваў жыццё, дарue чалавеку міласці. І мы, кіруючыся Божым прыкладам, паўтараем той добры пачатак, што закладзены ім у людзях. Вось што сімвалізуе падарунак.

Вось так праз старадаўнія прадметы Гродзенскі музей гісторыі рэлігіі апавядае пра тыя формы культуры, што сфарміраваліся на рэлігійнай аснове.

— Усё гэта ўваходзіла ў свядомасць людзей натуральна, без павучання і нейкіх патрабаванняў, — зазначае Людміла Карнілава. — Бо вернік — гэта зусім не абавязкова той, хто ходзіць у хустачцы і б'е паклоны. Вельмі добра сказаў рускі філасоф Ільін, што царква не павінна чалавека забіраць ад свету, а павінна весці яго ў свеце. І выходзячы за межы дома, чалавек трапляе ў больш шырокі свет, але захоўвае сваю ўнутраную культуру. Згодна з закладзенымі ў сям'і маральнымі каштоўнасцямі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

Занатоўкі мастака

# СОРАМ І СЫХОДЫ



Задумаўся я над простым пытаннем... Што дапамагала і дапамагае ў жыцці? Сорам дапамагаў! Ён прымушаў варушыцца, рухацца, распачынаць новыя справы. Я трапляў у якоесьці асяроддзе, жыў і працаваў разам з таварышамі і знаёмымі, а потым мне рабілася сорамна і за іх, і за сябе. Што б я з імі ні зрабіў, атрымлівалася кепска, і было сорамна за зробленае. Нельга казаць, што мы працавалі несумленна; як не скажу, што вакол мяне было мала таленавітых і здольных. Наадварот, асяродкі былі і цікавыя, і творчыя, і працавітыя. Толькі свой сорам я не мог перадолець. Ён быў мацнейшы за астатнія пачуцці. Ёсць рэчы большыя за чалавека. Ёсць пачуцці, якія выглядаюць нелагічнымі, супярэчлівымі і нават шкоднымі, і адно з іх — сорам. Але я ў сваім жыцці шматкроць кіраваўся менавіта сорамам, і не шкадую пра гэта.

Першы раз я адчуў невыносны сорам у школе. Нейкія зладзеі абакралі кабінет фізікі. За той кабінет адказваў наш клас. Каму і нашто спатрэбіліся амперметры? Здагадацца цяжка. Настаўнікі з дырэктарам пашнуравалі вучняў у калідоры, і дырэктарка пракрычала: «Буду ўглядацца вам у вочы, а хто пачырванее, той і абрабаваў кабінет фізікі, той і звалок амперметры!». Мне зрабілася сорамна за гарлапаністую дырэктарку, за слабахарактарных і лісліваых настаўнікаў, за прыніжаных і пакорлівых вучняў, за сваю занядбаную і бедную школу. Я пачырванеў, але той чырвані для дырэктаркі не хапіла, каб абвінаваціць мяне ў крадзяжы амперметраў. Той чырвані хапіла мне, каб сысці са школы; балазе, да канца навучальнага года заставалася пару тыдняў. Я здаў іспыты, забраў дакументы і сышоў у мастацкую вучэльню.

У мастакоўскім асяродку мне было добра. Майстэрні, музеі, натуршчыцы, фарбы, палотны... Пасля занудлівага і паўтурэмнага школьнага жыцця мастакоўскае асяроддзе падалося найлепшым у свеце. Такім яно і было ажно да моманту забароненай выставы, якую я зладзіў з сябрамі. Маю выставу забаранілі, прыйшлі людзі ў шэрых палітонах і загадалі зняць палотны са сценаў. Зняў. Спрачацца не мела сэнсу, бо людзі ў шэрых палітонах на ўсялякі выпадак выклікалі міліцыянтаў. Тыя перакрылі ўсе ўваходы ў памяшканне і гледачоў не пусцілі. А каб канфлікт з забаронаю не меў розгаласу, мне дазволілі выставіць свае палотны на адзін вечар у цёмным калідоры Саюза мастакоў. За гэты чортаў вечар розныя народныя і заслужаныя мастакі мусілі сказаць мне ў твар, які я паганы мастак, і тым замацаваць пазіцыю людзей у шэрых палітонах. Народныя, заслужаныя, ардэнаносныя сацрэалісты прыйшлі і нагаварылі гадасцяў. Мне было сорамна! І не за сябе, і не за свае палотны зрабілася сорамна, а за гэтых ілжывых нікчэмных людзей, якія верылі ў нейкі сацыялістычны і хімерычны рэалізм. Мне больш не хацелася працаваць поруч з імі. Не хацелася выстаўляць свае палотны на адных з імі выставах. Дваццаць пяць гадоў я з імі не выстаўляўся. Яны адышлі, саюз мастакоў пераехаў у іншае памяшканне, і сорам знік, і я зноў паказваю свае палотны на розных выставах. Гэта я кажу дзеля таго, каб ты ведаў, што можна ператрываць і перачакаць сорам, што ён не ўсемагутны, і можа знікнуць так жа ж, як і з'явіўся.

А вось сорам за тэлевізійны асяродак у мяне адно мацнее. Уключаючы DVD-плэер, я часам бачу фрагменты тэлепрадукцыі мясцовых тэленяўмекаў. Бачу і чырванею ад сораму. Мне сорамна за іх і за сябе. І я не ведаю, ці змагу пазбыцца гэтага сораму. Узнік ён даўно. Напрыканцы васьмідзясятых — на пачатку дзевяностых гадоў я працаваў на тэлевізіі. Разам з сябрамі рабіў перадачы і здымаў фільмы. Свет мяняўся, мянялася тэлебачанне, і можна было наўпрост у камеру казаць тое, што ты думаеш. Можна было спрачацца, разважаць, пераконваць, палемізаваць. Можна было сесці ў студыі разам з якім кіраўніком і распачаць спакойную гутарку пра цяжкі эканамічны стан у краіне. Толькі тое «можна» хутка змянілася на «нельга». Яно ўжо змянілася, а я ўсё не мог паверыць у абсурдную змену. Я ездзіў са здымачнай групай і рабіў сюжэты: пра мастакоў у вар'ятні, пра дзяржынскіх міліцыянераў, якіх прымусілі пасяліцца ў дамках, пастаўленых проста на яўрэйскія могілкі, пра панявечаныя курганы і замчышчы... Мы здымалі, а людзі ў шэрых пінжаках размагнічвалі нашы стужкі. Мы здымалі, а яны ціхенька нішчылі зробленае. Калі я даведаўся пра знішчэнне адзнятых матэрыялаў, мне стала сорамна. Не злосць, не крыўда, не жаданне помсты, а менавіта сорам запоўніў маю душу.

Цяпер я раблю кнігі. Часам у кнігарні мяне ахоплівае сорам за зробленае іншымі, а вось за свае кнігі мне ўсё яшчэ не сорамна. Гэта зусім не азначае, што я ў захапленні ад зробленага, ці мне заўсёды падабаецца тое, чым даводзіцца займацца ў кніжным асяродку, але ж не сорамна. Калі стане сорамна, адразу сыду. Часам недасведчаныя людзі, як тая хамуйлаватая школьная дырэктарка, спрабуюць абвінаваціць мяне ў крадзяжы нейкіх амперметраў. Толькі я ўжо не школьнік і магу спакойна сказаць дурню, што ён дурань і што ў яго няма сораму.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Свой твор Валерыя Саротнік назвала разважаннямі. Не бяруся судзіць, што гэта. Але ж, пэўна, нешта большае, чым проста разважанні, апавяданне ці эсэ. Нешта значна большае, бо яе кварк сапраўды зачароўвае, як зачароўвае ўсё сапраўднае і мастацкае, хоць належыць яно да плыні, на маю думку, найноўшай літаратуры, якую не кожны сёння здольны ўспрымаць і адчуваць. Адно толькі: не адчуваць шчырасці і стану душы за гэтай шчырасцю — немагчыма. Душы добрай, пакутнай і думаючай.**

**Віктар КАЗЬКО.**

Валерыя САРОТНІК

# РАЗВАЖАННІ РАСЧАРАВАНАГА КВАРКА

ПЕРШАЙ парай — «Навуковы малюнак свету», ён жа тэрмадынаміка ў пераказе для філолагаў. Я засынаю, але трымаюся — няхай будзе для фонавых ведаў. Старэнькі выкладчык ходзіць тудысюды перад дошкай і манатонна чытае:

— ...існуюць таксама так званыя гіпатэтычныя часціцы, ці кваркі. Адзін з іх відаў рухаецца хаатычна, нібы зачараваны. Так ён і называецца — зачараваны кварк.

Тут я амаль прачнулася. Зачараваны кварк — гэта паэтычна, і ніяк не навукова.

І мая паўсонная фантазія пачала маляваць мне зачараваную часціцу, якая, радасная, уражаная жыццём, шырока расплюшчыўшы ўяўныя вочы, ляціць падарожнічаць па скаваным чэраве паскаральніка... тут на мяне, як кажуць, накаціла. Успомніўся першы год ва ўніверсітэце — цэлы вывадак гэткіх «зачараваных кваркаў», і я сярод іх. Кожны кут, кожныя дзверы вялізнага будынка — загадка, кожная лесвіца, бібліятэка — прыгоды. Нібыта ты з паўжывой шлюпкі ступіў на вялізны карабель — як мінімум, круізны лайнер, нібы пасля лужыны ў двары ўбачыў мора. І нават пафасныя словы дарослых, тыя, што заўсёды гавораць першакурснікам, не раздражняюць. І здаецца, што так яно сапраўды і будзе — і новае дарослае жыццё, і выпрабаванні, і прыгоды...

Але праходзіць год. Потым яшчэ адзін. І нешта губляецца, адыходзіць, пакідае цябе... Запал? Азарт? Вялікая, нічым не сапсаваная радасць зачараванага кварка? Не ведаю. Але праз колькі гадоў можна папросту пісаць з кожнага з нас партрэт старшакурсніка — тыповага «кварка расчараванага».

Ды толькі прыходзіць лета, і гэтае нешта растае, вяртаецца, просіцца на свет Божы. І зноўку хочацца стаць зачараваным кваркам. Пачынаеш варушыць памяць, выцягваць з яе ўспаміны, нібы фотакарткі з альбома. І паўстаюць яны перад табой не ў звычайных, а ў нейкіх новых, яркіх колерах і адценнях...

## ...МЕСЦА

Я ўсё здзіўляюся ёй.

Цішыні.

З аднаго боку шэры будынак майго ўніверсітэта абступае плошча — дым, шум, машыны. А з другога — казка.

Усё, што трэба зрабіць — зайсці пад арку, у маленькі двор, і цішыня аглушае цябе, вялікая, неахопная, яе нібыта можна памацаць, патрымаць у руках.

Гэта Мінск трох-чатырохпавярховы, з невялікімі дамкамі, што захуталіся ў дзікі вінаград, нібы бабулькі ў зялёныя хусткі. Гэта маленькія дворыкі, з невысокімі вішнямі пад кожным акном.

Тут зусім не хочацца вучыцца. Тут хочацца гуляць, да самай цемры, пакуль не ўключаць ліхтары. Ці, стукаючы па каменнай агароджы, дражніць кошку, што спіць у клумбе. Хочацца стаць гадоў на дзесяць маладзейшай, і без усялякага сарказму і чэрствасці радавацца простай прыгажосці навокал.

Хочацца жыць.

Я не расказваю сваім сябрам пра маю цішыню. Я баюся, што яны не ўбачаць і не пачуюць яе...

## ...ЛЮДЗІ

### КАЦЯ І ГУМКІ

Каця іх любіць.

Гумкі, якія чапляюць на ручкі, каб лягчэй было трымаць, калі пішаш.

Яна разгортвае іх, расцягвае, здымае. І з кожнай новай гумкай распраўляецца па-свойму, унікальна і прафесійна, як Панікоўскі з гускай. І мы, і ручкі ўжо да гэтага прывычаіліся. І іншага жыцця сабе не ўяўляем.

### НАТАША І ПЛЭЕР

— Такая песня! Я нават у словы не ўслухоўваюся, каб не заплакаць...

І яна дастае навушнік. Я праз стол цягнуся за ім — RNB рытм і сумны тэкст.

— Так, — песня скончылася, Наташа бярэ ў рукі плэер, кранае джойсцік.

— Так... слухаеш рускі рэп?

— Не.

— Я таксама. Але вось гэтая...

**В гости к тебе**
**Ідти по парапету**
**И не верить бреду,**
**Что тебя нету...**

І мне сумна. І ніякавата.

### АЛЕНА І РАМОНКАВАЯ ГАРБАТА

— ФУ! — вось так, трапна і ёмiста называе яна зялёную гарбату.

— Рыбай пахне, ці што?

— Не, проста — фу! А гэта, — яна цягнецца за Наташыным пакецікам, — Ы! — і моршчыцца ад моцнага экзатычнага паху пад назвай «Вясенняя Радасць».

— А вось рамонкавая гарбата, — яна нарэшце кідае ў пенапластавы стакан, над якім густа падымаецца пара, свой пакецік, — рамонкавая, яна лепшая ў свеце.

Мы паціскаем плячыма.

### БАРЫС І ШАПКА

Нешта здарылася з Барысам у пачатку года, і яны з шапкай не расставаліся нават у аўдыторыі. Мы думалі, што ён проста пасыпаў галаў попелам і не хоча гэтага нікому паказваць.

Але пацяплела над горадам неба, і Барыса пакінула шапка, і разам з ёю і рэперская куртка. І выглядаць ён стаў весялей.

Мараль: чужая душа — цемрадзь непраходная.

### НАСЦЯ І СЛОВАЎТВАРЭННЕ

Тое, як яна размаўляе, не можа не радаваць філолага. Мяне дагэтуль уражвае яе ўменне ўтвараць супернайноўшыя формы прыметнікаў. Напрыклад:

— Нават не ведаю, што рабіць.

— А што?

— Я пазнаёмілася з такім найляпшэйшым хлопцам!

### ВІКА І ЖУРНАЛ

— Калі ласка, вазьмі (занясі ў дэканат, аддай настаўніку, прынясі заўтра, патрэбнае падкрэсліць), калі ласка! *(Сумны погляд.)*

І я бяру. І нашу журнал з сабою. Я не крыўдую на нашу старасту. Бо з другога боку гэта называецца «дэлегаванне паўнамоцтваў».

### КАЦЯ НУМАР ДВА І КАВА

Кававы аўтамат унізе — недасягальная мара зімой на чацвёртым паверсе.

Кацю вельмі часта можна тут убачыць. У чарзе, ці ўжо з кубкам у руках.

— Не магу без кафеіну жыць, — сумна ўсміхаецца яна. — Гэта дрэнна. Але і прачнуцца не магу.

Я таксама ўсміхаюся і дастаю з аўтамата кубачак — ён гарачы і мяккі, амаль поўны кавы з жаўтаватай сметанковай пенкай. Пах дурманіць галаву. Я раблю глыток, і салодкая, пахкая цеплыня разліваецца па мне. На вуліцы — цёмны, халодны, зімовы ранак, у які хочацца толькі ляжаць, зарыўшыся носам у падушку. Я цалкам разумею Кацю...

### КАЦЯ НУМАР ТРЫ І ЯПОНСКАЯ КУЛЬТУРА

Яна цвёрда вырашыла «падсадзіць» мяне на японскі рок, джэйрок, ці як ён называецца.

І вось мы сядзім у бібліятэцы, Каця шукае коміксы ў інтэрнэце на сваім ноўтбуку, я спрабую вучыць сацыялогію да экзамену. Нарэшце яна адкрывае нейкі файл і паварочвае ноўтбук маніторам да мяне.

— Вось, глядзі.

Гэта кліп. Пад нядрэнную, вясёлую песеньку скачуць падлеткі ў стракатым адзенні і з доўгімі валасамі.

— Дзяўчаты?

— Не-а, трымайся, гэта хлопцы.

Далей быў стук маёй сківіцы аб стол, дастаткова гучны для таго, каб выклікаць у бібліятэкаркі чарговы прыступ крыку на тэму «ціха павінна быць у бібліятэцы, ціха, я сказала, альбо я ціха сказала».

— Не пужайся, — гаворыць Каця. — Проста ў іх хлопец лічыцца прыгожым, калі на дзяўчынку крыху падобны...

Потым яна паказвае мне мультфільмы-анімэ, лялек, коміксы-мангу. І «фрутс» — такая... субкультура, калі, каб быць прыгожым, трэба начапляць на сябе як мага больш упрыгажэнняў-заколак-шкарпэтак-спадніц і шмат чаго яшчэ... Але я ўсё намагаюся зразумець японскія паняцці аб мужчынскай прыгажосці.

Іншая культура, што сказаць...

## ...ПАЧУЦЦІ

### АДЗІНСТВА

Канец семестра, у акне — зялёнае лісце клёнаў. Амаль што лета.

Але не да лета.

Бо сінонім лета — сесія, час слёзаў і яднання. Яднання сапраўднага, калі самыя незнаёмыя — блізкія.

Залікі вось-вось скончацца. Далей, зноў жа, толькі яна — сесія.

Мы сядзім у сталоўцы, у нас «фортка». П'ём гарбату. Усе размовы пачынаюцца вучобай, а заканчваюцца чым заўгодна, толькі не ёй.

Вось зараз мы ўспамінаем сваіх хатніх жывёлаў, сабачак-кошачак-хамячкоў, і тое, як яны пакінулі гэты свет. Нешта нібыта склейвае, трымае нас разам. І я намагаюся назаўсёды запомніць гэты час і гэта пачуццё: сталоўка, мы за столікам, нам па дваццаць, мы галодныя, злыя і адчайна, надтрэснута вясёлыя, нібы нам няма чаго губляць, нібыта заўтра ў бой.

Часцей за ўсё я сяджу моўчкі, слухаю, зрэдку задаю пытанні. Але мае неўтаймоўныя сяброўкі не даюць маўчаць. І я, не разважаючы, кідаюся ў гэтую раку радасці, рогату і ўзаемных падколак, усяго, з чаго створана студэнцкае жыццё .

### СУПЕРНІЦТВА

Так яно і ёсць. Групы на семінары — супернікі. Нібы гэта — Алімпійскія гульні, ці які матч стагоддзя.

Праз некаторы час у такім суперніцтве той прадмет, што дагэтуль не падабаўся ўвогуле, пачынае прыносіць нейкае ненармальнае задавальненне. Ты вышукваеш новыя і новыя факты, па начах не вылазіш з інтэрнэту, дабіваеш прынтар матэрыяламі па наступнай тэме семінара...

А потым, ідучы па лесвіцы ўніз пасля пары, радуешся, калі «мы — чэмпіёны», ці падаграваеш у сабе настрой «мы ім яшчэ пакажам»...

Прынамсі, так бывае не з усімі і не заўсёды, але гэта зусім іншая гісторыя.

### УСЁ АСТАТНЯЕ

Жыццё студэнта-філолага, як і кожнага шкаляра, — клубок з пачуццяў, думак, слёзаў, смеху і рознага-рознага, аб чым нават не раскажаш — проста не ўспомніш. Не заўсёды ёсць час разблытваць гэты клубок. Забываюцца, замотваюцца новымі ніткамі старыя радасці і нягоды, ніткі рвуцца, аддаляючы ад цябе колішніх сяброў, і новымі вузельчыкамі прывязваюцца, як новыя ніткі, новыя сябры. Калі пацягнуць за адну з такіх нітак, выцягнецца радасць ад блізкіх канікулаў, ці слёзы ў туалеце пасля экзамену. Ці лекцыі, на якіх вядуцца бязлітасныя марскія баі паміж бліжнімі партамі, а можа і «пасяджэнні» ў сталовай, на якіх вырашаецца важнае пытанне — дык што ж чакае свет: глабальнае пацяпленне ці гэткае ж пахаладанне?.. Многа чаго ўспомніцца, выцягнецца на паверхню, заіскрыцца, нібы стразы на Кацінай кофтачцы, ці наадварот, патухне. Але ёсць ніткі, што, нібы люрэкс, зіхацяць сярод іншых: першы дзень, першае «выдатна», зялёныя далоні каштанаў у акне лесвіцы, на другім паверсе... і кожны з нас хавае свой клубок, каб аднойчы, дастаўшы яго, разам з усімі парадавацца ці пажурыцца...

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Чацвёрты курс. Ч а ц в ё р т ы . ЧАЦВЁРТЫ.

Ніяк не паверу. Але ж... яшчэ амаль два гады — і мы вольныя птушкі.

А пакуль яшчэ ёсць час парадавацца.

Усяму.

Дарозе да ўніверсітэта, якая сілаў-няма-ўжо-як-надакучыла.

Бурклівым цётачкам у бібліятэцы і грозным адміністратарам у камп'ютарных класах.

Неядомым булачкам з крабавымі палачкамі і казачным шакаладным піро жным.

Настаўнікам, што спазняюцца на пары. І парам, на якія спазняемся мы самі.

Лекцыям, нудотным і не вельмі.

І ўсяму, з чаго складаецца жыццё такіх, як мы, птушанят-філолагаў, як бы банальна гэта ні гучала.

Я паўтаруся. Ёсць яшчэ час пабыць ЗАЧАРАВАНЫМ КВАРКАМ.

